I. 430.168 25.622
D

# Хрысьціянскія

# Духоўныя Песьні

# Божая Ліра

## ПЕСЕНЬНІК (СЬПЕЎНІК) БЕЛАРУСКІ

(Тэксты да нотаў)





*„Як дзе пяюць—прыстань хутчэй,*
*Бо песьня сьпіць у злых людзей“.*
*(Народная прыгаворка).*

---

ВІЛЬНЯ — 1930
Выданьне П.-Амэрыканскай Акц. Супалкі
„SOUTHERN TRADE“.

Wileńskie Starostwo Grodzkie.
Egzemplarz obowiązkowy
Nakład 1 Egzempl. 1500
Dnia 4. IX 1930 r.

# Хрысьціянскія
# Духоўныя Песьні
# „Божая Ліра“

**МЭТАДЫСТЫЧНЫ**
**ПЕСЕНЬНІК (СЬПЕЎНІК) БЕЛАРУСКІ**
(Тэксты да нотаў).

**Зборнік рэлігійных гымнаў і песьняў для мэтодыстычных эвангельлічных зграмаджэньняў на Беларусі.**

„Будзьце напоўнены Духам, размаўляючы з сабою, сьпеваючы й іграючы ў сэрцы сваём Госпаду псальмы, гымны і песьні духоўныя.
*(Эфэз. V. 18-19)*

„Як дзе пяюць — прыстань хутчэй,
Бо песьня сьпіць у злых людзей!“
*(Народная прыгаворка).*

---

ВІЛЬНЯ — 1930
Выданьне П.-Амэрыканскай Акц. Супалкі
„SOUTHERN TRADE“.

Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001008446747

BIBLIOTEKA NARODOWA BN

I.430.168

Друк. Я Левіна Вільня, Нямецкая 22.

## УРЫЎКІ ІЗ СЬВ. ПІСАНЬНЯ АБ ПЯЯНЬНІ ДУХОЎНЫХ ПЕСЬНЯЎ.

1. Будзьце напоўнены Духам, размаўляючы з сабою, сьпеваючы й іграючы ў сэрцы сваём Госпаду псальмы, гымны і песьні духоўныя.
(Эфэз. V. 18. 19).

2. Буду Госпаду пяяці й іграці (Пс. 27. 6).

3. І песняй маёй дзякаваць буду Яму.
(Пс. 28. 7).

4. І новую песьню мне ў вусны ўлажыў — хвалу нашаму Богу! (Пс. 40. 4.) А ўначы Яму песьня ў мяне (Пс. 42. 9).

5. Радыя вусны мае, як Табе я пяю!
(Пс. 71. 23).

6. О, Божа, маё сэрца гатова пяяці й іграці Табе! (Пс. 57. 9).

7. Дык пяяць аб Табе будуць усе чыста сілы жыцьця майго! (Пс. 87. 7).

8. Хадзеце, сьпеваць будзем Госпаду. Псальмы сьпевайма Яму! (Пс. 95. 1.2).

9. Сьпявайце Госпаду новую песьню. Сьпявай Го́спаду усенька зямля. Сьпявайце Госпаду, багаслаўце імя Яго! (Пс. 96. 1.2; 149. 1).

10. Сьпявайце Госпаду, ўсенька зямля! Радуйцеся і ў песьні хвалеце! Выслаўляйце Госпада на гусьлях і голасным пяяньнем! (Пс. 98. 4.5).

11. З песьняй прыходзьце прад аблічча Яго!
(Пс. 100. 2).

12. Аб ласкі і справядлівасьці буду я пяяць, хвалу Табе, Госпадзе, пяяць буду! (Пс. 101. 1).

13. Сьпявайце Богу, выслаўляйце Яго!
(Пс. 105. 2).

14. ...і песьнямі славіць справядлівасьць Тваю; пяяць буду Богу майму, пакуль істную. Песьня хвалы належыцца Яму! Сьпявайце Госпаду песьню хвалы! (Пс. 145. 7; 146. 2; 147, 1.7).

---

*„Як дзе пяюць прыстань хутчэй,*
*Бо песьня сьпіць у злых людзей“.*

*(Народная прыгаворка).*

# ПРАДМОВА.

Гэты зборнік духоўных песьняў выданы дзеля таго, што ў беларускай рэлігійнай хрысьціянскай літэратуры амаль зусім нямаш духоўных песьняў, праз тое нястача іх вельмі адчувалася на нашых малітвеных зграмаджэньнях.

Выданы ў 1925 г. невялічкі духоўны сьпеўнік (песеньнік) з 12 песьняў з нотамі лацінікай і русінікай (гражданкай), а цераз 2 гады — другі сьпеўнік — з 20 песьняў бяз нотаў гражданкай, зусім не здавалялі нашых духоўных патрэбаў, а прытым былі ў іх пэўныя недахопы і памылкі ў зьмесьце—адносна да нотаў.

Мы хочам з жывымі ісьці наперад і жыцьцё новае, вечнае здабываць; хочам у Хрыстовай рэлігіі мець крыніцу жывое вады, жыцьця, сілы, прыгожасьці; хочам у рэлігійных нашых песьнях знахадзіць для сябе спосаб выяўленьня стану душы, а нават водгукаў і настрояў жыцьця, хаця мо‘ часовых, пералётных, але каб толькі чыстых, хрысьціянскіх.

*Жывучы*, чалавек мае часіны суму, жалю, трывогі і часіны радасьці, надзеі; ўпадае часам у некую журбу, беспатольную думку; часам у экстазу, але таксама часта чуецца ён напоўненым энэргіяй і жаданьнем дзейнасьці.

Дык ясна, што песьні аднолькавага зьместу і характару, хаця і паважныя, або падносячыя настрой у іншых веравызнаньнях хрысьціянскіх, бываюць часта монотонныя.

Мы стараліся сабраць тут мэлёдыі і матывы лёгкія, але гучныя і мілыя для слуху і рознародныя; стараліся даць ім, наколькі мага, зьмест і тэкст добры і згодны з нашай роднай мовай.

На агульны лік мэлёдыяў, (каля 145), шмат, бо больш за 45, ўзята з вялікага сьпеўніка: „The Methodist Hymnal" і іншых амэрыканскіх сьпеўнікаў, дзеля іх мастацкай вартасьці і для падтрыманьня лучнасьці з мільёнамі нашых братоў і сёстраў, што жывуць у розных краёх і контынэнтах. Значная частка, (каля 60), ўзята з вядомага сьпеўніка: „Гарфа Сіонская"; 8 із песеньніка: „Песьні Сіону", 12 із песеньніка: „Гусьлі", 16 із сьпеўніка: „Песьні Странніка", 9 із украінскага песеньніка „Кныга Хвалы"; у гэтым ліку тут ёсьць некалькі мэлёдыяў англіцкіх, амэрыканскіх і старых каталіцкіх, некалькі нямецкіх, польскіх, расейскіх, пара беларускіх, украінскіх і агулам славянскіх народнасьцяў.

Міма вялікае асьцярожнасьці з нашай стараны, знойдуцца ў песеньніку мо' якія памылкі ў нотах і недахопы ў тэксьце, дык мы ветліва просімо даравацъ нам гэтыя памылкі і недахопы і самым паправіць, што трэба будзе*), хаця-б дзеля таго, што мэтай нашага зборніка ёсьць толькі Слава Божая!

Каб вялікі, добры, адзіны ў Тройцы Сьвятой Бог, дзеля Чэсьці і Славы Якога маюць служыць гэтыя песьні, пабагаславіў нас і вёў нашыя душы да Сябе!

*Выдавецкі Камітэт.*

---

*) Гэтыя песьні, перад выдрукаваньнем іх, былі перагледжаны, скантралёваны і папраўлены з музыкальнага боку і з боку правільнасьці правапісу і духа беларускага языка спэцыяльнай музыкальна-літэратурнай камісіяй белар. языкаведаў.

# Песьняй мілай „Божай Ліры“.

Песьняй мілаю духоўнай
Трэба сьвет будзіць грахоўны!
Ў пропасьць гора і цярпеньня
Ліць трэ гукі пацяшэньня!

Ў цьвёрды душы, як каменьні
Веры трэ пушчаць праменьні!
Ў царстве сьмерці і грашэньня
Абвешчаць трэ дзень збаўленьня!

Клікаць ўсіх да песьні новай —
Да праўдзівай, да Хрыстовай!
Хай ў дарогу адраджэньня
Пойдзе цэла пакаленьне!

Песьняй мілай слаўце Бога,
Дык рассееца трывога;
Сум ці радасьць — ўсе сьпявайце,
Песьняй к'Богу прыцягайце!

* * *

Недалёкая часіна —
Ўстане мілая Айчына:
Песьня пойдзе ў выш на волю,
Прынясе нам шчасну долю!



I.

Ліра мая ты міла! зачарóвана сіла —
Бог цябе даў — ня людзі!
Як выму я з торбы, дакрануся да корбы,
Ўжо кіпяць мае грудзі.
Чуюць радасьць, ня знаюць—што у сэрцы іграюць,
Чуюць сум, любасьць Боску;
Я шчасьлівы, багаты, як ад хаты да хаты,
Я праз цэлу йду вёску!
Мне з табою ніколі не награцца даволі —
Граў-бы днямі, начамі —
Аж ў нутры чую жары, на блядым маём твары
Кроў гарачу струямі.
Хай рука аслабée, хай у сэрцы самлée —
Я інакш не зайграю!
Не баюся злой мовы, бо я лірнік вясковы,
Я пры ліры сканаю! —

II.

Ліра мая ты міла! зачарóвана сіла —
Але Божа апека:
Быццам з неба, ці з раю хтось даткнецца —
Цешыш век чалавека! [я знаю:
Зараз песьню зайграеш, зараз любіш, кахаеш,
Сум бярэ не на жарты...
Ці ты ежа ад Бога, кліч з вастрогу якога?
Без цябе жыць не варта!
Бо нож, дык цела рэжэць, а песьня душу
Як вострым чымсь упіхае; [сьвежыць —
А сум мне горш удэрыць, калі сьвет ня уверыць,
Што ў душы лірнік мае.
Што людзі могуць знаці, што мне ў грудзях
Што там песьня — багацьце; [чуваці,
Ўсім ад сэрца йграць многа, а ў сьвятыні для
Добрым людзям у хаце; [Бога,
Маладзежы зайграці, песьняй ўвокал абняці
Дый музыкай атуліці,

Ці на жнівах працуюць, ці у хатах гаруюць,
Ці ёсьць на вечарынцы.
Бог мне шмат празначае: знай што варт, хто
Песьні я не зьніжаю, [сьпявае —
Ані сэрца, ні словы, бо я лірнік вясковы,
Я пры ліры сканаю!

III.

Ліра мая ты міла! зачаро́вана сіла —
По́яць сьлёзамі людзі!
Чую палёгку мілу, а як лягу ў магілу —
Памяць славы набудзе!...
Эй, разойдзецца звонка, загудзе́ слава громка!
Наша песьня ў сьвет пойдзе,
По́йдзе з краю да краю, да самога Дунаю,
Аж да Кіева до́йдзе!
Як раз ў вокны к суседу грамада̀ на бяседу
Прыдзе з просьбай: „скажэце:
„Хто быў лірай чарован, дзе той лірнік пахован—
„Лірнік слаўны на сьвеце?“
Будуць дзівам дзівіцца, цэла вёска зьляціцца,
Як на цуд чысты Боскі,
Дый пытацца іх будзе: „скуль далёкія людзі
Знаюць песьні іх вёскі?“
Вёсцы слаўна часіна—хлопец, жонка, дзяўчына
Прад людзямі чужымі —
Госьцяў сум зацікавіць, будуць лірніка славіць,
Што пяяў і жыў з імі.
Павядуць гэтых госьці, дзе пры хвойцы сьпяць
Дзе крыжоў шмат—гроб шчыры; [косьці,
Скажуць гэтыя словы: „тут наш лірнік вясковы
Лёг, сканаўшы пры ліры!“...

*(З „Лірніка Вясковага“ Улад. Сыракомлі).*
*(1823 † 1862).*

---

# I. Парадак публічнага набажэнства — СЛУЖБЫ БОЖАЕ.

(Хай усе нашыя сабраньні пачынаюцца ў назначаным часе. Перад Службай Божай трэба сабраць усе свае мысьлі ў ціхай малітве і развазе, схіліўшы галаву, або ўкленчыўшы).

1) „Навучы нас так лічыць дні нашыя каб мы мелі сэрца мудрае“! (Пс. 90. 12).

2) „Божа! зьлітуйся над намі і багаславі нас; рассьвяці аблічча Тваё над намі“ (Пс. 67. 2).

3) „Будзеш любіць Госпада Бога Твайго з усяго сэрца твайго, і з усяе душы тваёй, і з усяе сілы тваёй і будзеш любіць бліжняга твайго, як сябе самага!“ (Марка 12. 30-31).

1. **Ўступленьне:** а) музыка духоўная: на раялі, скрыпцы ці інш. б) Пастар гаворыць або хор пяе: гімн. гл. № 150. 1—„Уладар Бог“.
2. **Гімн**: (усе разам пяюць стоючы які-небудзь № песьні).
3. **Апост. вызнаваньне веры:** (усе разам гавораць, гл. № II. а) — або б).
4. **Малітва Пастара:** (усе сядзяць або кленчаць з нахіленымі галавамі).
5. **Гаспо̀дня Малітва:** (усе разам кажуць, гл. № III.

6. **Музыка духоўная:** (так, як на пачатку).

7. **Чытаньне із Старага Завету** ці Тастамэнту: (калі выбраны які з псальмаў у гэтым сьпеўніку, то чытаецца наперменку — то пастар, то сабраныя).

   А потым пяюць усе: гл. № 149... „Сьвяты (3 разы) Госпад“ — стр. 133.

8. **Паведамленьне і ахвяра:** (пастар, або заступнік паведамляе, а хтось з выбраных зьбірае ахвяры, і пасьля ўсе пяюць стоючы гл. 151 а), або б) — стр. 134).

9. **Гымн:** (усе разам пяюць стоючы які-небудзь № песьні).

10. **Чытаньне із сьв. Эвангельля):** (Пастар або заступнік).

11. **Пропаведзь:** ці навука: (Пастар або заступнік).

12. **Гімн:** (усе разам пяюць стоючы № 146 і 147, або які-небудзь іншы № песьні).

13. **Хвала Богу:** Доксолёгія, (гл. № 152 — б) — стр. 134).

14. **Апост. багаслаўленьне:**

   а) усе пяюць стоючы № 152 а) або б) стр. 134,

   або б) пастар гаворыць з II ліс. Кор. XIII. 13. гл. № V багасл.

15. **Пастарскае абвешчаньне:** (пастар ці заступнік абвяшчае сабраным).



## II. а) (СЫМБОЛЬ ВЕРЫ).

## АПОСТАЛЬСКАЕ ВЫЗНАВАНЬНЕ ВЕРЫ.

(Можна адмаўляць і „Нікейскі Сымболь веры“, як ў праваслаўных).

Веру ў Бога Айца Ўсемагутнага Стварыцеля неба і зямлі; і ў Ісуса*) Хрыста Сына Яго Адзінага Госпада нашага, каторы як чалавек, пачаўся ад Сьвятога Духа і нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны быў пры Понтскім Пілаце, укрыжаваны, памёр і пахованы; на трэйці дзень ўваскрос; ўзышоў на неба; сядзіць па правай руцэ Усемагутнага Бога Айца, скуль прыйдзе судзіць жывых і ўмёршых. Веру ў Сьвятога Духа, у сьвятое Апостальскае ўсіх людзей зграмаджэньне, сьвятых разам прабываньне, грахоў адпушчэньне, умёршых ўваскрасеньне і ў вечнае жыцьцё.

Амэн.

(Амэн знач. няхай так станецца).

---

## б) СЫМБОЛЬ АБО ВЫЗНАВАНЬНЕ ВЕРЫ НІКЕЙСКАГА САБОРУ.

Веру у Адзінага Бога Айца, Усемагутнага Стварыцеля неба і зямлі, відомага ўсяго і нявідомага. І ў Адзінага Госпада Ісуса*) Хрыста, Сына Божага Адзінароднага, ад Айца роджанага спрадвеку, Сьвятла ад Сьветла, Бога праўдзівага

*) Ісуса — па грэцку; Jezusa па лаціні, а па беларуску будзе: Язуса — Язус Хрыстос.

ад Богу праўдзівага, роджанага, ня створанага, роўнага Айцу. Ім-жа ўсё істнуе. Дзеля нас людзей, дзеля нашага збаўленьня зыйшоўшага з Нябёс і прыняўшага цела ад Духа Сьвятога і Марыі Дзевы і стаўшага чалавекам. Распятага за нас пры Понтскім Пілаце, і замучанага і пахаванага і ўваскросшага на трэйці дзень, як у пісаньні, і ўзыйшоўшага на нябёсы і сядзячага праваруч ад Айца. І маючага зноў прыйсьці ў славе і судзіці жывых і умёршых. Яго-ж Гаспадарству ня будзе канца. І ў Духа Сьвятога, Госпада, ажыўляючага, ад Айца пахадзячага, з Айцам і Сынам чцімага і слаўлянага, прамаўляўшага праз прарокаў. — У адзіну Сьвятую Саборную і Апостальскую Царкву *) Вызнаваю адзіна хрышчэньне на ачышчэньне грахоў. Жду ўскрысеньня **) ўмёрлых і жыцьця пасьмертнага, вечнага.

Амэн.

---

# III. ГАСПОДНЯ МАЛІТВА.

(Гл. ноты № 148, стр. 133).

Ойча наш, каторы ёсьць ў Нябёсах. Няхай сьвяціцца імя Тваё, няхай прыйдзе Царства Тваё, няхай будзе Воля Твая, як у небе, так і на зямлі. Хлеб наш штодзённы дай нам сягоньня, і даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем даўжнікам нашым; і ня ўводзь нас на спакушэньне, а захавай нас ад злога! Бо Тваё ёсьць Царства, і сіла, і слава навекі!

Амэн.

---

*) Царкву — знача тое сама, што і Касьцёл, дык будзе: Касьцёл-Царква Хрыстова — як зграмаджэньне людзей, інстытуцыя ці установа, не як будынак.

**) Ажыўленьня умёршых, умерламу даць жыцьцё (wskrzeszenie); уваскрасеньне — zmartwychwstanie, а ўскрысеньне — wskrzeszenie.

# IV. СЛАВА БОГУ АЙЦУ.

(Гл. ноты № 150, стр. 134).

Слава Богу Айцу, і Сыну чэсьць, і Сьвятому Духу чэсьць, як была́ ў пачатку, цяпер ёсьць, трываць будзе на век-вякоў! Амэн.

---

# V. БАГАСЛАЎЛЕНЬНЕ.

(Пастар гаворыць із: II Карынт. XIII. 13).

Ласка Госпада нашага Ісуса *) Хрыста, і мíласьць Бога Айца, і супо́льнасьць Сьвятога Духа хай будзе з усімі вамі! — Амэн.

---

*) Ісуса — па грэцку, Jezusa (Езуса) па лаціні, а па беларуску будзе: Язуса.

# VI. Пераглям зьместу.

## A) БОЖСТВА (ад № 1 да 49).


| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| I. | Бог Ацец: . . . . . . . . . | ад № | 1 | да | 14 |
| II. | Бог Сын . . . . . . . . . . | „ „ | 15 | „ | 48 |
| | а) Нараджэньне . . . . . . | „ „ | 15 | „ | 31 |
| | б) Жыцьцё і праца . . . . | „ „ | 32 | „ | 34 |
| | с) Мучэньне . . . . . . . . | „ „ | 35 | „ | 36 |
| | d) Уваскрасеньне (Трыумф) | „ „ | 37 | „ | 40 |
| | е) Выслаўленьне . . . . . | „ „ | 41 | „ | 48 |
| III. | Дух Сьвяты . . . . . . . . | „ „ | 49 | „ | 49 |


## B) ЗБАЎЛЕНЬНЕ (ад № 50 да 103).


| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| I. | Грэх і пакаяньне . . . . . | ад № | 50 | да | 57 |
| II. | Прызваньне . . . . . . . . | „ „ | 58 | „ | 72 |
| III. | Наварот да Бога . . . . . | „ „ | 73 | „ | 78 |
| IV. | Імкненьне да хрысьціянскай дасканаласьці . . . . . . | „ „ | 79 | „ | 95 |
| V. | Хрысьціянск. дасканаласьць | „ „ | 95 | „ | 103 |


## C) ХРЫСЬЦІЯНСК. АРГАНІЗАЦЫЯ (ад № 104 да 119).


| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| I. | Божае Слова . . . . . . . | ад № | 104 | да | — |
| II. | Царква-Касьцёл . . . . . . . | „ „ | 105 | „ | — |
| III. | Таінствы і абрады . . . . . | „ „ | 106 | „ | 108 |
| IV. | Апошнія перад сьмерцяй рэчы . . . . . . . . . . . | „ „ | 109 | „ | 117 |
| V. | Урачыстыя дні . . . . . . . | „ „ | 118 | „ | 119 |


## D) РОЗНЫЯ ПЕСЬНІ (ад № 120 да 152).


| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| I. | Песьні ранічныя і вячорныя | ад № | 120 | да | 125 |
| II. | Місыянерскія . . . . . . . | „ „ | 126 | „ | 135 |
| III. | Песьні моладзі . . . . . . | „ „ | 136 | „ | 139 |
| IV. | Чалавецтва, народ, бацькаўшчына . . . . . . . . . . | „ „ | 140 | „ | 144 |
| V. | Багаслаўленьні . . . . . . | „ „ | 145 | „ | — |
| VI. | Літургічнага характару . . | „ „ | 146 | „ | 152 |

## УВАГІ:

1. Словы песьні, абнятыя гэткімі знакамі: (: . . . . . :) пяюцца 2 разы.
2. Літ. **а, б, в,**—песьні аднаго матыву або мэлёдыі.
3. Песьні: № з значк. */2, напр. 36*/2, 58*/2, 81*/2, 89*/2, 108*/2 увайшлі ў агульны лік ужо пасьля панумэраваньня і падзелу на зьместы, у часе друкаваньня.
4. Словы: сёньня або сягоньня можна вымаўляць і: сёдня, сяньня, сядня.
5. Словы: гімн — правільней вымаўляць: гымн.
   векаісты „ „ вякуісты.
   чыстата „ „ чысьціня.
6. Песьню № 49 можна пяяць і на ноту песьні № 50.
7. На стр. 10 песьня № 12, над 1 радком нотаў да 1-х дзьвёх паўзаў трэба напісаць: м у з ы к а, а па гэтых паўзах, пачынаючы ад іх, напісаць: с ь п е ў.

# 1. СЬВЯТЫ БОЖА!

1. Сьвяты Божа, сьвяты Божа ўсемагутны!
Вось сягоньня мы Табе тут шлем ад сэрца
весьць;
Сьвяты Божа, сьвяты і ўсюдыпрысутны, —
Тройцы сьвятой даем хвалу і чэсьць!

2. Сьвяты Божа, сьвяты Божа! Прад Табою
Го́лавы анёлаў нізка хіляцца ў паклон,
І усё тварэньне клоніцца з мальбою,
Бо Ты ўсеўладны і Твой вечны трон!

3. Сьвяты Божа, сьвяты! Хоць Цябе ня бачым,
Хоць не разумее клічу тут Твайго наш слух,—
Ты ёсьць у сусьвеце, ў сонейку гарачым —
Ўсюдыпрысутны, сьвяты й чысты Дух!

4. Сьвяты Божа, сьвяты Божа ўсемагутны!
Вось сягоньня мы Табе ўсе шлем ад сэрца
весьць;
Сьвяты Божа, сьвяты і ўсюдыпрысутны,
Тройцы сьвятой даем хвалу і чэсьць!

## 2. ЧАГО ЖАДАЕШ, БОЖА?

1. Чаго жадаешь, Божа, за Твае ўсе дары?
За тую дабрадзейнасьць, бязмерны ахвяры?
Царква й Касьцёл ня зможа быць, дзе Ты
ёсьць, Божа!
Ты ў моры і ў паветры, на зямлі і ў нетры!

2. Ты зòлата ня хочаш — Тваё ўсё на сьвеце,
Усё, што людзі маюць; ўсё, штò хочуць меці.
Дык вось Цябе мы шчырым сэрцам вызнаваем,
Нічым больш даражэйшым дзякаваць ня маем!

3. Ты, Госпад усесьвету, Ты стварыў і неба,
Залатыя зоры разьвесіў як трэба.
І зямельку нашу Ты зрабіў прыгожа —
Дзе жывёлы, рыбы, птушкі, дрэвы, збожа.

4. Будзь Ты нáм на век вéкаў—літасьцівым Божа!
Тваё дабро і ласку хто-ж тут пераможа?
Абарані ад злога, ратуй чалавека —
Хай нас Твая заўсёды сьцеражэ апека!

---

## 3. ГОСПАД НАС ЛЮБІЦЬ.

1. Гòспад нас любіць! Даў нам збаўленьне,
Гòспад нас любіць, любоў дарыць!
(Прыпеў): Дык засьпяваю: Госпад нас любіць,
Госпад нас любіць, любоў дарыць!

2. Хрыста паслаў Бог мне на збаўленьне,
Хрыста паслаў Бог і спас мяне!
Дык засьпяваю і г. д.

3. Божа Вялікі — сатры нам сьлёзы!
Божа Вялікі шкадуеш нас!
Дык засьпяваю і г. д.

4. Як Ты са мною — вяліка радасьць!
Як Ты са мною — вясе́люся! —
Дык засьпяваю і г. д.

5. Любіць хачу я, мой Ойча добры!
Любіць хачу я, — бо любіш Ты! —
Дык засьпяваю і г. д.

---

## 4. Радасна клічма.

1. Радасна клічма ўсе за-ра́з:
Бог любіць нас!
Для ўсіх пачаўся ласкі час —
Бог любіць нас!
Дык хай ня будзе горкіх сьлёз,
Бо сонца сьвеціць нам з нябёс —
Яго сьвет цемру ўжо панёс;
Бог любіць нас!
(: Бог любіць нас :) — (2 разы)
(Прыпеў): Радасна клічма ўсе за-ра́з:
Бог любіць нас!

2. Грашнік хадзі з усіх старон,
Бог любіць нас!
Для ўсіх нябесны кінуў трон,
Бог любіць нас!
Ах, гляньце: зноў Хрыстос ідзе,
І крыж Яго ў зор грамадзе,
Знак выбаўленьня ўсім нясе̇!
Бог любіць нас!
(: Прыпеў і г. д. :).

3. Хай так грыміць нам голас рэх:
Бог любіць нас!
Хрыстос спакой нясе для ўсіх —
Бог любіць нас!

Дык вось пакуль яшчэ жывем,
Пакуль не ляжам ў вечным сьне —
Хрысту мы песьню-гімн пяем:
Бог любіць нас!
(: Прыпеў і г. д. :).

---

(Пераклад з М. Лютара).

## 5. МАГУТНА КРЭПАСЬЦЬ—БОГ!

1. Магутна крэпасьць Го́спад Бог —
Аружжа дасьць і зброю!
Ён звольніць нас з усіх трывог,
Ён наша стража ў бою!
Сільны вораг, злы —
Прэць да барацьбы
Ліхам хоча ўзяць —
Нас пазабіваць; —
Хто-ж проці ўражай сілы?

2. Пякельных сіл ня можам зьбіць
І згінуць-бы нам трэба; —
Ёсьць ў нас ваёўнік — будзем жыць,
Бог даў Яго нам з неба!
Хто-ж Ён? — знаюць ўсе:
Імя Хрыстос нясе, —
Слаўны ў баёх
Ваёўнік Сам — Бог,
Ён сілы ўражы зможа! —

3. Хай злыдні пруць на цэлы сьвет
На нас сільля і здрады —
Не баімося ўсякіх бед
Дамо́ сабе ім рады!
Князь той сілы злой,
Вялікасьцяй сваёй

Не зашкодзіць нам, —
Ужо асуджан сам, —
Прысуд яго паваліць! —

4. Ніхто ня зломіць Божых слоў —
Ніхто не перайначыць!
Ўжо Бог нам помач слаць гатоў,
Дык вораг то пабачыць!
Хоча злы нас сьцяць
Усё дабро́ забраць,
Хай бярэ сабе,
Пекла ня мінѐ —
А нам збаўленьне будзе!

---

## 6. а) КІНЬ БАЯЦЦА!

1. Кінь баяцца, з намі Го́спад Бог!
Ён магутна нас бароніць,
Бог плячыма нас заслоніць,
Кінь баяцца з намі Госпад Бог!
(Прыпеў): З намі Бог, сільны Бог,
Не пакіне нас сярод трывог;
З намі Бог, сільны Бог,
Не стрымае нам сваіх падмог!

2. Кінь баяцца, з намі Госпад Бог!
Хоць жыцьцё ля нас бушуе —
Ён ад згубы нас ратуе,
Кінь баяцца, з намі Госпад Бог!
(: З намі Бог і г. д. :).

3. Кінь баяцца, з намі Госпад Бог!
Гром грыміць, віхры шалеюць,
Нашы сэрцы ня струхлеюць —
Кінь баяцца, з намі Госпад Бог!
(: З намі Бог і г. д. :).

## 7. б) ДАЙ НАМ, БОЖА, СІЛУ!

1. Дай нам, Боже, сілу й сьцеражы!
Потым прад Гаспóднім тронам —
Прад нікім неперαможным
Славы нам сваёй вянок ўлажы!
(Прыпеў): Дзяржыся — ай, дзяржыся!
Брат, сястронка, дзельна дзяржыся!
Дзяржыся — ай, дзяржыся —
Вечнай славы Бог вянóк нясѐ!

2. Вузка сьцежка да нябёс вядзé —
Будзе шчасьце, хто ня збочыць:
Дый з грахоў не замарочыць,
А шчасьліва да канцá прыдзé!
Дзяржыся — ай, дзяржыся! і г. д.

3. Баязьлівасьці ў сабé ня мей —
Хто баязьні не адгоніць,
Дык ад зла не абароніць
Гóспад баязьлівых тых людзей.
Дзяржыся — ай, дзяржыся! і г. д.

4. Глянь высока ў гóру аж да зор:
Дасьць Бог сілу нам ласкава —
Усюды, ўсюды Божа слава
І цябѐ вазьме ў нябёс прастор!
Дзяржыся — ай, дзяржыся! і г. д.

---

## 8. в) БУДЗЬЦЕ З БОГАМ!

1. Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
Хай парадай Бог нас водзіць,
Ад няшчасьцяў асвабодзіць;
Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
(Прыпеў): Аж ізноў з жыцьця дарог
Разам прыдзем да Хрыстовых ног;

Аж ізноў з жыцьця дарог
Да сьвятых Хрыстовых прыдзем ног!

2. Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
Хай Бог нас не пакідае,
Хай нам усяго хапае.
Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
(: Аж ізноў і г. д. :)

3. Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
Пакуль вочы сьмерць заслоніць,
Хай рука Яго бароніць;
Будзьце з Богам, аж зьбярэмся зноў!
(: Аж ізноў і г. д. :)

---

## 9. a) БОГ—ЁСЬЦЬ НАША СІЛА!

1. Бог—ёсьць наша сіла:
Абарона міла!
Дык трымацца можа,
Як Ты з намі, Божа,
Слабы дух.

2. Калі ўража стая
Згубна выступае —
Дух наш бяз трывогі,
Бо жджэ дапамогі
Анялаў.

3. Каб нат з усей сілы
Ворагі здушылі—
Не баімсь нічога,
Бо ўсяго такога
Замала.

4. Ёсьць, хто абароніць,
Злу напась адгоніць—

Той волат магутны:
Бо нас Бог прысутны
Бароніць!

5. Тварам ня ўкрывайся,
Духам выяўляйся,
Выбаў нас з пакуты,
Паламай ўсе путы—
Наш Божа!

6. Пакажы дарогі:
Як устаць на ногі,
Каб мы ня зблудзілі,
Дзе грахі хадзілі,
Тудою...

7. Мы за ўсё, за тое
Кінема благое,
Станемся братамі—
Добрымі людзямі—
Заўсёды!

---

## 10. б) БОЖА НАШ ТЫ, БОЖА!

1. Божа наш Ты, Божа!
Ад душы прыгожа
Дух Цябе сардэчна
Моліць, славіць вечна—
Як можа.

2. Разпалі нам грудзі:
Дух любоўю будзе,
Дый Дабра̀ парою
Шчыраю душою—
Прыбудзе!

3. Слава Божа з векаў,
А любоў—з прад-векаў,

Ласка бесканечна,
Абарона вечна—
З век-векаў.

4. Мы жывем ў нядолі,
Сумна і бяз Волі—
Надары пацехай:
Усіх пад роднай стрэхай—
Даволі!

5. Дзіўна нас гадуеш,
Сьцеражэш, ратуеш —
Дый бяз ліку дары,
Скарбы і ахвяры
Нам дорыш!

6. Дык за ўсё, што Божа
Міласьць даць нам можа:
Славім за ўсё цэла,
Просім Бога сьмела:
„Дай, Божа!“

7. Дай тут чалавеку
Заўсёды апеку:
Духа неслабога,
Сьцеражы ад злога,
Ад зьдзеку!

8. Як сьмерць пераможа:
Цела ў гроб палажаць—
Дай нам, што патрэба,
Каб прыйсьці да неба:
Наш Божа!

---

## 11 МОЙ БОЖА, ДЗЯКУЮ ТАБЕ!

1. Мой Божа, дзякую Табе, што сьвет стварыў,
Што так прыгожаю красой Ты сьвет акрыў,
Што радасьць сьвету падаеш, каб ладам жыў!

2. Я дзякую, што праз Цябе вясёлы я,
Што ўсюды творыць цудаў шмат рука Твая,
Што нат у цёмнай глыбі ёсьць любоў Твая.

3. І дзякую, што часам сум шлеш на мяне,
Што і калючы ружаў цьвет нас замане,
Але ніколі шчасьця бліск Твой ня міне.

4. Я дзякую, што шчадратой дарыць Ты рад,
Што дасыта даеш усё і не зашмат,
Каб не псаваўся і ня быў жадзён наш брат.

5. Я дзякую, што непакой Ты нам нясеш —
Да нашых сэрцаў, нашых душ жуду ліеш,
Каб чалавек пазнаў, што Ты спакой даеш. —

---

## 12. МІЛАСЭРНЫ ТЫ.

1. Міласэрны Ты для грэшных,
Што ўсё блудзяць ў цемры злой,
Навярні іх і пацеш іх,
Хай пакаюцца сьлязой.
(Прыпеў): Сэрца к'ім прыхілі,
Каб грашыць не маглі!

2. Міласэрны Ты гаротным,
Што цярпяць журбу і боль,
Пагарджаным і маркотным
Раны вылячыць пазволь!
Сэрца к'ім прытулі,
Каб пацешыцца маглі.

3. Міласэрны Ты убогім,
Што галодныя жывуць,
Што людзям працуюць срогім,
Ад нядолі, зьдзеку мруць...
Скінь цяжар, памажы,
Дай пацеху душы!

4. Міласэрны будзь, о Божа!
Чуй людзкі боль, енк і плач,
Творча Міласьць хай award,
Зло ў дабро ім перайнач!
Цяжка жыць ім ня даш,
Літасьць мей, Ойча наш!

---

## 13. ЧЭСЬЦЬ БОГУ ПЯЁМ.

1. Чэсьць Богу пяём мы ў гімне сваём,
Дань шчыру нясем і ўночы і днём, —
Ён наш абаронца, пільнуе Ён нас,
Вядзе нас да сонца у кожны дня час!

2. За шчодрых шмат ласк, хай славу аб Ём
Разносіць наш брат і ўночы, і днём —
З падзякай за тое, што ўвесь людзкі род,
З нізоў паднімае да неба высот!

3. Мы молімся ўслух—Айцом ёсьць нам Ён
Для верных слуг Ён кідае свой трон,
Ён сэрцам кіруе і ўсенькім жыцьцём,
І нас Ён гадуе і ўночы і днём!

4. Трымаймася-ж з Ім заўсёды што дня,
Хай верыць ва ўсім ўся наша радня,
Бо ў Ём ёсьць і мудрасьць і рада у Ём,
Збаўляе, ратуе ці ўночы, ці днём! —

---

## 14. ОЙЧА НЯБЕСНЫ!

1. Ойча Нябесны, Божа Магутны,
Дух Пацяшэньня, Праўдзівасьці!
Ты, што ўсё знаеш — ўсюдыпрысутны,
Сонца сусьвету, нас асьвяці!

2. Ойча Нябесны, Ты Скарб душ многіх!
Дзяцей сваіх тут не забывай;
Прыйдзі да сэрцаў нашых убогіх,
Багаславі нас і долю дай

3. Ойча Нябесны. Ты нас ад злога
Ачысьць і разам абараняй
Ласкай сваёю і на дарогу
Збаўленьня стануць нам памагай!
Амэн.

---

## 15. ТАМ Ў БЭТЛЕЕМЕ

(Калядка).

1. Там ў Бэтлеѐме, там ў Бэтлеѐме
Зорка ўсё ясьнее,
Анял любоўі аб сьлёзах, кроўі
Разказаў падзеі —
Грэх распанеўшы, злыдзень засеўшы,
Сьмерць панавала, бяда ўзрастала —
Бог нас добра знае — Сына прысылае—
У нядолі памагае. —

2. Там ў Бэтлееме, там ў Бэтлееме
Пастушкі нам кажуць:
Чаго людзкая думка ня знае
Мовай не развяжа —
Бог на саломе сеў як на троне,
У бядзе, ў нядолі слаўны Ён болей,
На нізе магутны, радаю прысутны —
Дзіця-Бацька спрадвек чутны! —

3. Ты, Бэтлееме—ты, Бэтлееме,
Места ёсьць царова,
У сене пахнючым Бог нам жывучым
Даў жыцьцё нанова;
Прырок—то споўніў: з грахоў нас звольніў,
Дух адраджае, нас аднаўляе,
Пастушкі, анёлы рады і вясёлы —
Дзіва, дзіва навакола!

4. Ты, Бэтлееме; ты Бэтлееме,
Места слаўнай рэчы:
Даў песьні новы і роднай мовы —
Ты скарб чалавечы!
На землю гэту Збавіцель сьвету,
Прынёс збаўленьне, асвабаджэньне,
Даў з ярма свабоду беднаму народу —
Адрадзіў усё пакаленьне.

---

## 16. К' жалабочку

(Народная калядка).

1. К' жалабочку, у хлявочку
Да Хрыста хто пабяжыць,
Ды к'малому, хоць ня ў дому,
Хто з паклонам пасьпяшыць?
(Прыпеў): (: Пастушкі хоць прыбывайце,
І Хрысту там засьпявайце, —
Богам нашым мае быць! :)

2. І мы самі ўсьлед за вамі
Там з паклонам пасьпяшым;
Хай на Бога мы малога
Усе разам паглядзім.
(: Як, народжаны убога,
Ён там плача, хоць сын Бога,
Дык Яго там пацяшым! :)



BIBLIOTEKA NARODOWA BN

3. Каб на цэлым сьвеце белым
Людзі абвясьціць маглі,
Што у нас ёсьць дарагі госьць —
Эммануіл на зямлі!
(: Дык Яго мы прывітайма
І вясёла засьпявайма:
„Славу, чэсьць давай, хвалі!":)

4. Божы Сыну, ці магчыма,
Што нябесну выгаду
Ты пакінеш і прыбудзеш
На зямлю і на бяду?
(: „Так любоў мая хацела,
Каб людзей высока мела,
Аж пад небам — на раду!" :)

---

## 17. ГОЛАС НЯСЕЦЦА.

(Калядка).

1. Голас нясецца у начнòй цішы:
„Бог нарадзіўся ў целе і душы,
(Прыпеў): „Пастушкі барджэй ўставайце,
У Бэтлèем пасьпяшайце —
(: Бога бачыць там! :)

2. Пайшлі, на сене дзіцятка знайшлі,
Хрысту маломy паклоны далі;
Пакланіўшысь навакола,
Запяялі там вясёла —
(: З радасьці яны. — :)

3. Хрысьцé наш мілы, здаўна чаканы,
Гадоў з чатэры тысяч жаданы,
Аб Табе быў слух прарочы,
Каб чакаць, і Ты там ўночы
(: Нарадзіўся нам! ):

4. І мы чакаем у начной цішы,
Калі прыйдзеш зноў да нашай душы?
Дык пакорна памалемся,
Мы Хрыста ізноў дажджэмся,
(: Ён казаў, — прыйдзе! — :)

---

## 18. ЯК ХРЫСТОС НА СЬВЕТ ПРЫХОДЗІЦЬ.

(Калядная).

1. Як Хрыстос Сын Божы
К‘нам на сьвет прыходзіць,
Цёмна роч у зьяньні
Зіхацістым бродзіць.
Рады Анялы сьпяваюць,
І пад неба выслаўляюць:
(Прыпеў): „Богу чэсьць, Богу чэсьць, Богу чэсьць,
Слава Богу ў небе!" —

2. Пастушком казалі,
Што начлег там мелі,
Каб барджэй ўставалі —
У Бэтлеем беглі,
Бо Сын Божы нарадзіўся,
Усяго сьвету Спас зьявіўся;
„Богу чэсьць і г. д. —

3. — О, сьвятыя духі —
Пасланцы ад неба,
Вы ясьней скажэце,
Што рабіць нам трэба,
Бо ўсяго не разумèем
І ад страху аж трухлеем. —
„Богу чэсьць і г. д. —

4. „Ў Бэтлеем бяжэце,
Дзе ляжыць дзіцятка, —
Ў пялёнках на сене
Палажыла матка, —
Дык паклом Яму аддайце,
На жалейках заіграйце:“

„Богу чэсьць і г. д. —

---

## 19. ЦІХА, МАЛАЯ БУДКА.

(Старая народная калядка).

1. Ціха, малáя будка благая,
Поўна хвалы, праменьня,
Вось-жа ляжачы, прад намі, сьпячы
Ісус *) малы на сене.

2. Анялы ў белі, як прыляцелі,
Сталі даваць паклоны,
Вóласы з золата, крыльля ад волата,
Вышэй вясёлка на фоне.

3. Поўна зьдзіўленьня, што Бог на сене,
Ім цэлы сьвет зьмяніўся;
Мудрасьці мудрасьць, сьветласьці сьветласьць,
Бог нам з целам радзіўся.

4. І вось там многая маса убогая
Бачыць Бога на сене;
Радасьці поўна, і шчасьцем роўна
Упала на калені.

5. Простыя людзі, Бог з вамі будзе,
Скончыўся час нядолі,

---

*) Ісус па грэцку, Ѐзус па лаціні, а па беларуску будзе: Язус.

Помач ў патрэбе, слава на небе,
Спакой вам ў добрай волі!

6. Чэсьць Табе, Божа! Шчыра, як можам,
Дзякуем сэрцам цэлым;
Пекла закрыта, неба аткрыта —
Слова ста́лася цѐлам! —

---

## 20. ШТО-Ж РАБІЦЬ МЫ БУДЗЕМ?

(Народная калядка).

1. Што-ж рабіць мы будзем, брацьця пастушкі,—
Дзіцятка малое плача ў калысцы?
Мы вясёла засьпявайма,
Акруцѐм і атуляйма,
Хай уцішыцца!

2. Можа лепш дзіцятку на жалейках граць,
Або на сьвісьцёлках лепш Яму сьвістаць?
Засьвішчэце у жалейкі,
Хай ня плача больш маленькі
Наш Ісус *) Хрыстос!

3. Або так пацешым наша дзіцятка,
Мы Яму даруем бела ягнятка.
Дык ня плач ужо дзіцятка,
Вось жалейкі і ягнятка,
Баўся дый ня плач!

4. Перастала плакаць дзіцятка, як-бач,
Вочкі заплюшчае, сон бярэ — ня плач.
Дык паложым у пасьцельку
Засьпявайма „калыбельку“:
„Сьпі ўжо, сьпі ўжо, сьпі“!

---

*) Ісус па грэцку, па лаціні — Ѐзус, а па беларуску будзе — Язус.

## 21. ЖОЛАБ ТЫ УБОГІ.

(Народная калядка).

1. Жолаб ты убогі,
Што ў табе мы бачым?
Мы магутнасьць бачым Бога
Ва ўлоньні дзіцячым.

2. Божае дзіцятка.
Ты скажы урэшце,
Хто Цябе паклаў на сена
У гэтым сумным сьвеце?

3. І якая сіла
Гэты цуд зрабіла,
Што на земскі плач нядолі
Радасьць тым ступіла?

4. Для чаго, скажы мне
Бог ўсяго стварэньня,
Сёньня Сам тут нарадзіўся
Для майго збаўленьня? —

5. Жалабок убогі
Што ў табе мы бачым?
Мы любоў тут бачым Бога
У целе дзіцячым!

---

## 22. СЁНЬНЯ РАДАСЬЦЬ СТАЛА.

(Калядка).

1. Сёньня радасьць стала,
Дзіўна, нябывала,
(: Над Бэтлеем зорка ясна
Сьвету зазіяла. — :)

2. Там Хрыстос радзіўся,
З дзевы ўцелясьніўся.
(: Як дзіцятка пялёнкамі
Убогімі спавіўся :)

3. Анялы сьпяваюць,
Спаса выслаўляюць
(: Усім народам весьць вяліку
Сёньня абвяшчаюць. :)

4. Також й мы сьпявайма,
Спаса прывітайма,
(: Роджанаму ад Марыі
Чэсьць, хвалу аддайма! :)

---

## 23. БОГ РАДЗІЎСЯ З ДЗЯВІЦЫ.

(Калядка — народная).

1. Бог радзіўся з дзявіцы,
Выбавіў нас з цямніцы.
(Прыпеў): Тòга дня вясёлага —
Нараджэньня Божага,
Радуймася, вясельмася,
Богу чэсьць, хвалу дайма, сьпявайма!

2. Неба поўна радасьці,
Зямля поўна сьветласьці.
Тога дня і г. д. —

3. Анялы так сьпяваюць,
Нас к'вясельлю ўзываюць: —
Тога дня і г. д.

---

## 24. ДЗІЦЯТКА НАРАДЗІЛО́СЯ.

1. Дзіцятка нарадзіло́ся, — радзілѐся;
( : Ў сьвет вясельле разнясло́ся :)

2. Узяло́ від чалавецтва, чалавецтва,
(: Што Яго пакрыла Божства. :)

3. Спазнаў тое вол і осьлік, вол і осьлік:
(: Што Дзіцятка — Божы госьцік :)

4. І прыехалі манархі, — тры манархі,
(: Прывязьлі Яму падаркі. :)

5. А падаркаў тры там была, тры там была:
(: Золата, мырра, кадзіла. :)

6. Дык на Божа нараджэньне, — нараджэньне
(: ўсенька весялісь тварэньне! :)

7. Божу Тройцу вызнавайма, — вызнавайма,
(: Богу чэсьць, хвалу давайма! :)

(Народная калядка)

---

## 25. У КАЛЯДНЫ ВЕЧАР — НА КУЦЬЦЮ.

(Калядка).

1. У калядны вечар сэрца весялее́,
Як са ўсходу зорка ярка заясьнѐе —
Да вячэры ў згодзе ўся радня сядае,
І калядны песьні радасна сьпявае.

2. А сялянскі дзеткі па старым звычаю
Ва ўсіх вёсках, сёлах ў нашым родным краю
Бавяцца вясёла за сталом ў саломе,
Каб усё вялѐся добра ў родным доме.

3. А па той забаве іх склікае маці,
Кажа да малітвы ручкі ім складаці,
Бо за бацьку й матку і за ўсю радніну
Трэба памаліцца ў гэтую часіну. —

4. А пасьля найбольшы шчыра прамаўляе
І за словам маткі гучна паўтарае:
„О, Хрысьце Маленькі, Мілы наш Язусе,
„Памажы ўстаць любай роднай Беларусі!

5. „Памажы ўстаць хутка, ліха переражыці
„І ў вялікай славе Госпада хваліці.
„Памажы, пацеш, як сьвятам — калядамі!“. —
Просіцца так беларускімі дзяцямі.

6. Хай ляціць да неба гэткая малітва,
Сільна, нат сільнейша, чым з паганствам бітва
Гэтая малітва нас ад сьлёз і гора
Збавіць і падніме, быццам з глыбі мора! —

---

## 26 а) СЬВЯТАЯ НОЧ.

1. Сьвятая ноч, дзіўная ноч!
Дрэмле ўсё — толькі ня сьпіць
У Багаслаўленьні Божа сям‘я—
З Дзіцяткам, рада вельмі яна,
(: Радасьць ў сэрцах гарыць. :)

2. Сьвятая ноч, дзіўная ноч!
Голас ад неба зыйшоў:
„Цешцесь - сёньня радзіўся Хрыстос,
Радасьць, збаўленьне ўсім Ён прынёс,
(: На сьвет з неба прыйшоў!“ :)

3. Сьвятая ноч, дзіўная ноч!
Бог нас да неба прызваў; —
Аткрывайце-ж вы сэрцы свае,
Божу Ласку хай ўсё пазнае —
(: Ён збаўленьне нам даў! :)

---

## 27. б) СЬВЯТАЯ НОЧ.

1. Сьвятая ноч! Ў гары іскрыць,
Мільёны зор, усё ўжо сьпіць,
Толькі Ма́тухны сон не бярэ —
У гэту ноч Божы Сын на дварэ
(: Сьпіць на ўлоньні Яе :)

2. Сьвятая ноч! Весьць добрую
Анял даў ў ноч шчодрую —
Пастушком гэтым зоркай сьлед нёс,
Што радзіўся там на сьвет Хрыстос —
(: Што Ён Спас Божы наш :)

3. Сьвятая ноч! Дзіўная ноч!
Хрысьце! Цяпер грэх пойдзе проч,
З Тваёй ласкі прагнаў Ты цень,
Нам забліснуў збаўленьня дзень —
(: Тваймі радзінамі! :)

---

## 28. АНЯЛ ПАСТУШКОМ СКАЗАЎ.

(Калядка).

1. Анял пастушком сказаў:
„Госпад нарадзіўся вам —
ў Бэтлеем месьці цара Давіда,
З пакаленьня Юдава —
З жанчыны Марыі“.

2. Хочучы гэта спазнаць
Дый цуд Божы аглядаць
Пабеглі у Бэтлеем ахвотна
І знайшлі дзіцятка там.
Марыю з Язэпам.

3. Нарадзіны—цуд з цудаў—
Дзівавацца—мала слоў:
Дзявіца Сына Бога радзіла,
З Божай Ласкі насіла —
З дзявоцтва ня зыйшла.

4. Гэткай славы Госпад-Бог,
Як бядак, на сене лёг —
Багатых мураваных палацоў
У нарадзіны не знайшоў —
Сусьвету Гаспадар!

5. Ўжо збылося тое ўсё
Што запісана было:
Галінка Арона вось ажыла,
Жывацьветам зацьвіла —
Дый плод свой прынясла.

6. Бога слухайце Айца,
Што аб гэтым кажа нам:
„Сын мой ёсьць гэты мілы адзіны—
Вам ў раю абвешчаны,
Дык слухайце Яго“!

7. Богу слава і хвала̀,
Што ніколі не ўмярла̀:
Як Айцу, так і Сыну Божаму,
Так і Духу Сьвятому
Разам ў Тройцы аднаму!

## 29. АЙ, ДЗЕТКІ, ІДЗЕЦЕ.

(Калядка).

1. Ай, дзеткі, ідзеце — ідзеце хутчэй,
У хатку сьвятую сьпяшэце барджэй! —
У дзіўнай такой і сьвятой-жа начы
Сын Божы прыйшоў, каб людзём памагчы.

2. Глядзеце: на сене Збавіцель ляжыць,
Глядзеце, як ясна там сьвет зіхаціць, —
Малое прыгожа дзіцятка ляжыць,
І анялаў шмат там ляціць і бяжыць.

3. Ляжыць Ён, ах, дзеткі, ў саломе для нас,
Язэп там з Марыяй начуюць ў той час,
Бягуць пастушкі і паклоны даюць,
І анялаў хоры пра славу пяюць.

4. Ай дзеткі ідзеце, і г. д.

---

## 30 БОГ ЯВІЎСЯ, НАРАДЗІЎСЯ.

(Калядка).

1. Бог явіўся, нарадзіўся,
Каб сьвяціці сонцам сьвету!
Ноч ўцякае, сьвет пазнае —
Бог зыйшоў на землю гэту.
(Прыпеў): Ужо анёлы ўсе вясёлы
Разьнясьлі ўсім вестку гэту,
І ад стада люд-грамада
Йдзе з паклонам Спасу сьвету.

2. Бог радзіўся, ўсім явіўся,
Зоркай шле ўсім добры весьці —
Ў Бэтлееме лёг на сене
Ратаваць люд ў вёсцы, ў месьці,
ўжо анёлы і г. д. —

3. Бог явіўся, ўсім радзіўся, —
Выбавіць усіх ад злога!
Пасьпяшайце дый пазнайце —
Дзе Эвангельля дарога! --
Ўжо анёлы ўсе і г. д.

---

## 31. ТРЫ МАНАРХІ.

(Калядка).

1. Тры манархі, мудры людзі, —
Дзе вы ў падарожы?
Што казаць цудоўна будзе
ў Бэтлеем Сын Божы?
Ён паложаны на сене —
Не на царскім ложку,
Сьвет Яму гатуе церні
Дый крыжову дошку...

2. Мудра знайце: зло людзкое
Дзе́цятка ганяе —
Штось пачуеце благое:
Гэрад здрадзіць мае.
Божу справу асуджаюць,
Верных цiснуць срога —
І да крыжа прыбіваюць
Ўжо Хрыста малога.

3. Ці-ж вас гэта не пужае
Верай памыліцца?
Вера ваша не слабая —
Злыдняў не баіцца!
Божу мудрасьць вам дарога
Адкрывае вочы,
І найсьці Хрыста малога
Ваша вера хоча.

4. Хоць атулены ў пялёнку —
Творыць многа цудаў,
Разьнеслася слава з вонку
Да ўсіх бедных людаў.
Мудры людзі — гляньце жыва.
Ужо ідуць народы —
Дзе для духа ёсьць пажыва,
Сэрцу — асалода!

5. Да Цябе мы пасьпяшаем,
Наш Хрысьце-Дзіцятка,
Дый паклон табе даць мае
Нашая грамадка!
Пойдзем, каб дарыць кадзіла,
Што ў душы мы маем,
Золата-ж — у сэрцы міла
Для Цябе хаваем!

---

## 32. ШАЛЕЕ БУРАЙ МОРА.

1. Шалée бурай мора глыб,
Кідае хваля чоўн слабы;
„Хрысьце! Ты нас лаві, як рыб, —
Устань, ня сьпі"!

2. Між галілейскіх бурных хваль
У рыбакоў пачаўся жах:
„Хрысьце"! Ад сну Ты глянуў ў даль —
Згінуў страх.

3. Хрысьце! Ты ўстаў, і голас твой
У сьлед за віхрам паляцеў —
Плыў цудам чоўн рыбацкі той,
Ты схацеў.

4. Да нас, як бура страшыць зноў,
Сьпяшы, Хрысьце, ў час бурны той,
Скажы нам толькі пару слоў:
„Будзь спакой!“—

Амэн.

---

## 33. Ў ГАЙ УВАЙШОЎ ЗБАВІЦЕЛЬ.

1. Ў гай увайшоў Збавіцель наш,
Каб супачыць ў той час!
Бо пабляднеў і зморан быў
І пот па твару плыў.
Зе́лень аліўкаў укрыла Яго,
Фігаў галінкі студзілі Яго,
Ружаў калючкі сьцераглі Яго —
Як быў у га́ю Хрыстос.

2. Ўжо адыйшоў цярпеньня цар
Крыжа нясьці цяжар;
Прыйшла ўжо пара крывавых мук,
Цярпець з варожых рук...
Гай той аліўкаў пакрыўся імглой,
Фігаў галінкі — бы сьлёзнай расой,
Краскі ружовы зьмянілі цьвет свой—
Бо ўжо крыж панёс Хрыстос...

Амэн.

---

## 34. а) УСЁ АБНЯЎ СОН.

1. Усё абняў паўночны сон,
На землю месяц сьвет свой шле;
Гары Аліўкавае склон
У белай ледзь відаць імгле.

2. Дзе ціхі сад як-быццам спаў,
Дзе ад расы ўсё іскрыць —
Хрыстос там на калені ўпаў,
А з болю твар Яго дрыжыць...

3. Паплыў чырвоны з твару пот —
Яго ўнутры змаганьня знак,
Жыцьцё дае за ўвесь варод —
Ягоны вусны шэпчуць так:

4. „Ацец мой! Гэту чару мук
Бяры назад, аслаб тугу,
Вазьмі мяне з варожых рук —
Так умярці я не магу...“

5. „Але, хоць горка так яна,
Хоць так баліць душа́ мая, —
Я го́рыч вып‘ю ўжо да дна —
Хай воля станецца Твая!“

А м э н.

## 34. б) ПАЎНОЧНЫ ЧАС.

1. Паўночны час, у цемнату
На сонных месяц бліск свой шле;
І чуць Аліўкаву гару
Відаць у белай там імгле.

2. Дзе Гэтсыманскі сад густы,
Дзе ад расы лісьцё іскрыць,
Там на каленях, на зямлі
Ісус*) задуманы стаіць. —

*) Ісус па грэцку, Jezus па лаціні, па белар. будзе: Язус.

3. Дрыжыць ад болю бледны твар,
Крывавы пот пакрыў чало́,
Страшны на сэрцы лёг цяжар —
Ўсё тут к‘ малітве прывяло:

4. „О, Ойча мой! Ты чару мук
Вазьмі адсунь, прашу Цябе,
Бяры мяне з паганых рук,
Бо мукі блізка ад мяне...

5. Сваё цярпеньне знаю ўсё,
Гатоў я выпіць аж да дна
І за людзей аддам жыцьцё —
На тое воля ёсьць Твая!“

Амэн.

---

## 35. ШТО ЦЯРПЕЎ ТЫ.

(Вялікапостная).

1. Што цярпеў ты з цяжкіх ранаў
Божа Хрысьце зьлітуйся на намі. } 3 разы

2. Божа наш! Хрысьце нам мілы,
Ягнятка вельмі цярплівы!
Даўся, даўся да крыжа прыбіці,
Каб я, каб я больш ня мог грашыці!

3. Дык заплач-жа, чалавеча —
Глянь — які Бог міласэрны, —
Грэх твой, грэх твой Госпада скалечыў,
Кайся, кайся! грэшны дый мізэрны!

4. Ўжо сказаў апошня слова,
Ужо спусьціў на грудзі голаў...
Маці, маці ў сьлёзах замлявае,
ў жальбе, ў жальбе з плачу ледзь жывая.

5. Загрымела навакола —
Дый зямля аж раскалолась...
Сотнік, сотнік кажа: „Сын вось Божы!“
Людцаў, людцаў веручых трывожыць.

6. Потым бок Яму прабілі —
Кроў з вадою зтуль пралілі...
Мы тут, мы тут абліты сьлязамі,
Божа, Хрысьце, зьлітуйся над намі!

---

## 36 ПАЙДЗІ ДА НОГ ХРЫСТА.

1. Пайдзі да ног Хрыста, пайдзі
Там, дзе Хрыста твой грэх прыбіў —
Там на Гальгоце за цябе
Госпад кроў на крыжу праліў!

2. Ці сьлёз няма, як відзіш, што
Яго там кожны лаяў, біў?
Бач, як цярпліва і бяз слоў
Гóспад кроў на крыжу праліў!

3. А толькі ціхі шопат Ім
Любові сільнай чутны быў —
Бо за мучыцеляў сваіх
Гóспад кроў на крыжу праліў!

4. Любові гэтай стаўся цуд,
Каб чалавек ўвесь ёю жыў,
Дык мы падзяку запяём:
Гóспад кроў на крыжу праліў!

А м э н.

---

## 36½. О, ЗРАНЕНА, БАЛЮЧА.

1. О, зра́нена, балюча
Хрыстова галава́,
З цярнёваю калючай
Каронай ля чала.
О, Божая Ты голаў,
Давалі чэсьць Табе,
Цяпер шмат ран, праколаў —
Ты цэнна для мяне!

2. Як выражу я, Спасе,
Падзяку тут маю
Табе у гэтым часе
За муку, сьмерць Тваю?
Вазьмі мяне з сабою,
Як ўласнасьць забяры —
Я хо́чу жыць з Табою
І ў кожнай быць пары!

3. Са мной будзь пры скананьні —
Хачу я ўзяць Твой крыж
Цярпліва і ў пашане
Нясьці Яго у выш!
Хачу я прытуліцца
І ў Твой Аблік глядзець,
З Табой ажыць, збудзіцца —
Збаўленьне вечна мець! —

---

## 37 а) ВЯСЁЛЫ ДЗЕНЬ СЁНЬНЯ.

(Вялікодная).

1. Вясёлы дзень сёньня стаўся,
Што з нас кожны спадзяваўся:
З гробу Хрыстос нам узьняўся.
(Прыпеў): Алелюя! Алелюя!
(або): Слаўце Бога! Слаўце Бога!

2. Цар нябёс устаў ня гніўшы
З гробу, быццам цьвет зацьвіўшы,
К'нам з магілы зноў ступіўшы,
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

3. Зьнішчана нячыста сіла —
Нетра злога — быццам гніла —
Міласьць к бедным наступіла, —
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

4. Тры дні быў у нетры злога,
Дый бацькоў стуль вывёў многа,
І пайшоў з імі да Бога. —
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

5. Патрыярхі рады сталі,
Што у цемры прабывалі,
Дый на гэта адказалі:
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

6. „Слаўся, Го́спадзе, прысутны,
Сыну Божы, ўсемагутны,
Што зьняў з нас пякельны путы!"
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

7. Радасьць там вяліку мелі,
Як на Го́спада глядзелі,
Бо даўно́ бачыць хацелі, —
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

8. Го́спад сілай Божай ўваскрос:
Дый пячаткі гроб не разьнёс,
Стражу толькі жахам патрос.
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

9. З гробу камень адваліўся —
І Хрыстос з мёртвых збудзіўся,
Верным людзям Сам зьявіўся!
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

10. Апосталы сабраліся,
Што былі ўжо разыйшліся;
Па Ісусу *) смуцячыся...
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д — :)

11. Усе вельмі рады сталі:
Хрыста з мёртвых дачакалі,
Што Хрыстос ўваскрос прыждалі!
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

12. Потым, як ім аб'явіўся, —
Роднай Матухне зьявіўся:
З Ёю разам нацяшыўся.
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

13. Праз Хрыстова ўваскрасеньне:
Бог даў людзям адпушчэньне,
Душам грэшным даў збаўленьне!
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

14. Хрысьце! Што ўваскрос у тры дні,
Хай пагінуць нашы злыдні,
Хай грашыць ужо нам збрыдне!
Алелюя! і г. д.—
(: Слаўце і г. д.— :)

---

*) Ісусу — белар. Язусу.

## 38 б) ЎВАСКРАСЕНЬНЯ ЦУД ХРЫСТОВЫ.

(Вялікодная).

1. Ўваскрасеньня — цуд Хрыстовы
Нас разьдзеленых палучыць,
Глянь у гору! кінь аковы!
Ён нас радасьці навучыць.
Алелюя!
(або): Бога слаўце!

2. К мілым жаваранкаў, плішак,
Пеўняў ранкам зычным песьням
Кліч далучым без аддышак:
„Мы ўваскрэсьнем! Мы ўваскрэсьнем!"
Алелюя!
(: Бога слаўце! :)

3. Нам нічога: сьлёзы, зьдзекі,
Што цярпіць наш дух і цела —
Мы паўмёртвы, мы калекі,
Нам ўваскрэснуць трэба ўмела!
Алелюя!
(: Бога слаўце! :)

4. А Хрыстос цудоўна творыць:
Злое ломіцца і чэзьне, —
І ў душы штось нам гаворыць:
Мы ўваскрэсьнем! Мы ўваскрэсьнем!"
Алелюя!
(: Бога слаўце! :)

5. Хай нас зло, як хоча, мучыць —
А мы станьма, як сьцяною,
Бо нас цуд Хрыста навучыць,
Як змагаціся з бядою!
Алелюя!
(: Бога слаўце! :)

6. У Вялікдзень веру маем —
Сёньня ўжо пара прадвесьня,
І ўсе радасна сьпяваем:
Мы ўваскрэсьнем! Мы ўваскрэсьнем!
Алелюя!
(: Бога слаўце! :)

---

## 39. а) ЎВАСКРАСЕНЬНЯ СЁНЬНЯ ЧАС.

1. Ўваскрасеньня сёньня час, — Алелюя!
Хай сьпявае кожны з нас: — Алелюя!
Хай хор анялаў грыміць: — Алелюя!
Хай пяе, хто хоча жыць: — Алелюя!

2. Шмат для радасьці прычын, — Алелюя!
Сьмерць зьніштожыў Божы Сын, — Алелюя!
Мук цяжкіх мінулі дні, — Алелюя!
Славы зіхацяць агні, — Алелюя!

3. Стража, камень і пячаць — Алелюя!
Не маглі Хрыста стрымаць, — Алелюя!
Для Яго ня ночы край, — Алелюя!
Ён жыцьця даў новы рай! — Алелюя!

4. Нову сілу Ён нам даў, — Алелюя!
Сьмерць і сьвет Ён зваяваў, — Алелюя!
Раз памёршы быў за нас, — Алелюя!
А ўваскрос на вечны час. — Алелюя!

5. Дык ня страша ўжо сабой — Алелюя!
Замагільны халод той, — Алелюя!
Хоць і сьмерці час прыдзе, — Алелюя!
Звонваскрэсны загудзе! — Алелюя!
Амэн.

---

**39.** б)

1. Ўваскрасеньня сёньня час, — Алелюя!
Хай сьпявае кожны з нас: — Алелюя'
Хай анельскі хор пяе: — Алелюя!
Ўжо прырода ўся жыве! — Алелюя!

2. Стаўся фактам слаўны чын, — Алелюя!
Даў збаўленьне Божы Сын, - Алелюя!
Мук страшных мінулі дні, — Алелюя!
У сэрцах радасьці агніі — Алелюя!

3. Што-ж той камень й старажы? — Алелюя!
З гробу ўстаў Ісус*) жывы — Алелюя!
Ён разбурыў цемры край, — Алелюя!
Даў жыцьцю магчымы рай! — Алелюя!

4. Вечнай славы поўны Ён, — Алелюя!
Бо панішчыў сьмерці трон, — Алелюя!
Целам ўмёр Ён дзеля нас, — Алелюя,
Каб нам жыць на вечны час! — Алелюя!

5. Ўжо цяпер і знаем мы, — Алелюя!
Сьмерць ня вечна на зямлі, — Алелюя!
Хоць магільны во́зьме сон — Алелюя!
Уваскрасеньня збудзіць звон! — Алелюя!

А м э н.

---

## **40** ВЯЛІКОДНЫ ГІМН.

Праз Тваё, Хрысьце, Уваскрасеньне —
Сыну Божы, адпусьці нам
ўсе саграшэньні!
Мы верымо, што Ты ўваскрос,
Жыцьцё нам новае прынёс,
Ад вечнай сьмерці нас спас,
Магутнасьць Божу зьявіў для нас!
Алелюя! (Слаўце Бога!)

---

*) Па белар. Язус.

## 41. ГІМН ПАДЗЯКІ.

1. Гімн падзякі чую ў сэрцы —
За мяне Хрыстос сканаў;
Быў Ён ў страшнай паняверцы,
Каб я век шчасьлівым стаў.
(Прыпеў:) Дух мой, слаў Хрыстá, маліся,
Ён збаўленьне даў табе;
Ад грахоў ты адвярніся,
Ён крывёй абмыў цябе!

2. Гаспадар усёга сьвету,
Ён наш Госпад, Ён наш цар!
Што-ж дасі Яму за гэта,
За Яго ахвярны дар?
Дух мой, слаў і г. д. —

3. Алтароў Ён не жадае,
Што-ж хвальбы ілжывай зык? —
Рады Ён, калі хто мае
Чыста сэрца — не язык!
Дух мой, слаў і г. д. —

4. Я, Хрысьце мой, даражэнькі,
Знаю, чым свой доўг сплачу —
Аддаюсь Табе я ўсенькі,
Быць слугой Тваім хачу!
Дух мой, слаў і г. д. —

5. Дзякаваць інакш ня ўмею —
Гэта мой найбольшы дар:
Міласьць, веру і спадзею
Дам Хрысту — ад сэрца жар! —
Дух мой, слаў і г. д. —

## 42. ДЛЯ ДУШ ЛЮДЗКІХ.

1. Для душ людзкіх ёсьць лекар — сам:
Ісус *) Хрыстóс, Сын Божы!
Ваду жыцьця дае́ Ён нам
І лечыць ўсіх: Сын Божы.
(Прыпеў:) Цудоўнай песьняй разнясло́сь,
Што адпушчае грэх і злосьць,
Мне душы збаўленьнем ёсьць —
Сам Хрысто́с, Сын Божы!

2. Грахоў сплаціў спрадвечны доўг
Мучэньнямі — Сын Божы,
Праліў за нас сваю кроў Бог
І ўмёр за нас Сын Божы!
Цудоўнай песьняй і г. д. —

3. Сваім жыцьцём нам паказаў:
Як трэба жыць — Сын Божы,
Спадзею да Хвалы нам даў
Ісус *) Хрысто́с, Сын Божы!
Цудоўнай песьняй і г. д. —

4. А як жыцьця канец прыдзе́,
Руку мне дасьць Сын Божы, —
І ў Бацькаў дом мяне́ ўвядзе́
Ісус *) Хрысто́с, Сын Божы!
Цудоўнай песьняй і г. д. —

5. Дык ад душы давайма чэсьць,
Хай ў нас жыве́ Сын Божы!
Хай радасьці нясецца весьць,
Што з намі ёсьць Сын Божы! —
Цудоўнай песьняй і г. д. —

---

*) Ісус па грэцку, Ѐзус па лаціні, а зьбеларушчыць, дык будзе Язус.

## 43. ХАЧУ СЬПЯВАЦЬ Я.

1. Хачу спяваць я аб Ісусе *) —
За міласьць, літасьць к‘нам Яго,
І ўспамінаць аб цяжкіх муках,
Што не бярог жыцьця свайго.

(Прыпеў:) Выслаўляйце сёньня Ісуса, *)
Міласьць і літасьць к‘нам Яго,
І ўспамінайце цяжкую муку —
Ён не бярог жыцьця Свайго!

2. Аб дарагім для нас Ісусе *)
Пахвальны гімн ляціць і весьць:
Навекі змыў грахі Ён нашы —
Яму даем з падзякай чэсьць!
Выслаўляйце і г. д. —

3. За тое Спаса палюбіў я:
Жыцьцё нанова Ён мне даў —
Хачу Яго расславіць Імя,
Бо я цяпер шчасьлівы стаў!
Выслаўляйце і г. д. —

4. Дык разам сёньня засьпяваем
Наш гімн Хрысту на вечны час,
За то, што збавіў нас навекі,
За то, што зьнішчыў цемру ў нас!
Выслаўляйце і г. д. —

*) Грэцкае: Ісус — лацінскае: Ѐзус, (Jezus) а па беларуску будзе: Язус.

## 44. ЗА ХРЫСТО́М ЦЭЛЫ СЬВЕТ!

1. Прыняў сабе крыжову сьмерць
У вяку: трыццаць трох лет —
За то Хрысту злажэце чэсьць!
(Прыпеў:) Хай з верай шчыра по́йдзе—ў сьлед
За ім цэлы сьвет! —

2. Людзям служыў, усіх любіў:
Дзяцей, мужчын, кабет —
Ён найбяднейшых бра́там быў!
Хай з верай шчыра по́йдзе і г. д.—

3. З паганай злыдніцкай рукі
Сьмяротных ран меў сьлед —
І ў галаве вянка́ сукі. —
Хай з верай шчыра пойдзе і г. д.—

4. Ён быў аплёван ад людзёў
Ліхіх, на сьмерць разьдзет —
Сярод двох ло́дараў вісеў...
Хай з верай шчыра пойдзе і г. д.—

5. Знай, грэшны, што Хрыстова кроў
Грахоў змывае сьлед, —
Дык кайся! жыць лепш будзь гатоў! —
Хай з верай шчыра пойдзе і г. д.—

6. „І будуць ўнукі панаваць,
Дзе сёньня плача дзед“ —
Хрыста як стануць шанаваць!—
Хай з верай шчыра пойдзе і г. д.—

7. Хрысту складайма ўсе да ног
З душы і сэрца цьвет, —
Бо Сына нам прыслаў Сам Бог! —
Хай з верай шчыра пойдзе і г. д.—

## 45. АД ЗОРКІ РАНЬНЯЕ.

1. Ад зоркі раньняе
Мне сэрца ўсё пяе:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“
Хай будуць шчырыя
ў нас словы гэтыя:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“

2. Званоў ад ранку тон
Нясе з усіх старон:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“
Ідзе да нашых стрэх
Вялікім лікам рэх:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“

3. Пяе так сонца сьвет,
Зямля ўся і сусьвет:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“
І шумам мора хваль
Нясецца песьня ў даль:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“

4. І песьні хай маёй
Грыміць тон шчыры той:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“
Хай кліч зьвініць як сьпіж, *)
Душу падносе ўвыш:
„Чэсьць Хрысту-Богу, чэсьць!“

Амэн.

*) Цьвёрды мэтал, — бронза.

## 46. БОЖА, СЛАВІМ МЫ ЦЯБЕ.

1. Божа, славім мы Цябе
І хвалу Табе падносім,
Вечны гімн пяём Табе —
Славу вечную прыносім,
Пакланіўшысь прад Табой,
Просім сэрцам і душой.

2. Душы збаўленых сьвятых,
Войскі а́нялаў нябесных
Славяць до́брасьць ласк Тваіх
Для нягодных нас і грэшных,
Славяць Бога сваяго́:
ў Тройцы разам Аднаго́.—

3. Вера на зямлі Твая
Імя Спаса выслаўляе,
Сёньня крэпка веру я,
Што міне пара ліхая —
Хутка ўбачым Твой Аблік,
Як ты Добры і Вялік!

4. Ты магутны вечны Бог
На Сябе прыняў мучэньні,
А нас грэшных усьцярог
Ад страшэннага цярпеньня.
Слаўся, слаўся Божы Сын
Што нас вызваліў ад він!

5. Слава Тройцы ва ўвесь век,
Дух сьвяты, Ацец нябесны!
Сын і Богачалавек,
Нарадзіўшыся для грэшных!
Каб ўсе славілі Яго
Імя Бога сваяго́!

## 47. САМ ХРЫСТОС ПРЫЙШОЎ.

1. Сам Хрыстос прыйшоў спасьці нас,
Го́спаду чэсьць!
Ён прыйшоў ў спакой вясьці нас,
Го́спаду чэсьць!
Вам нічога зло ня зробіць,
Як наступіць ласка Бога
Дый ачысьціць вас ад злога —
Го́спаду чэсьць!

2. Людцаў сіла не паможа,
Го́спаду чэсьць!
Го́спад толькі грэх зьніштожа
Госпаду чэсьць!
І з мянѐ Ён путы зьніме,
Даў жыцьця мне сілу нову,
Супакой, душу здарову —
Госпаду чэсьць!

3. Неба ўсім Хрысто́м адкрыта,
Госпаду чэсьць!
Перамога песпажыта,
Госпаду чэсьць!
Нам ў граху ня трэба жыці.
Дык кажэце ўсюды, людзі:
„Хто захоча, збаўлен будзе!“
Госпаду чэсьць! —

## 48 ЛЮБОЎ, ДАЙ СОНЦА СЬВЕТ!

1. Любоў! Ты дай мне сонца сьвет —
Што ў сэрца аж глядзіць!
Праменьням буду я загрэт —
Дык сум мой адляціць.
Спалохай сьветлам цёмну ноч,
Спавіту ў чорны цень, —

А сьлёзы згоніць — хоч-ня-хоч —
Вясельля ясны дзень!
(Прыпеў:) Любоў! Ты так даўно цьвіцеш —
Аднак для нас твой новы пах!
Цяпло́ сваё ты нам нясеш
Ў жыцьця цяжкі гаротны шлях!

2. Як з крыжа ясны сьвет весь той
У ноч душы папаў, —
Дык сон граховы цьвёрды мой,
Як бач, кудысь прагнаў.
Хто любіць, знаю ўжо, мяне́ —
Глыбока, да-душы:
Спасіцель ў сэрцы ўжо жыве
Да гробнае цішы!
Любоў! Ты так даўно і г. д. —

3. Паміж жыцьцёвых перамен —
Тым со́нейкам ў зіме́
Ёсьць той Збавіцеля прамень
Хрыстовы у мяне́!
Жыву цяпер я толькі Ім —
І песьняю хвалю,
Ня чую сьцюжы лютых зім,
Калі Хрыста малю!
Любоў! Ты так даўно і г. д. —

## 49. СЬВЯТЫ ДУХ БОЖЫ.

1. Сьвяты Дух Божы, к'нам ляці
І душы мудрасьцяй пацеш,
Каб знялі ўжо, як ім ісьці,
Ты грэшным мудру ласку шлеш.

2. Ты Пацяшыцель для людзей,
Найвышшага Ты Бога дар,
Праўдзіву мудрасьць нам навей,
Ты Дух жыцьця, любові жар!

3. Сямёх Ты ласкаў даўца ёсьць,
Ты палец Божае рукі,
Ты абяцаны Богам госьць,
Багаціш мовай ўсе куткі!

4. Дык, Божы Дусе, к'нам прыдзі
Напоўні Божай мовай нас,
У нашых душах кут знайдзі —
І будзь у ім праз вечны час! —

## 50. КАЛІ ГЛЯДЖУ НА БОЖЫ КРЫЖ.

1. Калі гляджу на Божы Крыж,
На чым сканаў Ісус *) Хрыстóс,
То сьветам пагарджаю я,
І жаль бярэ мяне да сьлёз!

2. А Божа! гордасьць Ты у нас
Сатры на пыл праз сьмерць Хрыста,
Хай ўсё, чым пышны гэты сьвет,
Яго кроў змые да-чыста!

3. О, на крыжу крывавым тым,
З любовяю злучыўся боль, —
Карону лепшу чым Яго, —
Ці меў калі які кароль?

4. Ах, што-ж Табе, Хрысьце, я дам?
Ці-ж доўг увесь Табе сплачу?
За ўсё, што Ты даруеш нам, —
Сябе самога даць хачу! —

5. За гэты боль Твой, зьдзек і кроў,
За міласьць гэту доўг аддам,
Душу і труд жыцьця і — ўсё,
Чым я багат, Табе я дам! —

---

*) Ісус па грэцку, а Êзус па лаціні, а зьбеларушчыць — будзе: Язус.

## 51. ТЫ СЬВЕТАЧ МОЙ!

1. Ты сьветач мой, праменьні зіхацяць, —
Вядзі мяне!
Тут цёмна ноч і пяруны грымяць,
Вядзі мяне!
Кіруй ступой і вочы прыцірай,
Каб ня згубіў мяне ліхі адча́й!

2. Быў незаўсёды Твой я, не хацеў,
Каб вёў мяне!
Але цяпер, як страшна ноч ідзе
Вядзі мяне!
Хаця ня раз шоў сам, праз грэх і блуд,
А выбач Ты, ня каяўся я тут...

3. Пакуль сваім цудоўным бліскам Ты
Вядзеш мяне,
Праз громы бур, праз страх і ноч, імглы —
Пайду сабе, —
Мяне́, вясёлкай прывітае сьвіт,
Калі ўвайду я на нябесны шчыт.

А м э н.

---

## 52 ЯК ЁСЬЦЬ, ІДУ!

1. Як ёсьць, іду зусім я так
Пад Твой сьвяты крыжовы знак,
Я бедны, і красы мне брак —
ўжо так іду, о Божа мой!

2. Як ёсьць, іду, благога шмат
ўва мне — дабра́ ўсё недахват,
Ты дай сваёй мне ласкі ўзгляд —
ўжо так іду, о Божа мой!

3. Як ёсьць, іду, мой жар ня стух,
Хоць чыстата̀ разьбіта ў пух,
А чую Божай ласкі дух —
ўжо так іду, о Божа мой!

4. Як ёсьць, хачу к Табе прысьці, —
Ты дух і сэрца ачысьці,
Каб мог я, крыж Твой панясьці!
Ах, памажы, о, Божа мой! —

5. Як ёсьць, іду ўжо, Спасе мой!
Любоўю надары сваёй,
Каб я на векі ўжо быў Твой —
О, Сыну Божы, ўжо іду! —

---

## 53 БОЖА МІЛЫ, БОЖА ЦУДАЎ.

1. Божа мілы, Божа цудаў,
ўсемагутны Ойча наш,
Ты для, ўсіх нас, грэшных людцаў,
Дабрату Сваю пакаж!
Ты што знаеш наша сэрца:
Калатня там, як кірмаш, —
Для Цябе яно́ хай б'ецца,
ўсемагутны Ойча наш!

2. Міласьцівы пакаяным,
ўсемагутны Ойча наш!
Літасьцівы будзь паганым,
Ці ў пагібель іх аддаш?
Мы так грэшны, так праступны —
На пакуту час нам даш —
Ня будзь, Божа, няпрыступны,
ўсемагутны Ойча наш!

3. Праз Хрыстовую навуку,
ўсемагутны Ойча наш,
Праз Яго крыжову муку,
Як спасьціся нам, пакаж!
Успакой Ты нам сумленьне,
Бо ў нас ра́дасьці нямаш —
Чуеш нашае маленьне,
ўсемагутны Ойча наш! —

## 54. ВЯЛІКІ БОЖА!

1. Вялікі Божа, Ты судзі
Тут нас па літасьці Сваёй,
На добру лаву пасадзі,
З Айцоўскай ласкай к‘нам прыдзі,
Прысуд дай добры Свой!

2. Сваю нам Ласку дай пазнаць,
Як справядлівы наш Судзьдзя,
Віны нам просім дараваць,
Каб мы маглі свой плач стрымаць,
На новы шлях жыцьця!

3. Патопу хваляй змыты сьвет
Зрадзіла воля зноў Твая —
Цярпеньнем з нас віны змый сьлед,
Але жыцьця хай буйны цьвет
Твая зноў дасьць рука!

4. Ты справядлівы у-ва ўсём,
За срога ня судзі людзей —
Няхай мінé нас кары гром,
Прыймі ў свой Айцоўскі дом,
К‘пакутным міласьць мей! —

Амэн.

## 55. ТЫ СКАЛА!

1. Ты Скалá, іду к'Табе
Ты мянé прымі к'Сабе,
Хай вада і кроў Твая,
Што калісь із ран плыла,
Так абмые сэрца мне,
Каб ня быў я ў пекла дне!
(Прыпеў): (: Ты Скалá, іду к'Табе,
Ты мяне прымі к'Сабе :)

2. Хоць-бы сьлёз ручэй праліў,
Праз весь час — дакуль-бы жыў,
А грахоў мне не пазбыць —
Ты іх толькі можам змыць!
Мне на выкуп не стаé, —
Крыж Твой збавіцца даé!
(: Ты Скала і г. д. :)

3. Дык хоць колькі буду жыць,
Як пакіне сэрца біць, —
А у вечнасьці парог
Перайду, каб стаць ля ног
Божых. — Ты, Скалá, схавай
І ў Сабе прыпынак дай!
(: Ты Скала і г. д. :)

Амэн.

---

## 56. ГРЭШНЫ МЫ.

1. Грэшны мы і жыць ня знаем, — Ойча наш,
З гэтай цемры прызываем,—Ойча наш!
(: Зорку ясну дай парою,
З плям, з крыві абмый расою,
Хай ляцім у выш душою - Ойча наш :)

2. Пад Твой крыж мы ўпадàем — О Хрысьце!
Пóмачы Тваёй жадаем—О Хрысьце!

(: Бо-ж з Тваёй збаўленьне Волі,
Вывядзі нас з горкай долі,
Каб мы выйшлі із няволі — О Хрысьце :)

3. Для душы Цябе нам трэба — Дух Сьвяты!
Ты пачуй нас грэшных з неба – Дух Сьвяты!
(: Лучнасьць з намі хай настане,
Камень сэрца хай растане,
Вызваль нас ад катаваньня — Дух Сьвяты! :)

4. Міласэрна будзь нам грэшным—О Тройца!
Хай жыцьцё сваё палепшым — О Тройца!
(: Дай нам новы быт пачаці,
ў новае жыцьцё ўступаці,
Каб рай быў у нашай хаце — О Тройца! :)

---

## 57. НЯ КІНЬ МЯНЕ!

1. Ня кінь мяне, бо я Табе́ малюся,
Ты мой Ацец, што прабывае ў небе!
Не аднімай мне помачы ў патрэбе,
Ня кінь мяне, ня кінь мяне!

2. Ня кінь мяне, калі ў грахох таплюся,
Калі з адчаю льюцца горкі сьлёзы —
Твая далонь хай збавіць ад пагрозы, —
Ня кінь мяне, ня кінь мяне!

3. Ня кінь мяне, як ў слабасьці сагнуся,
Як тухне дух, спадзея ўжо малая, —
А будзь пры мне, як вера заслабая —
Ня кінь мяне, ня кінь мяне!

4. Ня кінь мяне, як ў гробе палажуся,
Калі прыйдзе маёй часіна сьмерці —
Недапусьці бяз веры мне памерці —
Ня кінь мяне, ня кінь мяне!

---

## 58. ВЯРНІСЬ ХУТЧЭЙ К' АЙЦУ!

1. Вярнісь хутчэй к'Айцу, вярнісь —
Валóчышся ўжо шмат,
Ад сьвету сэрцам адвярнісь,
Скінь бруд, а будзеш рад!
К' Айцу вярнісь!

2. К'Айцу вярнісь, ты поўны сьлёз,
А Ён зьлітуецца,
І выбачыць Уладар нябёс —
Грахі даруюцца. —
К' Айцу вярнісь!

3. Вярнісь, Яму ты сэрца дай
І з Ім душу зьвяжы,
Бо пры Айцу ты знойдзеш рай,
Спакой тваёй душы.
К' Айцу вярнісь! —

4. Вярнісь, вярнісь к'Айцу хутчэй
Цягаешся за-шмат
Адходзь ад блуду найдалѐй, —
Вярнісь, а будзеш рад!
Хутчэй вярнісь!

---

## 59. ТЫ НАС КЛІЧАШ, МІЛЫ БОЖА!

1. Ты нас клічаш, мілы Божа, —
ў жыцьця бурнай старанé,
Чуем часта кліч прыгожы:
„Прыхадзеце да мяне!“ —

2. Ты нас клічаш, як ярмó нас
Залатых гор заманé:
Хай ня маняць ўжо дарма вас —
„Прыхадзеце да мяне!“ —

3. Як адчай, ці радасьць гляне
ў бліску зор, ці ў ночы цьме, —
Голас Твой чутны нам стане:
„Прыхадзеце да мяне!“ —

4. Кліч нас, кліч нас, Мілы Божа,
Каб прышлі мы да Цябе,—
Жыць лягчэй у бездарожжы
Як паслушны мы Табе!

Амэн.

---

## 60 а) ЯК ЦЯЖКІХ ВІН ЦЯЖАР.

1. Як цяжкіх він цяжар прыгне,
Да Госпада зьвярнісь,
Бо грэшным ласку Ён дае —
Да Бога навярнісь!

(Прыпеў:)
Вер, надзейся, вер, надзейся, і спадзею мей,—
Госпад збавіць, Госпад збавіць ласкаю сваей!

2. Свайго́ жыцьця не шкадаваў
І ў гробе Го́спад лёг,
Каб ты з Яго ратунак знаў,
Каб ты быць чыстым мог!
Вер, надзейся і г. д. —

3. Ён шляхам ёсьць да тых варот,
Дзе вечна можаш жыць —
Цябе да ціхіх кліча вод —
З крыніцы шчасьця піць!
Вер, надзейся і г. д. —

4. Бо збавіцца ня ў сіле сам —
Руку вазьмі Хрыста!
Хрыстос і павядзе нас там —
Дзе неба ёсьць краса! —
Вер, надзейся і г. д. — Амэн.

---

## 60. б) КАЛІ ВІНА ЦЯБЕ ГНЯЦЕ.

1. Калі віна цябе гняце,
Зьвярніся да Хрыста,
Сваю Ён ласку грэшным шле
І міласьць без канца!
(Прыпеў): Здайся Богу, здайся Богу, —
З верай будзь сьвятой!
Госпад збавіць сьвет убогі
Ласкаю сваёй!

2. Сваё жыцьцё ахвяраваў —
За грэшных ў гробе лёг,
Каб ты збаўленьне атрымаў
І жыць ўжо вечна мог!
Здайся Богу і г. д.

3. Хрыстос — дарога, шлях у край,
Дзе вечна можаш жыць,
Цябе ў той сьветлы кліча рай
З крыніцы шчасьце піць!
Здайся Богу і г. д.

4 Ты збавіцца ня можаш сам —
Хрысту руку падай,
Ён завядзе цябе ўжо там,
Дзе ёсьць запраўдны рай!
Здайся Богу і г. д    Амэн.

---

## 61. ДЗЕЙНЫМ БУДЗЬ!

1. Дзейным будзь, бо ноч прыдзе; —
Хрыстовай грамадой
Ранкам пайдзè работа
Гараньнем і сяўбой!
Вось сонейка загляне
З пад ночнай цемнаты;
Дзейным будзь, бо днець стане:
Каб не спазьніўся ты! —

2. Дзейным будзь, бо ўжо палудзень
К‘нам прыбліжаецца —
Хай-жа за Божую славу
ўсякі змагаецца!
Дзейным будзь, серад буры,
Хворых і беднаты,
Дзейным будзь, як ноч прыдзе
Каб не спазніўся ты! —

3. Дзейным будзь, бо ноч прыдзе —
Сонца зьніжаецца,
Той дачакаецца жніва,
Хто пастараецца —
Дык аж да самае сьмерці
Бійся з ярмом цемнаты;
Дзейным будзь, бо ноч прыдзе,
Позна ўжо будзе тагды!.

---

## 62. ТЫ ДЗІЦЯ ЖУРБЫ.

(Імя Хрыста вазьмі.)

1. Ты дзіця журбы, адчаю —
Ты Імя Хрыста вазьмі,
Сэрца радасьць стуль пазнае, —
Сьцяг спадзеі паднімі!

(Прыпеў:) (: Міла ёсьць нам Яно́,
Праз Яго пагіне зло. :)

2. Імя гэта дух твой з целам
Абароніць у баю,
З Ім у бітве будзеш сьмела
Ты змагаць віну сваю. —
(: Міла ёсьць і г. д. — :)

3. О бязцэнна Імя гэта,
Як брылянт для ўсіх людзей,
Зіхаціць зімой і летам,
ўночы, ў буры з Ім цішэй. —
(: Міла ёсьць і г. д. — :)

4. На сьвятое Імя гэта
Голаў клоніць цэлы сьвет,
Імя гэта ўсюды будзіць
Пачуцьцёў цудоўны цьвет. —
(: Міла ёсьць і г. д. — :)

---

## 63 К СЬВЯТЛУ ІДЗІ!

1. К сьвятлу ідзі, бо там твой, шлях —
Слабых-жа — ночы цень!
Каб ты пазнаў ў жыцьцёвых днях
Той сьветлы Божы дзень!

2. К'сьвятлу ідзі, а ўбачыш там
ў цішы сьвяты агонь, —
Дзе супакой адчуеш сам —
Хрыстовую далонь!

3. К сьвятлу ідзі, нямаш вось там
Няпраўды, блуду, бед,
І звольніцца ад грэху плям, —
Ідзе хто Богу ўсьлед!

4. К сьвятлу ідзі, па шляху тым,
Што сьвеціць з кроўі, сьлёз,
Кіруйся за крыжом сьвятым,
Які з сабой прынёс. —

5. Дык сьмела ўсьцяж к'сьвятлу ідзі,
Туды кіруй пагляд
Дзе сонца праўды зіхаціць,
Дзе гіне цемры чад! — Амэн.

---

## 64. СТАНЬ ПАД КРЫЖАМ.

1. Стань пад крыжам у нядолі,
I з блудных дарог
Вывядзе цябе ня волю
Госпад Бог!

2. Там злажы свае ўсе мукі —
Блуд свой там пакінь,
Там цябе вазьмѐ пад рукі
Божы Сын!

3. Там пад крыжам ёсьць збаўленьне —
Ласкі Божай дар:
Там душа вазьмѐ праменьне —
Шчасьця жар.

4. Простую даé дарогу —
Гэты Божы крыж,
Праз Яго пайдзѐш ты к Богу,
Толькі ўзвыш!

5. Крыж табе — твой шлях жыцьцёвы
ў гэтым сьвецi злым,
Стаць пад крыжам будзь гатовы
Сіла ў Ім! —

---

## 65. а) ХРЫСТОС ІДЗЕ.

1. Хрыстос Збавіцель ідзе да нас,
Спаткайце людзі, ўставайце ўраз,
На кожным месцы і ў кожны час
Чуйце: Хрыстос ідзе!

(Прыпеў) Бога чуе наша верна страж,
ўсю малітву прыймі, Божа наш,
Ты дабрату сваю нам пакаж, —
ўсіх нас зьбяры ў адно!

2. Хрыстос Збавіцель ідзе сюды,
I абароніць нас ад бяды,
Пабагаславіць нашы труды —
Чуйце: Хрыстос ідзе!
Бога чуе наша і г. д.

3. Хрыстос ідзе зноў, дружына слыш!
Вочы свае паднімем увыш,
Збудзіся грэшны ўсякі, што сьпіш —
Чуй, бо Хрыстос ідзе!
Бога чуе наша і г. д.

---

## 66. б) ІДЗІ К' ХРЫСТУ.

1. Ісьці к' Хрысту прышоў сёньня час!
Чуй голас Божы — Ён кліча нас —
Сэрца як камень ня будзе ў вас,
Кліч Божы мілы нам:
(Прыпеў): ўбачым від нябесны, як-бы цуд,
Як адкінем ўсе грахі і блуд
Станем прад Богам, на Божы суд.
Божа Хрысьце, іду!

2. Ідзі, дзіцятка, ідзі хутчэй!
Сэрца Хрысту аднясі ты барждждэй,
ў сэрцы Хрыста схавай ты ляпей,
Дацца душой бяжы!
ўбачым від і г. д.

3. Вер у Хрыста! паслухай і бач:
Ён зьніштажае гора і плач! —
Новым жыцьцём сябе перайнач,
Ідзі к' Хрысту, ідзі!
ўбачым від і г. д.

---

## 67. СІЛА ЁСЬЦЬ—КРОЎ ХРЫСТА.

1. Хочаш граховы пракляцьці пазбыць?
Сіла ёсьць—кроў Хрыста, ёсьць кроў Хрыста!
Ідзі к‘ Хрысту, каб спакойна мог жыць,—
Супакой у Хрыстовай крыві!
(Прыпеў): Сіла ёсьць—ёсьць і магутнасьць ёсьць —
Кроў Хрыста, кроў Хрыста;
Сіла ёсьць—ёсьць і пабеда ёсьць
У сьвятой Хрыстовай крыві!

2. Хочаш грахі свайго цела пазбыць?
Сіла ёсьць кроў Хрыста, ёсьць кроў Хрыста!
Сьвятая Хрыстова кроў грэх можа змыць
Грэх абдужаеш ты з той крыві!
Сіла ёсьць і г. д.

3. Хочаш ты болей быць белым, чым сьнег?
Сіла ёсьць—кроў Хрыста, ёсьць кроў Хрыста.
Змые ад сэрца збалелага грэх,
Ачышчэньне ў Хрыстовай крыві!
Сіла ёсьць і г. д.

4. Хочаш з Хрыстом той дарогай ісьці?
Сіла ёсьць—кроў Хрыста, ёсьць кроў Хрыста!
Хочаш Хрыстовую сьвятасьць нясьці?
Кожны дзень сільны ты з той крыві!
Сіла ёсьць і г. д.

---

## 68. СТАНЬ, БРАЦЕ МІЛЫ!

1. Стань, браце мілы, стань — куды сьпяшаешся?
Ці гібель бачыш ты, ці гніць зьбіраешся?
Хутчэй зыдзі, хутчэй зыдзі з блудных дарог!
(Прыпеў): Нявярнісь, глянь: цябе
Заве Хрыстос — сам Бог!

2. Стань, браце мілы, стань — і супыні свой бег!
Бач: зводзіць сьвету блуд, што цягне да пацех —
Так вораг цягне, прэ: ён шмат каго ўжо змог,
Навярніcь, глянь цябе і г. д. —

3. Стань браце мілы, стань пакуль ня ўпаў да дна,
Глянь: гэта сам Хрыстос цябе сьцярог ад зла!
Ён руку падае — вядзе на свой парог,
Навярніcь, глянь цябе і г. д. —

4. Стань, браце мілы, стань—пачуй і сьцеражысь:
Калі адкінеш кліч — пайдзёш на дно — уніз !
Адкінь сьмяротны блуд,—Хрыстос цябе сьцярог,
Навярніcь, глянь цябе
Заве Хрыстос — сам Бог!

---

## 69 „Я (Хрыстос) НА КРЫЖУ ВІСЕЎ“.

1. „Я на крыжу вісеў,
Ліў кроў з ран ног і рук,
Бо вырваць захацеў
Цябе я з ліха мук. —
Ня шкадаваў сябе,
А ты? Што даў ты мне?“

2. „Як быў я на зямлі
Я сам убогім жыў
Боль, кроў мая далі, —
Каб ты у небе быў!
Я так любіў цябе,
А любіш ты мяне?“

3. „Прышоў на сьмерць я з выш,
І за цябе ліў кроў,
Каб панясьці твой крыж,
Абмыць цябе з грахоў; —
Твой грэх мяне забіў,
А што-ж ты мне зрабіў?“

4. „Табе збаўленьне даў,
Разьвеяў цёмну ноч,
Каб ты шчасьлівым стаў,
Прагнаў я ліха проч.
Ўсё гэта даў табе,
А ты? Што даў ты мне?“

---

## 70 НА ШТО, ЧАГО ЎЗДЫХАЕШ?

1. Нашто, чаго́ ўздыхаеш так,
Чаму плыве шмат сьлёз з бяды?
Глянь — гэта вось збаўленьня знак:
Хрыстос цярпеў шмат больш чым ты!
(Прыпеў): Цярплівым будзь, кіруйся ўзвыш,
І без жальбы нясі свой крыж;
Ён не жалеў сваёй крыві,
Ты-ж Божу ласку прызаві.

2. Ты да Яго зьвярні свой шлях,
Бо, хоць зусюль ідзе напасьць,
Хоць човен твой абніме жах —
Табе Хрыстос збаўленьне дасьць!
Цярплівым будзь і г. д.

3. Ён помач нам усім дае,
Хто шчыра верыць у Яго,
Цярпеньні ведае Твае —
Дык кліч, прасі — чакаць чаго?
Цярплівым будзь і г. д.

4. Калі душа ў цябе баліць —
Ён чуе, бачыць ўсё ўдалі
Ды хоча боль твой супыніць,
Дык ты Яго крыж прытулі!
Цярплівым будзь і г. д.

5. Кінь жаль і сум, а крыж дзяржы,
Бо сам Хрыстос каля цябе, —
Яму пад ногі ўсё злажы,
А ласкі знак прыдзé табе!
Цярплівым будзь і г. д.

---

## 71. ПРАЗ КАЛЮЧЫ ЦЕРНІ.

1. Праз калючы церні
Дзе сьпяшыш удаль?
Глянь, вось шлях твой верны:
Сум, туга і жаль!
Бог цябе шкадуе,
З Богам стой, ня гінь,
Лечыць Ён, ратуе,
Блудны шлях пакінь!
(Прыпеў):
Бог тваім Айцом ёсьць, ведама-ж табе,
Ты Яму даверся, не зьвядзе цябе!

2. Праз маланкі шоў ты,
Буры спатыкаў,
І палын знайшоў, дзе
Красак ты шукаў.
З мукаў і цярпеньняў
Ты ня меў дабрá —
Попял, сажы жменя
Ды адна манá!
Бог тваім Айцом і г. д. —

3. Усю жыцьця дарогу
Крые ночы цень,
І ніскуль падмогі —
Гэтак кожны дзень...
Хвору душу круціць,
Поўна сьлёз тады,
Сэрца цісьне, мучыць —
Ці-ж шчасьлівы ты?
Бог тваім Айцом і г. д. —

4. Хай душа ня енчыць —
Прыдзе хутка час,
Бог табе пашэньціць,
Шлях вядзе якраз!
Кінь у паняверцы
Мець канчатак дзён,
Чуй Хрыста у сэрцы —
Радасьць до́рыць Ён! —
Бог тваім Айцом і г. д. —

---

## 72. ЦІ ЗЬБЯРЭМСЯ ЛЯ КРЫНІЦЫ?

1. Ці зьбярэмся ля крыніцы —
Там, дзе вечнай волі край?
Ці ня хочаш той зямліцы,
Дзе цьвіце шчасьлівы рай?

Там ўсе рады — сьлёз ня знаюць,
Песьні для жыцьця грымяць,
Добрых там абараняюць —
Хочаш, каб цябе прыняць?

(Прыпеў): Добра, буду ля крыніцы,
Ля жыцьця крыштальных вод,
Каб там раны загаіці,
Божы каб спаткаць народ!

2. Ці зьбярэмся ля крыніцы,
Дзе цудоўны лірaў тон?
Там—ў Хрыстовай у сьвятліцы
Нас абніме Божы звон!

Там у шатах з зор блішчачых
Будзем шчасна пражываць!
У салодкіх і гарачых
Песьнях, скоках прабываць?
Добра, буду ля крыніцы і г. д.

3. Ці зьбярэмся ля крыніцы —
Як увойдзём ў Бацькаў дом?
Ці найдзём цябе ў цямніцы —
Дый пад горкіх сьлёз ярмом?

Шчасьце По́лымем Агнёвым
Там няшчасным зіхаціць,
Доля ў лоньні у Хрыстовым!
Ці і ты ў ім хочаш жыць?
Добра, буду ля крыніцы і г. д.

## 73. ЗОРКА З НЕБА.

1. Зорка з неба, ясна зорка,
Асьвяці мяне!
Без цябе на сьвеце горка,
Сохну без цябе...
Як тваё праменьне блісьне —
Адыходзіць жаль,
І за сэрца боль ня цісьне —
Адлятае ў даль. —

2. Доўга, доўга я цягнуўся
Сьледам блудных зор,
З грэху сьцежкі навярнуўся
Злу наперакор,
Я у вечную дарогу
Шоўшы грэшна сьніў,
А цяпер я, дзяку Богу,
На́нава ажыў!..

3. Дзяку Богу, што пакінуў
Нэндзу я сваю

І з душы і з цела скінуў
Цень няшчасную,
Бо сваёй Ты, Божа, кроўю
Адкупіў мяне,
Яснай зоркаю — любоўю
Прыцягнуў к'Сабе!

4. Зорка з неба, зорка ясна
Сьвеціць, быццам сьцяг;
І жыцьця дарога шчасна —
Гэта — ў неба шлях;
Радасьць сьвеціць мне у сэрцы
Зоркай з неба — з выш,
Каб ў нядолі, ў паняверцы
Мог нясьці свой крыж...

## 74. МОЙ БОЖА!

1. Мой Божа! у Тваіх руках жыцьцё маё,
З ахвотай шчырай аддаю душу і цела—усё! —
2. Мой Божа, у Цябе і доля ўся мая;
Іду туды, куды вядзе дарóжанька Твая! —
3. Мой Божа, у Тваім жаданьні сіла ўся —
Як ты захочаш — пад Тваёй апекай буду я!
4. Мой Божа, у Тваіх руках гарыць агонь,
Хай пакіруе мной Твая прабітая далонь! —
5. Мой Божа, у Тваёй далоні цэлы час,
А як жыцьцё тут скончыцца—прымі к'Сабе і нас!
6. Мой Божа, у Цябе усё дабрò маё —
І ўсё, што людзі маюць тут,—ўсё чыста ёсьцьТваё!
7. Мой Божа, ўсё Тваё: і сонца, і сусьвет,—
Зямля і мы і цэлы час аж без канчатку лет.

## 75. НЕ БАЮСЯ БОЛЕЙ—Я НІКОЛІ НЯ САМ.

1. Не баюся болей, Госпад Бог са мной!
Сьветам Ён і волей, я-ж слабы душой!
Сонца абяцаньня сьвецiць мне з нябёс —
Божае каханьне нам Ён на зямлю прынёс! —
(Прыпеў): Я ніколі ня сам, ніколі ня сам!
Госпад Бог абяцаў мне: „Ніколі ня будзеш сам“!

2. Кветка ўсяка згіне — страціць пах яна;
Сонца як астыне, — скончыцца цэла зямля.
Хрыстос—наша сонца: з неба сьвеціць нам —
ў сэрца у ваконца, дык я ніколі ня сам!
Я ніколі ня сам і г. д.

3. Хоць ў дарогах цёмных вораг гнаў мяне —
Чую — Бог бароніць нас у яве й сьне:
ўзвыш зьвярну я вочы: Бога ўбачу там —
Дзякаваць захочу, што я ніколі ня сам! —
Я ніколі ня сам і г. д.

---

## 76. НЯ МІНАЙ МЯНЕ, МОЙ СПАСЕ!

1. Ня мінай мяне, мой Спасе —
Госпадзе Хрысьце!
Ласкай многіх надарыў Ты, —
Ня мінай мяне!
(Прыпеў): Спасе, Спасе! Я малю Цябе —
Ласкай многіх надарыў Ты, —
Ня мінай мяне!

2. Дабраты Тваёй жадаю —
Дух ляціць к'Табе;
Я прашу, малю, чакаю —
Барані мяне!
Спасе, Спасе! Я малю Цябе —
Дабраты Тваёй жадаю —
Барані мяне!

3. Я ў Табе надзею маю:
Ласкі жду Тваей, —
Ты пацешыш змучанага,
Сэрцу даш спакой!
Спасе, Спасе! Я жыву Табой!
Ты пацешыш змучанага,
Сэрцу даш спакой!

4. Ты ручэй маей пацехі,
Ты жыцьцё маё.
Я Цябе хачу тут меці, —
Што маё — Тваё!
Спасе, Спасе! Ты жыцьцё маё!
Я Цябе хачу тут меці, —
Што маё — Тваё!

## 77. ВЕРЫЦЬ МЯНЕ ВУЧЫ!

1. Верыць мяне вучы, прасіць вучы,
Як дзіцянё сваё, Божа, вучы!
Няхай на сэрца дне
Любоў гарыць ў-ва мне,
Каб жыць ўжо для Цябе,
Прасіць вучы!

2. Верыць мяне вучы, прасіць вучы!
Сьвет Праўды, Божа мой, прасіць вучы!
Дух Мудрасьці ссылай
І добру волю дай,
А цемру разганяй, —
Прасіць вучы!

3. Верыць мяне вучы, прасіць вучы!
Каб дух мой сільны быў, прасіць вучы!
Слабасьць мне вылечы,
Ўзмацуй у нèмачы,
Дай зло ў-ва мне змагчы, —
Прасіць вучы!

4. Верыць мяне вучы, прасіць вучы!
Ты, Міласэрны Бог, прасіць вучы!
Ты, Божа, асудзі —
Паводле літасьці,
Прысуд дай з міласьці, —
Прасіць вучы!

---

## 78. З БЯДЫ Я ЦЯЖКАЙ.

1. З бяды я цяжкай дый з нядолі
ў заўзяты бурай кінут бой —
Да неба стогн ідзѐ ад болю...
Ах, Божа! дай мне свой спакой!
(Прыпеў): Ах, прышлі успакаеньне, —
ў нядолі дай мне пацяшэньне,
Даруй спакой мне пажаданы...
Ах, Божа! дай спакой мне свой!

2. Віхры спыні, стрымай і буру,
Вятроў шалёных кліч назад!
Дай мне пазнаць Тваю натуру,
Каб я ўжо быў сапраўды рад!
Ах, прышлі успакаеньне і г. д. —

3. Не для таго хачу спакою,
Каб у грахох мог вечна спаць; —
Абмый мянѐ сваёй вадою,
Бо я ня знаю, як дастаць? —
Ах, прышлі успакаеньне і г. д. —

4. Ах, Божа! сьцеражы ад зьдзеку
Загнаных бурай ў грозны бой —
Ня дай загінуць чалавеку...
Прышлі на помач свой спакой! —
Ах, прышлі успакаеньне і г. д. —

---

## 79. ЗА ХРЫСТОМ ПАЙДУ Я.

1. За Хрыстом пайду я! Дабрадзейны Божа —
Бо любоў Хрыстова нам слабым паможа!
Аздаровіць сэрцы, дух нам узмацуе,
На Хрыста дарогу, на сьлед пакіруе!

2. За Хрыстом пайду я — ўсё мяне скланяе,
Крыж нясьці Хрыстовы дух ахвоту мае!
Кліч Хрыста сялодкі — дар сьвятога Духа —
Мне ня страшна цемры злое завіруха!

3. За Хрыстом пайду я — ад душы ахвотна,
Хоць вядзе Хрыстова сьцежачка гаротна!
Буду жыць для Славы, Волі я Хрыстовай,
Дый пайду я сьледам, сьцежкай той цярнёвай!

4. За Хрыстом пайду я — Ён мяне ратуе
Ад грахоў усякіх мукаю мацуе!
Сьмерць Яго бароніць, сьцеражэ ад злога
Дык іду, дзе ясна Го́спадня дарога!

5. За Хрыстом пайду я! Страху не баюся:
Па сьлядох Хрыстовых я не спатыкнуся!
Кроў Яго сьвятая сьлед Яго пакажа,
А Хрыста дарога — якісьці раскажа!

6. За Хрыстом пайду я! Божа мой, ах, Божа! —
Памагай — аж скончыцца цэла падарожа! —
Каб не спатыкнуцца, каб не заблудзіцца —
Па сьлядох Хрыстовых к'Богу прылучыцца!

---

## 80. НЯ ВЕЧНА ТУТ.

1. Ня вечна тут багацьце сьвету,
Ні хараство́, ні скарб зямлі, —
Хрыстос бярэ душу на мэту:
Каб грэх і зло браць не маглі.

(Прыпеў): Хрысьце, вядзі і барані —
(: ў любові к‘небу прыцягні! :)

2. Багацьце, слава пяройдзе — ўсё
Міне і зьвяне, быццам цьвет, —
І ўсё людзкое тут харастǒ
Распыліцца з праходам лет.
Хрысьце, вядзі і барані і г. д. —

3. А слава Бога, тут як скалà,
Трывае вечна се́рад нас;
Каб больш паказвацца ўсім магла —
Прыходзіць Божай ласкі час.
Хрысьце, вядзі і барані і г. д. —

4. А хоць цяжкàя доля тут нам —
Змагаць патрэба злое тут; —
Хрыстос вядзе нас да шчасьця брам,
І ад бяды, і ад пакут! —
Хрысьце, вядзі і барані і г. д. —

---

## 81. ХТО ПАГЛЯНЕ ЎЗВЫШ.

1. Хто пагляне ўзвыш — на Хрыста на крыжу,
Той спакой атрымае! Скажу:
Браце мой, паглядзі — Ён даў мучыць сябе —
І цярпеў на крыжу за цябе!
(Прыпеў): Глянь, глянь, грэшны глянь.
Глянь на раны Хрыста,
На калючы вянок
І пазнай, як ў любові глыбок!

2. Выбавіў Ён цябе і панішчыў суды,
Адкупіў Ён цябе наўсягды.
Сіла сьмерці — дзе джала тваё для быцьця?
Ён і пекла разьбіў для жыцьця!
Глянь, глянь, грэшны і г. д. —

3. Цемра ночы вісіць над тваёю душой
І мучэньні з журбою, парой,
Але глянь на Хрыста: Ён праменьмі гарыць,
І крыніца ў Ім праўды журчыць. —
Глянь, глянь, грэшны і г. д. —

4. Над табою няпраўда, страшнóе ярмó,
Надаела жыцьцё ўжо самó;
Але глянь на Хрыста: за твой грэх Ён цярпіць,
Каб ты вечна на волі мог жыць!
Глянь, глянь, грэшны і г. д. —

5. А чаму-ж у тваіх пасумнеўшых вачòх
Страх відаць, што жывеш у грахох?
Грэшны глянь на Хрыста! ды спадзеяй жыві!
Вечны дар ад Хрыстовай крыві! —
Глянь, глянь, грэшны і г. д. —

---

## 82. ШТО-Ж ЗАСУМАВАЎСЯ?

1. Што-ж засумаваўся?
Ці-ж ты ўжо забыў:
Той хто беспачатны,
Дух твой палюбіў!
Божы Сын расстаўся
З небам для зямлі,
Для цябе бадзяўся
ў пыле дый трухлі!

2. Выпіў Ён атруту
Сьмерці і грахоў,
Дый прынёс збаўленьне —
Скарб сваіх дароў!
Ці-ж ты не захочаш
Божы дар прыймаць?
Ці-ж табе сумліўнасьць
Перашкодзе ўзяць?

3. Братка! ты ня вер тым
Цёмным голасо́м —
Сьмела паднімі ты
Вочы к‘небясо́м!
Сум тады разьвее
Духа полымя,
І цябе сагрэе,
Божа цяплыня!

---

## 82*/₂. б) О, ТЫ, КРЫВЁЙ АБЛІТА!

(Мэлёдыя як № 36*/₂ О зранена балюча!)

1. О, ты, крывёй абліта,
У ранах галава,
І цернямі пакрыта,
Пако́лата уся!..
О, го́лаў, што ясьнела
ў пашаннай вышынѐ,
Цяпер ты пасінела —
О, як ты міла мне!

2. О, Спасе мой каханы,
Прыймі любоў маю,
Бо чым за кроў і раны
Цябе я абдару?!
Вазьмі мяне, о Божа,
І мною валадай,
На ўсей жыцьця дарозе
Ратуй і пацяшай!

3. Як сьмерць калісь паложыць,
Дай бачыць мне твой крыж.
Падай руку мне, Божа
Вядзі з Сабой у выш!

Хай ласка асьвятляе
Твая душу ў-ва мне,
Бо хто з Табой канае —
Збаўленьне дастае!

## 83. ДАБРАДАТНАЯ СКАЛА.

1. Дабрадатная скала
Мне збаўленьне ўжо дала —
Ад скалы Хрыстовай той
Ёсьць ручэй вады жывой:
    Каб грахі — балота зла
    ў ім душа абмыць магла.

2. Я закон не захаваў —
Сьмерці я прысуд спазнаў,
Але змог знайсьці спакой
У скале Хрыстовай той —
    Грэх ганяў мяне ўсе дні:
    Сэрца пёк, як у агні.

3. Божа! Я к'Табе прыйшоў —
ўсё жыцьцё ў Цябе знайшоў:
Ты абмыў мяне крывёй
ўласнай — у скалѐ сваёй,
    Бедны быў я, Ты увёў
    Да сьвятых сваіх дамоў!

4. Дабрадатны Божы сьвет
Асьцярог мяне ад бед:
Я нікога не баюсь
Бо за мной скала — Ісус*) —
    Серад гора і пакут
    Дадаѐ мне сілы тут!

*) Ісус па грэцку, Ѐзус па лаціні, а па беларуску будзе: Язус.

## 84. ЯК СУМ ЛЁГ НА СЭРЦЫ.

1. Як сум лёг на сэрцы, боль, го̀рыч і жаль,
Адчай калі ломіць і гне,
Да Бога, што ў небе, малітву шлю ў даль —
Поўна радасьці сэрца ў мяне! —
(Прыпеў): Люба мне, люба мне,
Поўна радасьці сэрца ў мяне! —

2. Калі я з трывогі бляды і дрыжу, —
Як сьцісьне, абніме сумліў, —
Я помачы ў Бога малітвай прашу,
З Божай сілы дух зараз аджыў!
Люба мне і г. д. —

3. Пакуса як цягне у грэх, і таплюсь,
А сэрца й душа мне баліць, —
Да Бога зьвяртаюсь і шчыра малюсь,
Бо мне хочацца праўдаю жыць!
Люба мне і г. д. —

4. Ах, Госпад Ацец мой бароніць мяне,
Сало́дка жыцьця дні бягуць, —
Ня страшна мне нават, як лягу ў трунѐ,
Супакойна дні вечна пайдуць!
Люба мне і г. д. —

---

## 85. ВЯДЗІ МЯНЕ, МОЙ БОЖА!

1. Вядзі мяне, мой Божа,
ў Дарогу Сам,
Дайсьці мне дапаможаш
Да неба брам!
Я не магу ступіці —
Слабы я адзін,
Ты можаш бараніці
Мяне ад він! —

2. Да сэрца міласэрна
Нас прытулі,
Каб мы Табе тут верна
Служыць маглі. —
Як падзём мы тварам
Да Тваіх ног —
Міласьць будзе дарам,
Бо Ты наш Бог!

3. Калі-бы нават можа
Аслаблі мы,
Дык Ты, вялікі Божа,
Схавай ад цьмы!
Вядзі мянѐ мой Божа,
ў дарогу Сам,
Дайсьці мне дапаможаш
Да неба брам!

---

## 86. О, ТЫ, НАЙЛЕПШЫ ОЙЧА НАШ!

1. О, Ты, Найлепшы Ойча наш,
Нам літасьцівым будзь,
Жыцьця дарогу нам пакаж,
ў нас духа ка́яньня нямаш,
Грахі-ж усё растуць...

2. Дык молім, Ойча, мы Цябе,
Ты міласьць нам даруй,
Ты мысьлі, думкі знаеш ўсе,
І доля у Тваёй руцэ,
Ты, як дзяцьмі, кіруй!

3. Кажы нам, Ойча наш, кажы,
Праз наш граховы мур,
Сей зёрны слоў сваіх ў глушы,
Будзі сумленьне у душы, —
Шлі цішу ў часе бур!

4. Пашлі да нас сваю любоў —
Да сэрцаў голас свой,
З дзіўнóю сілай мудрых слоў,
Сумленьне чыста дай нам зноў,
А ў буру — супакой

5. Вазьмі за руку і вядзі,
Апекай атуляй,
Сваім нас сьветам асьвяці,
І кожны ход Ты наш сьлядзі,
Вучы і пацяшай!

6. Калі-ж хто гордае душы, —
Ты ўсё-ж не загубі,
А воблік срогі аткрывай
І за упорнасьць пакарай,
А ўсё такі любі! —

А м э н.

---

## 87. ЎСЁ ДЛЯ ХРЫСТА.

1. Покліч наш: „ўсё для Хрыста!“ Мы
Дружна ўсе за Ім пайдзéм;
Стаўшы Ціха ў пакаяньні
Гэты гімн Хрысту сьпяем!
„Правадыр! З Табой ўсё маем,
З Божым словам ад Цябе:
Мы усім таго жадаем,
Што мы хочам для сябе!

2. Ты нас любіш крэпка, вечна —
Ўмёр ускрос, каб мы жылі.
Бліжнім памагаць казаў Ты,
Каб гатовы мы былі!

На зямлі калісь быў з намі,
І вучыў, як трэба жыць.
Дык пайдзём Тваймі сьлядамі,
Каб з Табой навекі быць!“ —

Амэн.

---

## 88. ЗІХАЦІЦЬ, ІСКРЫЦЦА КРЫЖА СЬЦЯГ.

1. Зіхаціць, іскрыцца сьветлы крыжа сьцяг,
Нас вядзе наперад — на нябесны шлях,
Палучыўшы сэрцы, з крыжам серад нас,
Бо жыцьця зямнога хутка пройдзе час.
(Прыпеў): Зіхаціць, іскрыцца сьветлы крыжа сьцяг,
Нас вядзе наперад — на нябесны шлях!

2. О, Хрысьцè нам мілы, шляхам Божых ног
Хочам пасувацца па Тваіх сьлядох...
Часта мы блудзілі, як зьнікаў Ты нам, —
Павядзі цяпер нас, павядзі нас Сам!
Зіхаціць, іскрыцца і г. д. —

3. Праз жыцьцё ўсё наша будзь правадыро́м,
Хай Твой сьцяг засьвеціць нам у ноч і днём!
Будзь Ты нам заслонай, нас Ты барані, —
Выбачай нам, Божа, нашыя грахі!
Зіхаціць, іскрыцца і г. д. —

4. Ты пазволь калісь нам ў небе запяяць.
Каб Табе з падзякай чэсьць і славу даць:
Дай канец блуджэньню нам тут на зямлі,
Каб мы супачыці ў небе ўжо маглі! —
Зіхаціць, іскрыцца і г. д. —

Амэн.

---

## 89 БОГ МОЙ, БОГ—ЦАР НЯБЕСНЫ.

1. Бог мой, Бог — Цар нябесны
Цэль жыцьця і жаданьне!
Я твой ўвесь—бедны, грэшны,
Ты мне ўсё! Ты каханьне.

2. Для Цябе пахнуць кветкі,
Дый плывуць, лятуць творы!
Для Цябе людзі—дзеткі—
ўсё: ў зямлі, ў версе, ў моры!

3. Жыць Тваім хочу словам,
Быць з Табою ўдзень і ўночы,
На усё быць гатовым —
Так, як Госпад Сын хоча!

4. Хо́чу ўсю кінуць шкоду:
Што к' Яму ня зьліжае, —
Памагаць і народу
Сілай той, што крыж мае!

5. Я гатоў, Госпад Божа,
На Твае прыказаньне —
Зло ніяк ў нас ня зможа
Для Цяба ўсе стараньні!

---

## 89*/2. ЎСЁ РАСКАЖЫ АБ ХРЫСЬЦЕ.

1. Вестку аб Богу скажы мне,
ўсе раскажы аб Хрысьце,
Радасна вестка сьвятая,
Цэнны дар сэрцу нясе!
Анялаў песьні сьпявай мне:
Як нарадзіўся Хрыстос —
Як чэсьць ляцела да неба,
А супакой Ён прынёс.

(Прыпеў): (4 радкі з пачатку і матыў той самы).

Вестку аб Богу скажы мне,
ўсё раскажы аб Хрысьце,
Радасна вестка сьвятая
Цэнны дар сэрцу нясе!

2. Вестку, як жыў, навучаў жыць,
ўсім памагаў у бядзе,
Як Ён людзьмі быў прызнаны,
ў беднасьці быў і трудзе.
Вестку, як быў на пустыні,
Як шмат пакус перанёс,
Як працярпеў—і па сьмерці
Як праз тры дні уваскрос!
Вестку аб Богу і г. д.

3. Весьць, як да крыжа прыбілі,
Як на крыжу уміраў,
Весьць, як у гроб палажылі,
І як із гробу устаў —
Радасну вестку скажы мне,
Як Ён людзёў палюбіў.
Слава Яму век хай будзе —
Ён і мой грэх адкупіў!
Вестку аб Богу і г. д.

---

## 90. АХ, МНЕ ПАТРЭБНЫ ТЫ.

1. Ах, мне патрэбны Ты,
Мой Спасе дарагі,
Ты сіла ёсьць мая,
Даруй мае грахі!

(Прыпеў): Хрысьце мой, Спасе, Божа,
Сёньня шчыра клічу:
Пачуй маю малітву,
Прыдзі ка мне!

2. Ах, мне патрэбны Ты,
Хрысьце, пры мне Ты стой,
Калі цярплю я боль,
І твар збляднеўшы мой,
Хрысьце мой і г. д.

3. Ах, мне патрэбны Ты,
У добрых днях і злых,
Прамень мой яркі Ты
ў маіх дарогах ўсіх!
Хрысьце мой і г. д.

4. Ах, мне патрэбны Ты,
Я хочаш, так вядзі,
Спадзея Ты мая,
Ты да мяне прыдзі!
Хрысьце мой і г. д.

5. Ах, мне патрэбны Ты,
Прыбліжся і хадзі,
І помач прынясі!
Падняць мяне ідзі!
Хрысьце мой і г. д.

---

## 91. БЛІЖЭЙ, ХРЫСЬЦЕ, ПАЗВОЛЬ.

1. Бліжэй, о бліжэй, Хрысьце, пазволь
Ісьці з Табою праз радасьць і боль,
Трымай мяне на ўлоньні сваём,
(: Пры мне будзь блізка і ўночы і днём! :)
(2 разы).

2. Бліжэй, о бліжэй, пры мне Ты стань,
Хрысьце, якую Ты захочаш дань?
Я толькі грэшнае сэрца дам
(: Ты Яго можаш ачысьціць мне Сам! :)

3. Бліжэй, о бліжэй, канчатак лет,
Гатоў ўсё кінуць, чым зводзіць так сьвет,
Жыцьця ў раскошы ня хочу знаць,
(: Пры Табе блізка каб мог я стаяць! :)

4. Бліжэй, о бліжэй прасіць хачу,
Табе, Хрысьце мой, малітву я шлю,
Вазьмі ха руку, ісьці пазволь
(: К'Табе, Хрысьце мой, праз радасьць і боль :)

---

## 92. ПАМАЖЫ ТЫ САМ!

1. Памажы Ты Сам
У жыцьці тут нам!

Як Цябе, Хрысьце пабачым, —
То сьляды Твае пазначым,

Да нябёс варот,
Пуцявінкі ход.

2. У нядолі час, —
Сам ўзмацуй Ты нас!

А як боль вазьме за грудзі,
Жалю да Цябе ня будзе,

Бо праз крыж ў бядзе
Сьцежачка пайдзе.

3. А як цяжкі век
Мае чалавек,

Праз адчай і праз нядолю, —
Сэрца задрыжыць ад болю,

Сам канчатак сьлёз
Каб ты нам прынёс!

4. Намі ўпраўляй,
Серад нас бывай!

Як ісьці па цернях кажаш,
То дарогу нам пакажаш,

Памажы нам з выш
Панясьці свой крыж!

---

## 93. ХОЧАМ ДА СЬМЕРЦІ.

1, Хочам да сьмерці, быць Хрысьце, Тваімі,
Хочам да сьмерці мы вернымі быць,
Каб ня блудзілі ў дарозе з другімі,
Хочам Цябе мы заўсёды любіць!

2. Хочам паслушна Тваімі сьлядамі,
Хочам з Табой хадзіць сьледам у сьлед,
Ты ўмёр за нас, дык будзь усьцяж з намі,
Ты наш прыяцель да апошніх лет!

3. Нас палучыла гора, мукі, зьдзекі;
Пад Тваім крыжам станем грамадой,
Сэрца Табе мы аддаем навекі, —
Хочам злучыцца мы на век з Табой!

4. Прыдзі, Цябе мы жджэм — і не дажджэмся,
Помні на словы, што сказаў Ты нам:
Толькі як з чыстай душою зьбярэмся, —
Ты будзеш з намі, Ты зьявішся Сам! –

---

## 94. ХОЦЬ БУРА КАЛЯ НАС КІПІЦЬ.

1. Хоць бура каля нас кіпіць —
Яé ня бóймася!
Як з намі ў чоўне ёсьць Хрыстос
Мы ня утопімся!

(Прыпеў): Хоць ажно пенай глыб кіпіць,
Нас Го́спад будзе бараніць —
І скажа: ціша будзь!
Ня дасьць нам патануць. —

2. Пакуль-жа бура скончыцца,
Дружына верна, чуй!
Ты выдзяржыш, абдужаеш,
У веры дух гартуй! —

(Прыпеў): Як сэрца з болю ў нас дрыжыць,
Здаецца нам, што Го́спад сьпіць,
Малісь, адважна стой —
Вядзі з няверай бой! —

3. Ідзі-ж, куды Бог кліча нас,
Паслушна, сьмела йдзі!
Калі прыціхне во́раг наш,
Ты, Божа, к нам прыдзі!

(Прыпеў): Праз жар, агонь, праз глыб вады
Вядзі нас, Божа, ад бяды:
Дружына, сьмела йдзі!
Ты, Божа, нас вядзі! —

4. Адкіньма сум, журбу і гнеў
У дарозе той ад ног,
Паднімем го́лаў ў выш, бо йдзе
Стуль к нам на помач Бог.

(Прыпеў): Ён сам магутнаю рукой
Затопіць ў глыбі ўражы рой —
І скажа: ціша будзь!
Ня дасьць нам патануць!

## 95 а) БОЖА, ШТО ТАК ЛЮБІШ.

1. Божа, што так любіш нас,
Дык ў свой лік прымі мяне,
Бо трывае бурны час,
Бо паводка нас залье!
На ратунак нам прыдзі,
Ад жыцьцёвай буры збаў,
ў цішу нас сваю ўвядзі,
Каб душы спакой настаў!

2. Ты адна спадзея нам,
Ты ў нядолі памажы!
Ня ўтрымаюся я сам,
Ты мяне тут падзяржы;
Пад апекаю Тваёй
Памажы мне адпачыць,
І страхой укрый сваёй,
Каб спакойна мог пражыць!

3. Ты мая падпора ўся,
Літасьцяй не даражы.
Дай палёгку ў дні жыцьця,
ў падарожы сьцеражы.
Ты-ж сапраўдны сьвету Бог —
Каюсь я Табе ў грахох,
І ў Тваіх сьвятых я ног
Шлю малітву шчырых слоў!

4. Ты ручэй жывой вады,
Што плыве да нас ў цішы,
Дык абмый з грахоў, бяды,
Дай піць сэрцу і душы
Ты крыніцаю жывой,
Дай чарпаць з Яе і піць,
Каб я з чыстаю душой,
Мог з Табой навекі жыць!

## 95. б) О, ХРЫСЬЦЕ, ПРЫЙМІ.

1. О, Хрысьце, прыймі мяне
На улоньне, на сваё,
Бо наўкол грыміць, гудзе
Страшнай бураю жыцьцё.
Ты схавай мяне, прашу,
Пакуль бура у жыцьці,
Супакой маю душу, —
ў цішыню сваю вядзі.

2. У каго-ж знайду я схоў?
Хто-ж ў жыцьці, паможа мне?
Толькі Ты! Твая любоў!
Паратуеш Ты мяне!
Падасі сваю руку,
Каб бясьпечна мог я жыць;
Ты дазволіш галаву
Пад Тваёй страхой злажыць!

3. Для мяне, Хрысьце, Ты—ўсё!
Да Цябе ісьці давай
Праз гаротнае жыцьцё,
Пацяшай і узмацняй!
Ты адзін прадвечны Бог
Паратуй мяне ў жыцьці,
Ля Тваіх малюся ног —
Не карай за ўсе грахі!

4. Ты — крыніца дабраты,
Абмываеш душы з плям,
Дык змый ўсе з мяне грахі
І ачысьць мяне Ты Сам!
Ты — рака вады жывой!
Дай вады мне гэтай піць!
Каб з ачышчанай душой
Мог з Табой навекі жыць!

## 96 Я ЗАМОРАНЫ.

1. Я заморaны, зьнямогшы
Да Цябе, Хрысьце іду,—
Хоць грахамі я абросшы,
Да Тваіх ног упаду!

(Прыпеў:) Да Цябе, Хрысьце, іду я —
Дух слабы мой ажыві,
Супакой сьвяты даруй мне,
Пашкадуй і паднімі!

2. Я няшчасны ў гэтым часе
Дзе-ж спакой душы знайду?
Да Цябе іду, мой Спасе!
Ад Цябе—не адыйду.
Да Цябе, Хрысьце і г. д.

3. Дык пацеш мой дух так сумны,
Дай мне крышку супачыць,
Дай мне скончыць шлях пакутны —
Добрым дзелам дай пражыць!
Да Цябе, Хрысьце і г. д.

4. А калі ад мук пакутных
Цяжка будзе мне ісьці —
На руках Тваіх магутных
Дух мой будзеш Ты нясьці!
Да Цябе, Хрысьце і г. д.

## 97. Ў РУКАХ Я У ІСУСА. *)

1. Ў руках я у Ісуса *),
Трымае Сам мяне,
Ён даў на век збаўленьне
ў любові да мяне

*) Ісус па грэцку, Jezus па лаціні, па белар. будзе: Язус.

На небясох ёсьць радасьць
З таго, што я збаўлён,
Чакае там Ацец мой,
Там дасьць мне месца Ён.

(Прыпеў:) Ў руках я у Ісуса *)—
Трымае Сам мяне,
Ён даў на век збаўленьне
У любові да мяне. —

2. Ў руках я у Ісуса *)
Здалёк ад ўсіх клапот.
Ня страшна мне пакуса
Растаяў грэху лёд.
Ніхто мяне ня зможа
Ад Бога адабраць,
Бо для Яго гатоў я
Сваё жыцьцё аддаць.
Ў руках я у Ісуса і г. д.

3. У руках я у Ісуса *)
Ён мучан за мяне,
Каб я ня гінуў вечна
ў нячыстага ярме.
Хрыстос мне даў збаўленьне,
Прагнаў Ён ночы цень,
І хутка ўсе убачым
Той сьветлы вечны дзень.
Ў руках я у Ісуса і г. д.

---

## 98. КАБ Я НЯ МЕЎ ЦЯБЕ, ХРЫСЬЦЕ!

1, Каб я ня меў Цябе, Хрысьце мой добры,
Калі-б за нас Ты на крыжу ня ўмёр-бы,—
Дзе-ж я тагды ад суму, ў цемры ночы
Зьвярнуў-бы вочы?

*) Ісусу — белар. Язусу.

2. Што-ж я тагды-бы тут зрабіў з сабою,
Бо дзе-ж ёсьць сэрца з гэткаю любоўю?
Ах, праз Цябе дастаў я пацяшэньне —
Маю збаўленьне!

3. Злая і грэшная мая натура,
Літасьць Твая мяне ўжо прыгарнула,
З ласкі Тваёй я, Божа пажаданы,
Адратаваны!

4. Каб ты ня быў раней, са мною, Божа,
То я Цябе тут ня шукаў-бы можа,
А Ты за мной шоў, і, як чалавеку,
Даў мне апеку.

5. Прымі, Хрысьце, маю падзяку шчыру,
За тое славу я Тваю пашыру,
Бо, каб ня Ты, вялікі мой Збавіцель
Я-б меў пагібель.

6. Хрысьце, будзь добры зноў нам паказацца,
А Імя вечна будзе праслаўляцца,
Трымай, Хрысьце, нас пад сваёй апекай
Аж на век векаў!

---

## **99**. а) ХО́ЧУ Я, БОЖА МОЙ!

1. Хо́чу я, Божа мой,
Быць пры Табе,
З Табой на векі жыць,
Прыймі мяне.

(Прыпеў:) З Табой жадаю быць,
І аб Табе ўсё сьніць,
З Табою толькі жыць,
З Табою жыць!

2. Хоць захад прыдзе мой,
Патухне дзень,
Мяне гроб будзе крыць
У вечны цень,
З Табой жадаю быць і г. д.

3. О, дзякую Табе,
Што ў час ліхі
Магу ў Цябе пабыць —
Слуга благі.
З Табой жадаю быць і г. д.

4. Як пазавеш мяне
Калісь к' Сябе,
Як кіне сэрца біць,
Пайду к' Табе...

О, дай душы аджыць,
Каб пры Табе век жыць,
Тваім навекі быць,
З Табою быць.

Амэн.

---

## 99 б) З ТАБОЮ, БОЖА МОЙ!

1. З Табою, Божа мой,
Хачу трываць,
З Табою вечна жыць
І прабываць.
(Прыпеў:) Хачу з Табою быць,
Цябе заўсёды сьніць,
Хачу з Табою жыць,
З Табою жыць.

2. Хоць прыдзе захад мой —
Настане ноч
Труна хоць будзе крыць,
Сьвет зьнікне з воч.
Хачу з Табою быць і г. д.

3. О, рад я, Божа мой,
Што ў часе зла
У ценю хочу быць
Твайго крыла.
Хачу з Табою быць—
Ступню, як блюшч, абвіць,
Хачу з Табою жыць,
З Табою жыць!

4. Калі паклічаш Ты
Мяне з жыцьця
Туды, дзе дом стаіць
Твайго быцьця.—
Душы маёй дай жыць,
Дай радасьцяй ільсьніць,
О, дай з Табою быць,
З Табою быць!

Амэн.

---

## 100./113. а) РАДАСЬЦІ, ШЧАСЬЦЯ РАНЬНІЦА.

1. Радасьці, шчасьця раньніца дня
Сее спадзею, залоціцца;
Веру, што мною кіруе Бог,
ў вечнасьць вядзе Ён з блудных дарог!

2. Я не баюся Бога саўсім,
Бо сэрца часта гаворыць з Ім,
З Ім прабывае ўночы і днём
Бо Ён маім ёсьць добрым Айцом.

3. Ён пацяшыцель ў надолі мой,
Здаровіць сэрца і шле спакой,
Голасам мілым патайных слоў —
Бог мой калыша да дзіўных сноў.

4. Твой весь я, Божа, я Твой ёсьць сын.
Мысьлі, пачуцьці схавай ад він
Ды сьцеражы ад ліхога плям
ўсё ў Твае рукі чыстым аддам.

---

## 101. а) СКАЗАЎ ХРЫСТОС.

1. Сказаў Хрыстос маёй душы:
„Як цяжка жыць табе,
Дык голаў змучану злажы
Ты на грудзёх ў мяне!“ —
Прышоў я да Хрыстовых ног,
Са змучанай душой,
Ён выцягнуў мяне з трывог,
І такжа з долі злой. —

2. Пачуў я шопат мілых слоў:
„Ідзі ка мне — сюды!“
Нап‘ешся тут, вазьмеш дамоў
Жыцьця жывой вады!“
З апошніх сіл, сярод трывог,
Пайшоў, нагнуўся піць, —
І зараз хутка смагу змог,
І стаў нанова жыць! —

3. Дзіўны я чую шопат зноў:
„Глядзі, як сьветла тут,
Як сьвеціцца мая любоў,
Як гіне цемра блуд!“
Я паглядзеў, а ў момант той
З Яго шоў яркі сьвет,
Да глыбі шоў душы маёй,
Я стаў Хрыстом агрэт! —

А м э н.

---

## 101. б) СКАЗАЎ ІСУС *) МАЁЙ ДУШЫ.

1. Сказаў Ісус *) маёй душы:
„Ідзі, спачынь пры мне,
Калі змарылася ў жыцьці,
Схіліся да мяне!“
Прышоў к Ісусу *) я да ног
Са змучанай душой —
Ён выбавіў мяне з трывог,
Жыцьцю даў сьветач свой.

2. Я шопат чуў прыемных слоў:
„Прыдзі, я дам вады —
Ты асьвяжышся ёю зноў,
Жыцьцё адновіш Ты!“
З апошняй сілы, грэшны я,
Прыйшоў чарпаць і піць,
Аж прагнасьць раптам зьнікла ўся,
Я стаў нанова жыць!

3. Тагды Ісус *) шапнуў мне зноў:
„Я ёсьць сьвятло́, зірні!
Як сьвеціцца мая любоў,
Як сьвеціць ўноч душы! —
І я зірнуў — аж бліск Яго
Мяне сабой пакрыў,
І ў сэрца сумнае маё
Паток любві паплыў.

Амэн.

---

*) Ісус па грэцку, па лаціні — Ёзус, а па беларуску будзе — Язус.

## 102. ЎСЁ ТАБЕ ДАЮ!

1. Ўсё Табе дарую сёньня,
ўсе Тваім тут мусіць быць;
Я хачу Цябе любіці
І з Табою, Божа, жыць!
(Прыпеў): ўсё Табе даю, ўсё Табе даю—
ўсё Хрысту маёму Богу
Сёньня ўсё даю! —

2. Ўсё Табе дарую сёньня. —
І паклон Табе даю;
Радасьць сьвету забываю,
Пад апеку йду Тваю!
ўсё Табе даю і г. д. —

3. Ўсё Табе дарую сёньня. —
Духам Божам ахрысьці,
Каб Тваім я быў заўсёды,
Каб я мог Твой крыж нясьці! —
ўсё Табе даю і г. д. —

4. Ўсё Табе дарую сёньня,
Бо сьвяты Твой чую жар,
Шчыра цешуся Табою,
Бо Твой Божы маю дар!—
ўсё Табе даю і г. д. —

---

## 103. ЯК РАНКАМ ДЗЕНЬ ЗАГАРЫЦЦА.

(З Мэндэльсона).

1. Як ранкам дзень ужо чуць загарыцца,
На небасхіле як зіхаціць,
Як птушка крыльлямі страсае рóсу,
Мой дух з Табой і за Табой ляціць! —

2. Я ўжо з Табой. Прыроды новай чары
Перадамной хавае цень-імгла, —
Я сам з Табою — ціхаю малітвай
ў цішы з Табою размаўляю я!

3. Я сам з Табой! Што дня жыцьцё нанова
ў прыродзе цэлай будзіцца ізноў,
І гэтак сама Божая прысутнасьць
Мяне з глухіх душы ўжо будзіць сноў. —

4. Як крыльлі думак змучаны павіснуць —
Я хо́чу думаць і з Табою сьніць,
І лёгка дрэмлю пад Тваёй апекай,
І жыць я хо́чу, пры Табе век быць! —

5. Так сама хо́чу гэтым сьветлым ранкам,
Як сьмерць загляне ад другога дня,
Што пэўнасьць будзе—быццам шчасьця сонца,
Што Ты са мною, што з Табою я! —

А м э н.

---

## 104. БОЖА ДОБРЫ.

1. Божа добры, любіш нас! —
Прысылай нам ласкі час,
ў нашы сэрцы Ты прамоў,
Дай Тваіх нам слухаць слоў!

2. Хай Твой Дух сюды прыдзѐ,
Да таго, каго знайдзе́;
Дай магутнасьці сваёй, —
Каб прыказ мог споўніць Твой!

3. Пакаяньне ўсім пашлі,
ў сэрцы нам, каб мы знайшлі
Там прастор Тваёй сяўбе —
Просім, Божа, у Цябе!

4. Божа добры! памажы
Нам Твой шлях сьвяты пазнаць,
Чысту праўду пакажы
Каб Цябе нам вечна знаць!

А м э н.

---

## 105. ЁСЬЦЬ НА СКАЛЕ СЬВЯТЫНЯ.

1. Ёсьць на скалѐ Сьвятыня,
Скалою ёсьць Хрыстос,
Янà зла не баіцца,
Ні пяруно́ў пагроз.
Хрыстос Сам будаўнічы
Сьвятыні ёсьць сваёй,
Збудо́вана, як крэпасьць,
Яго сьвятой крывёй. —

2. Янà зямлі народы
Бярэ са ўсіх старон,
Бо Праўда ў Ёй Хрыстова
Між іх ёсьць, быццам, трон
Спакой ім добрай волі
У сэрцы можа ўліць,
Душы дасьць радасьць з долі,
І лѐчыць, што баліць.

3. Янà хлеб масе многай
З Хрыстовых рук дае́,
І лучнасьць вечна з Богам
ў Сьвятыні настаѐ.
Якубавай драбінай
Сьвятыня такжа ёсьць,
І сувязь аркі*) новай,
Як ласкі Божай госьць. —

*) „Каўчэг“.

4. Яна́ і ўсё зярняткі
Што ў сэрцы кінуў Бог,
Гілнуе, каб на ніве
Куко́ль ня перамог.
Хрысьце, ў Тваёй Сьвятыні
Ты па́стырам Сам будзь,
Хай на Скалу, ў Сьвятыню
Тваю усе прыйдуць!

Амэн.

---

## 106. а) БОЖА ОЙЧА!

(На хрэсьбіны).

1. Божа Ойча, ў Імя гэта
Хрысьцім мы храстом сьвятым,
Тым даеш пазнаць для сьвету,
Як магу́тны, Божа, Ты!
Сам крыніцай Ты жыцьця,
Ты нам сілаю быцьця!
Скарбаў ласкі маеш многа,
Ты для нас жыцьця дарога! —

2. Божы Сыну, ў Імя гэта
Хрысьцім мы Тваё дзіця;
Ты яго на многі леты
Абмывай вадой жыцьця!
Хай Твая вада і кроў
Жывіць братню ў ім любоў,
ў супакою і патолі
Сілы набярэ даволі! —

3. Божы Дусе, ў Імя гэта
Хрысьцім мы душу сваю,
Ей явіся яркім сьветам,
І магутнасьць дай Тваю, —

Божым сьветам надзялі,
Зло і цемру аддалі,
Лі ў яе крыніцу веры,
Зачыні ёй пекла дзьверы!

---

## 106. б) БОЖА ОЙЧА.

(На хрэсьбіны).

1 Божа Ойча, прад Табою
Хрост выконваем сьвяты—
Тым даеш пазнаць, якою
Ёсьць Істотай, Божа Ты!
Ты крыніцай нам быцьця,
Ты даеш ваду жыцьця,
Ты ў Сабе хаваеш многа
Скарбаў ласк, жыцьця дарогу!

2. Божы Сыну, прад Табою
Хрысьцім тут Тваё дзіця,
Ты крывёй сваёй сьвятою
Мыеш, як вадой жыцьця!
Хай ажывіць гэта кроў
ў сэрцы братнюю любоў,
Хай пад гэтаю расою
Сілы нябярэ ў спакою!

3. Духу Божы, прад Табою
Гэту мы бярэм душу,
Ты зьявіся тут над ёю,
Дай магутнасьць ёй Сваю,
Ласкай Божай надзяляй,
Грэх, пакусы аддаляй
Пакажы крыніцу веры,
Адчыні да раю дзьверы!

---

## 107. а) ХРЫСЬЦЕ НАМ МІЛЫ!

(На памятку хлеба і віна).

1. Хрысьце нам мілы, без Цябе
Мы чуем сум, жальбу!
Дык спажываем хлеб, віно
На памятку Тваю!

2. Ты сам калісь пакінуў нам,
Як волю ў тым Сваю, —
Дык выпаўняем Твой прыказ
На памятку Тваю!

3. Ты ажывіць зноў хочаш нас,
Вячэру даць Сваю, —
Дык мы ямо містычны хлеб
На памятку Тваю'

4. Прыняўшы сымболь Твой сьвяты
Даем душу сваю,
І сэрцам лучымся з Табой
На памятку Тваю!

---

## 107. б) ХРЫСЬЦЕ, НАМ СУМНА!

(Як прымаюць хлеб і віно).

1. Хрысьце, нам сумна без Цябе —
Мы чуем боль ў сабе!
Дык п'ем віно і хлеб ямо
На памяць аб Табе!

2. Ты нам, як жыў, аставіў тым
Тут знак свой па Сябе, —
Дык мы спаўняем Твой прыказ
На памяць аб Табе! —

3. Каб ажывіць нас, хочаш нам
Містычна даць Сябе, —
Дык хлеб ямо́ і п‘ем віно́
На памяць аб Табе!

4. Праз гэты знак, Праз Твой пагляд
Мы ка̀емся ў сабе, —
Душой і целам мы з Табой
На памяць аб Табе!

---

## 108. ВОСЬ СЁНЬНЯ ШЛЮБ.

(Песьня-гымн на шлюб).

1. Вось сёньня шлюб злучыў дваіх тут долю,
Каб разам свой прайсьці жыцьця весь шлях,
Тым, Божа наш, Тваю спаўняюць волю,
І доля іх ў Тваіх сьвятых руках!
Будзь сьведкай да́нага тут слова,
І вернасьць іх асьцерага́й,
(: Хай іх ня зьменіць сувязь нова,
Сваёй ім ласкай памагай! :)

2. Багаславі іх долю, хай ясьне́е!
І барані іх сэрцы ад трывог,
Хай шчасьця ім, як сонца, прамяне́е,
Залоціць ім хай родны іх парог!
Хай дывано́м пайдуць дарогі,
Ты сэрцам іх дай супакой,
(: І за віны ня будзь ім срогі,
Праз ўсё жыцьцё пры іх Ты стой! :)

---

## 108*/2. а) ХРАМ-СЬВЯТЫНЯ БОЖАЯ.

1. Ў гэтым месцы будзе тут
Храм-Сьвятыня Божая —
Для малітвы і пакут
Богу й нам прыгожая!

2. Як Касьцёл-Царква стаіць —
Гэта Слава Божая, —
Будуць Бога ў Ей маліць
Брацьце падарожнае.

3. Тут пахілім галавы,
Бог збаўленьне нам прынёс;
Тут нам камень вуглавы
Пасьвячае Сам Хрыстос!

4. Тут на камень вуглавы
Ставім, Божа, мы Твой дом;
Псальм пахвальны, гымн сьвяты
Хай пяюць заўсёды ў Ём.

5. Хай Бог-Сын, што за грахі
Нашы мукі працярпеў,
Гэты камень вуглавы
Багаславіць нам цяпер.

6. Тут нам сей, як мае быць
Зерня праўды, Дух Сьвяты,
ў гэтым месцы дзе ляжыць
Гэты камень вуглавы!

7. Хай ўсім бедным дзьверы тут
Бог адчыніць заўсягды,
Хай ня пройдзе грэх і бруд
Тут праз камень вуглавы.

8. Каб сьвятыня-храм жывы
К'Богу ўсім прыйсьці памог,
Хай тут камень вуглавы
Будзе Сам Хрыстос — Сын-Бог! —

## 108*/2. б) НА МАЛІТВУ ГЭТЫ ДОМ.

1. На малітву гэты дом
Пасьвячаема Табе
Божа мілы, хай у ём
Знойдзем супакой сабе!

2. Ты, што Сына нам паслаў,
Каб збаўленьне мелі ў Ём,
Хай з Табою, Божа, спраў,
Сын ўзмацняе гэты дом! —

3. Хай Твой Дух спакой пашле
ў гэтым доме сэрцам тым,
Што цяпер жыцьця, гняце
І патолі трэба ім!

4. Хай-жа дзеці ўсе Твае
Тут прыпынак знойдуць свой,
Што ня маюць месца дзе
Для душы знайсьці спакой!

5. Хоць убогі ёсьць наш дом
І ня зьзяе у ём блуд,
Але сэрцы нашы ў ём
З чыстай верай будуць тут! —

6. Як Касьцёл-Царква стаіць —
Гэта Слава Божая, —
Будуць Бога ў Ёй маліць
Брацьце падарожнае.

---

## 109. ЎЖО ЗДАЛЁК СЬВЕЦІЦЬ.

1. Ўжо здалёк сьвеціць нам гэты край,
Дзе здаўна нас чакае Хрыстос
Дык хутчэй, брат, туды пасьпяшай,
Дзе вядзе вузкі шлях да нябёс. —

(Прыпеў:) (: Нас Хрыстос увядзе
У той дзіўны, жаданы наш край.—:)

2. Там далёка ўва славе нябёс,
Без клапот нашай сумнай зямлі,
Знаць ня будзем ні гора, ні сьлёз,
Будзем жыць, як сьвятыя жылі. —
(: Нас Хрыстос і г. д.— :)

3. Будзем славіць, як многа сьвятых,
Што ад Духа абняты агнём
Выслаўляюць Хрыстову любоў
І душой прабываюць у Ём. —
(: Нас Хрыстос і г. д.— :)

---

## 110. ШЧАСЬЛІВА ЁСЬЦЬ КРАІНА!

1. Шчасьліва ёсьць краіна —
Свабодай там іскрыць
Жыцьцёва каляіна,
Там гром—пярун маўчыць.
Душа́ туды нясецца,
Ляціць чуцьцём яна,
Туды і сэрца рвецца —
Айчына там мая!

2. Там вечна валадае
Ацец нябесны мой,
Там чэсьць Яму складае
Анёлаў Божых рой. —
Душу іх песьня будзіць,
А ў сэрцы аж грыміць,
І напаўняе грудзі,
Сьлязой ў вачох блішчыць.

3. Ў красе́ хтось агняцьвету
Мяне̇ чакае там,
Мяне́ ў Айчыну гэту
ўвясьці хтось хоча Сам.

Краіна шчасьця тая —
Бяз гора і бяз мук —
Туды ўсіх прыклікае
Хрыстовы мілы гук! —

Амэн.

---

## 111. СЬНІЦЬ АБ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ МІЛАЙ...

1. Сьніць аб Бацькаўшчыне мілай
Дух спрацованы жыцьцём,
Ціша неба цягне сілай, —
Радасьць вечна ў краю том!
(Прыпеў:) Сны з чужых краёў да родных
Бацькаўскіх старон ляцяць, —
Там у сьветле зор цудоўных
Брамы неба зіхацяць. —

2. Ў Бацькаўшчыне ціша вечна;
Цішу, што ня любіць сьвет,
Нават анял безканечна
Славіць ад пачатку лет.
Сны з чужых краёў і г. д. —

3. Гэта Бацькаўшчына — неба
Так далёка напагляд;
Жалю, сьлёзаў там ня трэба —
Я там вечна буду рад! —
Сны з чужых краёў і г. д. —

---

## 112. АХ ДЗЕ-Ж МОЙ РОДНЫ КРАЙ?

1. Ах дзе-ж, ах дзе-ж мой родны край? —
Дзе век вясна і вечны рай,
Дзе ня жыве ніхто ў сьлязах,
Дзе ня існуе боль ані страх!

2. Там, дзе грахоў ня пляміць бруд,
Дзе нас ня глуміць цяжкі труд,
Ні горыч, жаль да старчых лет —
Якімі душыць нас гэты сьвет.

3. Там ў небе ёсьць мой родны край —
Там ціша, радасьць, вечны рай:
Канец нядолі, мукаў і сьлёз,
І стогнаў, енкаў, крыўды, пагроз.

4. Калісь з ліхіх жыцьця дарог
Ў родны мой прыду парог —
Праўдзіву радасьць чую я,
Як скіне сум душа́ там мая.

5. Там ў родным доме сам Хрыстос
Палечыць сэрцы з ран і сьлёз
Сваім выбранцам на векаў век —
Там збаўлен будзе наш чалавек!

6. Ах дзе-ж, ах дзе-ж мой родны край?
Дзе век вясна, дзе вечны рай —
Там ня жыве ніхто ў сьлязах,
Там ня істнуе боль ані страх. —

Амэн.

---

## 113. / 100. 6[1]) ЦІША ПА БУРЫ.

(Мэлёдыя пры песьні № 100 а).

1. Ціша па буры, сонца па мгле,
Ранак вясёлы па прыкрым сьне,
Будуць напэўна ждаць яны нас,
Як нам жыцьця ўжо праміне час. —

2. Радасьць па суме жджэ чалавек,
Па чорнай долі шчасьлівы век;
З немачы — сіла, па ганьбе чэсьць
І па адчаю вясёла весьць.

3. Посьле пякоты — прыемны цень,
Посьле змаганьня — пабеды дзень
Радасьць, палёгка, сіла ва ўсём —
Нашым багацьцем ўночы і днём. —

4. Жджэ нас калісьці любові жар,
Грэшных збаўленьне і ласкі дар,
Уваскрасеньне нам абяцаў —
Гэту спадзею Сын Божы даў.

---

## 113./100. б [2]) ВЕЧНАЯ ЗГОДА.

(Мэлёдыя № 100/а).

1. Вечная згода па барацьбе,
Раньніца міла па прыкрым сьне,
Будуць напэўна чакаці нас,
Як праміне́цца зямны наш час.

2. Радасьць заменіць сум і тугу,
Шчасьцем напоўніць Божу слугу,
Слава па ганьбе зьменіць жыцьцё,
А па адчаю дабра — быцьцё.

3. Жар і сьпякота зьменяцца ў цень,
Па прыкрай ночы вясёлы дзень,
Стане палёгка, радасьць, спакой,
Долю спаткаем там прад сабой. —

4. Вечная згода па барацьбе,
Грэшнікі ласку возьмуць сабе,
Праз пакаяньне надзею даў
І што ўваскрэсьнем Бог абяцаў!

---

## 114. КАЛІ ЎЖО СКОНЧЫЦЬ ЦЯРПЕЦЬ НАРОД.

1. Калі ўжо скончыць цярпець весь народ —
Неба вароты адчыніць нам ўход,
Божы Збавіцель, і Ён толькі Сам
Нам вечнай радасьцяй станецца там!
(Прыпеў:) Будзе ў той час радасьць у нас,
Будзе той час песьняй у нас —
(2 разы): (: Як да Хрыста нам адчыніцца ўход! :)

2. Як Бог нам ласкава грэх дараваў —
Кліча да неба, з якога прагнаў:
Божы Збавіцель, і Ён толькі Сам
Там шчаснай доляю станецца нам!
Будзе ў той час і г. д. —

3. Як нас разьмесьцяць па неба палям, —
Кожны абнімецца з прыяцелям;
Аднак Збавіцель-Хрыстос толькі Сам
Наймільшы прыяцель будзе ў нас там!
Будзе ў той час і г. д. —

---

## 115. СЬПІ ЦІХА, СЬПІ!

(Над магілай хрысьціяніна).

1. Сьпі ціха, сьпі, гаротны сын зямлі:
Ужо аканчыў шлях ты свой зямны,
З табой ня пойдзе ў сьветлу неба даль
Ні сум, ні боль, ні жаль!

2. Апошні раз цябе провадзім мы,
Але мы знаем, што шчасьлівы ты,
Бо ўжо лунáеш духам ты цяпер
Паміж нябесных сфэр!

3. Сьпі, дружа, сьпі, жыцьця ты скончыў бой,
Прыйшоў да мэты, век пражыў ты свой,
А мэтай той — Ацец Твой, Госпад Бог,
ў Яго цяпер Ты ног!

4. У Бацькі доме маеш ты спакой,
Дзе ёсьць з табой Хрыстос—Збавіцель Твой,
Дык шчасьця і славы вянок цяпер
Хрысту ты ўжо павер!

---

## 116. ПУСЬЦІ, О БОЖА!

(Народная).

1. Пусьці, о Божа, з зямелькі гаротнай —
Служку спакою, служку Тваёй волі;
Досіць пакуты мізэрнай, маркотнай,
Дай ласк пацеху нябеснай патолі!..

2. Напрацаўся і нагараваўся —
Што нехватала часта хлеба, солі;
Досіць бяды мне, сівым дзедам стаўся,
Пусьці, о Божа, з земскае нядолі. —

3. Пусьці з зямелькі, Божа літасьцівы, —
Я за грахі тут працярпеў даволі,
Досіць нажыўся, ўжо і волас сівы, —
Будзь міласьцівы грэшніку ў няволі!



## 117. ПОМНІ ЧАЛАВЕЧА!

(Старáя песьня).

„У поце аблічча свайго будзеш спажываць хлеб свой аж навéрнешся да зямлі, бо з яе ты выняты, бо ты ёсьць парахня і ў парахню абернешся!“ — (Майсея раздз. II.19.).

1. Помні, чалавеча, як жывéш на сьвеце —
Ты ня будзь так горды, поўны пыхі, цьвёрды
У думках.
2. Аткрый добра вочы, бач удзень і ўночы:
Зробіцца нек жутка, забярэ сьмерць хутка
Кожнага. —
3. Сьмерць царóў пазносіць і папежаў косіць,
Князёў забірае, біскупаў ганяе
Ў магілу.
4. Ваявóдаў з бою прывядзè да гною,
Гэтманаў з булавай паложыць на лаву
Хаўтурну.
5. Іх служкаў грамáды не дадуць ёй рады,
На варце салдаты ня ўпільнуюць хаты
Ад сьмерці. —
6. На кулі, на скалы, — на муры, на валы,
На гарматы сьмела, толькі-б захацела —
Сьмерць ідзé!
7. І галаварэзаў, і стральцóў з жалеза
Сьмерць косіць бяз бою лепш сваёй касою,
Чым стрэльбай.
8. І панóў іхмосьці запрашае ў госьці,
І судзьдзяў з краўцамі і ксяндзóў з шаўцамі
Зраўняе. —
9. Студэнтаў з вучэльні забраць рада вельмі,
І мудры тэолёг і быстры тэхнолёг
Заціхне. —
10. Нічога ёй лекар, нічога аптэкар,
Ніц ёй грошы купа, сьмярóтная згуба
Засыпле. —

11. Адвакат — прайграеш! Музыкант прайграеш!
Юрыста з кнігóю, музыку з дудóю
Сьмерць бярэ.

12. Шынкары, карчмары, купцы і ліхвяры,
З вечара і зраньня ходзяць, як за паняй,
За ёю.

13. І да вас, дзяўчаты, сьмерць ідзе у свáты,
Буднем ці ў нядзелю, спраўляе вясельле
Ня міла. —

14. І малыя дзеткі сьмерць рве, быццам кветкі,
Потым і самога бацьку маладога
Сьмерць возьме...

15. Бедныя мяшчане, парабкі, сяляне!
Сьмерць і вас чакае — неперабірàе
І вамі.

16. І сацыялісты, роўна камуністы!
Сьмерць на вас з работы, з вялікай ахвотай
Чакáе.

17. Ай, Божа наш, Божа! Хай Твой Дух паможа
Сьмерці небаяцца, а Табе аддацца
Навекі!

---

## 118 О, ШЧАСНЫ ДЗЕНЬ СПАКОЮ!

1. О, шчасны дзень спакою,
Пяяньняў дзень сьвятых;
Духоўнага настрою,
Дзень тхненьняў незямных!
Я сёньня ўсей душою
Адчую мілу весьць
І гымн пяю з хвалою:
Будзь Сьвятой Тройцы чэсьць!

2. Стаў бліск сьвятла ў дню гэтым,
Як Бог сусьвет стварыў,
ў дню гэтым перад сьветам
Хрыстос нам зноў ажыў;

Сваіх калісьці вучняў
Хрыстос нам астаўляў,
Дык ім Сьвятога Духа
У гэты дзень праслаў. —

3. І сёньня нас дзен гэты
Адухаўляе зноў
І абвяшчае сьвету
Той скарб Хрыстовых слоў.
Зноў сёньня заранiца
Тых слоў нам заіскрыць, —
І выплыве крыніца
Для душ, што хочуць жыць!

4. Ў сьвяты дзень супачынку
ўспакóіцца душа,
І блісьне на часінку
Нам кáяньня сьлязà.
Няхай пачнé тым гімнам
На цэлы сьвет грымець
Хвалá ў Хрыста Сьвятыні:
„Будзь Сьвятой Тройцы чэсьць!“

А м э н.

---

## 119. ЗЕМЛЯРОБЕ ПАСЬПЯШЫ.

(Для гаспадароў, на „багача“ у восень).

1. Земляробе, пасьпяшы,
Ты з падзякай ад душы,
Дзень свае ўжо працы змог!
Бо сам Бог табе памог!
Пакуль ўбеліць сьнег зямлю —
Кончыў н!ву ты сваю
Дык з падзякай ад душы, —
Сёньня ў Божы дом сьпяшы!

2. Божым полем — цэлы сьвет,
З душ людзкіх ягоны цьвет,
Дабрадзейнасьці плады
Богу трэба даць тады:
Каб зьвязьці больш збожа ў дом —
Сеяць добрым трэ зярном;
Божа! нас Ты ў ласцы мей,
ў сэрцы нам зярняты сей!

3. Сам зярнят тых сьцеражы,
Каб ўраджай быў — прыкажы;
Дні пагодныя ссылай,
Ласк расою асьвяжай,
Ажно стане красаваць,
Ніва сьвету пасьпеваць;
Аж, нім прыдзе сьмерці гром
ўсё у Твой мы зложым дом!

Амэн.

---

## 120/73 АПОШНІ СЬВЕТ СОНЦА СТУХ.

(Мэлёдыя як № 73: „Зорка з неба“).

1. Ўжо апошні за гарамі сьвет ад сонца стух.
Спасе-Божа, Ты будзь з намі падтрымай наш дух!
Пад паветкай цемры ночы людзі сьпяць ў грахох..
Нас сваёй, Хрысьце, апекай атулі ўва снох!

2. Пастушкі ўжо пояць стады, што ідуць дамоў,
Вод жывых Тваіх прынаду даць нам прыгатоў!
Дык прыдзі к‘нам і пацеш нас — грэх разьбі на пух,
Хай абніме нас апекай àнял — Божы Дух!

3. Абкружыла ўжо зямельку чорна, цёмна ноч...
Сільны вораг націскае — нам стрымаць ня
ўмоч —
Як пачне ён ў нашым збожжы рассыпаць
куколь:
Ня пусьці яго к'нам, Божа, абярні ў вуголь!—

4. Спаглядае ў край наш родны з неба зорак рой,
Ціху ноч і сон спакойны дай мне, Божа мой!
Ты Магутны — адганяеш сумны мары, жах, —
Божым Духам напаўняеш нашы сэрцы ў снах!

5. Ўжо апошні за гарамі Сьвет ад сонца стух:
Спасе-Божа, будзь Ты з намі — падтрымай
наш дух,
Бо, калі ўжо нас абніме вечны сьмерці сон,—
Дух Твой, Божа, не пакіне бацькаўскіх
старон! —

---

## 121. а) СЬВЕЦІЦЬ ЗОРКА-ЗАРАНІЦА.

(Ранічная песьня).

1. Сьвеціць зорка-зараніца —
Богу чэсьць дае́ зямліца,
Славіць Бога ўсякі можа; —
Чэсьць Табе, Вялікі Божа!

2. Я-ж, бо створаны Табою,
Злучаны жыцьцём з зямлёю —
Ці-ж такі нягодны быў-бы,
Каб Цябе я не хваліў-бы?

3. Чуць пратру заспаны вочы,
Ўстаўшы зосну посьле ночы,
Богу чэсьць зноў пасылаю,
Бога ля сябе шукаю.

4. Ўчора шмат людзёў заснулі,
Сьмерць прышла — і не пачулі, —
Мы яшчэ маглі устаці,
Каб зноў Богу чэсьць аддаці.

5. Славіць Бога кожны можа,
Чэсьць Табе вялікі Божа!
Мы з Тваёю згодны Воляй,
Надары нас добрай доляй!

---

## 122. б) А ЯК ДЗЕНЬ УЖО МІНАЕ.

(Вячорная песьня).

1. А як дзень ужо мінае,
Кожны з нас не забывае
Чэсьць аддаць з падзякай Богу
За прабыту ў дзень дарогу.

2. Нашы ўсе за дзень работы
Богу мы нясём з ахвотай —
Павядзі нас, Добры Божа!
Хай Твой Дух нам дапаможа!

3. А калі засьнем у ночы, —
Хай Твае наглянуць вочы,
Сьцеражы наш сон ад злога,
Барані нас ад ліхога!

4. Як здаровы зноў прачхнемся,
Рана працаваць вазьмемся, —
У духу, праўдзе і прыгожа
Аддамо Табе чэсьць, Божа!

5. Ня пусьці нас саграшыці,
Памажы нам добра жыці,
Каб ня згінула збаўленьне
Для людзкога пакаленьня!

---

## 123. а) ЗЬНІКНУЎ ЯСНЫ СОНЦА СЬЛЕД.

1. Зьнікнуў ясны сонца сьлед,
ў цемры ночы тоне сьвет,
Мысьль ідзе да тых старон,
Дзе зіяе Божы трон,
Дзе Бог царыць!

(Прыпеў): Ты, Сьвяты, Магутны Го́спад і Бог
Неба і зямля Табе,
Служаць, чэсьць даюць Табе,
Ты Бог — Цар наш!

2. Вось пакуль нас возьме сон —
Хо́чам, каб Твая далонь
Супакой душы дала́,
І спадзею прынясла́
Аж ноч міне!
Ты, Сьвяты і г. д. —

3. Скінь зло з нашае страхі —
ўсе праступкі і грахі,
Ласку Ты нам пакажы,
Барані і сьцеражы;
Мы молімся!
Ты, Сьвяты і г. д. —

А м э н.

---

## 124. б) СОНЕЙКА ЗЬНІКАЕ.

1. Сонейка зьнікае сьлед,
ў цёмнай ночы гіне сьвет,
Мысьль ляціць да тых старон,
Дзе ясьнее Божы дом —
Дзе Бог жыве!

(Прыпеў): Сільны, несьмяротны Госпад і Бог
Неба і зямля Цябе
Сла̀віць, мо́ліцца Табе,
А Божа наш!

2. Хочам, як паляжам спаць,
Дабрату Тваю пазнаць.
Ты спакой душы даеш
Ды спадзею добру шлеш —
Аж пройдзе ноч!
Сільны, несьмяротны і г. д. —

3. Шлі спакой да нашых стрэх,
Адпусьці віну і грэх,
Ласку нам сваю пакаж,
Бо Ты Добры Бацька наш;
Мы просімо!
Сільны, несьмяротны і г. д. —
Амэн.

---

## 125. ДАЙ НАМ, БОЖА! (на хор).

(Народная гаспадарская, навагодная.)

1. Дай нам, Божа, добры час:
Як усюды так і ў нас —
Дый шчасьліву часіну
Разьвяселіць радніну.
(Прыпеў:) Ай, ды, ну; ай, ды, ну —
Разьвяселіць радніну!

2. Ўсюды мова ў нас адна,
ўсюды песьня та сама́,
Дый Хрыстос усім аднак:
Кожны з Богам — нам сваяк!
Ай, так-так; ай, так-так,
Кожны з Богам—нам сваяк! —

3. Дай нам, Божа, добры год —
Ашчасьліў наш весь народ:
Хай уродзіць збожжа нам, —
ўсюды, ўсюды — не сям-там!
Не сям-там, не сям-там,
Хай уродзіць збожжа нам!

4. Ўсюды песьня та сама́ —
Дый малітва ў нас адна,
Дый Хрыстос усім аднак,
Хто з Хрысто́м, той нам сваяк!
Ай, так-так; ай так-так,
Хто з Хрыстом, той нам сваяк!

---

## 126 Ў СЬВЕТ ІСЬЦІ!

1. Ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, людзям праўду нясьці,
Эвангельля сьвятло ў цемру ўсім разьнясьці!
Госпад наш прыказаў, дык ідзі хто куды —
Сам Хрыстос Госпад Бог кліча вас на труды,
Кіньце дом ды свой быт, ў сьлед Яго трэ пайсьці,
Ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці!

2. Ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, ўсіх людзей варушыць,
Сілай слоў—слоў Хрыста ад грахоў адвучыць,
Вас ня страшыць грымот, ні жуда у бядзе,
Ані буры, бо вас Сам Хрыстос павядзе!
Слугам верным сваім помач рад прынясьці,
ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці!

3. Ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, каб людзкі боль лячыць,
Супакой рассяваць, каб лягчэй стала жыць,
Каб любоў пашыраць, веру каб узмацняць,
З гэтым вас хоча ў сьвет Сам Хрыстос пасылаць,
Бо праз вас можа там шчасьце, доля цьвісьці—
ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці, ў сьвет ісьці!

---

## 127. К ПРАЦЫ ЎСЕ.

1. К працы ўсе, к працы ўсе, так як Бог
прыказаў,
Мы пайдзем, дзе Хрыстос працы шлях
паказаў.
Дух Сьвяты ад Яго будзе нам памагаць,
Веру, сілу, жыцьцё кожны дзень аднаўляць.
(Прыпеў): (: К працы ўсе, к прыцы ўсе :) (2 разы).
Праца корміць сьвет, збавіць нас ад бед,
Пакуль не ўгледзімо Хрыста.

2. К працы ўсе, к працы ўсе, станьма ў кожнай
пары,
Хто засьмягшы, хутчэй жыцьця воду бяры,
Адкупленьня крыжом трэба нам даражыць,
І расьпятым Хрыстом шчасну долю здабыць!
(: К працы ўсе і г. д. :)

3. К працы ўсе, к працы ўсе, многа ў сьвеце
бяды,
Шлях зла, цемры вядзе нас зусім ня туды,
Дзе мы Бога Айца славіць будзем да сьлёз,
Дык пяем Яму гымн: што нас збавіў Хрыстос!
(: К працы ўсе і г. д. :)

4. К працы ўсе, к працы ўсе — за Хрыстом мы
усьлед,
Нас нябесны Ацец абароніць ад бед,
Да Сябе забярэ, да высокіх нябёс;
Будзе з намі навек неразлучна Хрыстос!
(: К працы ўсе і г. д. :)

---

## 128. ВЕРА СТАРЫХ ПРОДКАЎ.

1. Вера ў нас продкаў старых жыве
ў мурах вастрожных, у крові, ў вагні!
Гэтае слова: вера ў Хрыста,
Нас паднімае ў сьветлыя дні!

(Прыпеў): О вера продкаў скарб ты наш,
Мы абаронцы, мы твая страж!

2. Продкі ня раз ішлі на сьмерць —
Клалі жыцьцё за веру ў Хрыста;
Шчасьлівы дзеці, якім ў-ва сьлед
Час ўжо падобнай сьмерці настаў!
О вера продкаў і г. д.

3. Вера ў нас продкаў старых вучы:
За праўду Божу крэпка стаяць,
Каб ўсьлед за продкам кожны з нас мог
Праўду Хрыстову ўсім рассяваць!
О вера продкаў і г. д.

4. Вера ў нас продкаў старых жыве:
ў мурах вастрожных, ў крові, ў вагні —
Дык мы праз слова: вера ў Хрыста,
Кажам, што прыдуць лепшыя дні!
О вера продкаў і г. д. Амэн.

---

## 129. ЯК ХРЫСТА ЖАЎНЕРЫ.

1. Як Хрыста жаўнеры — Хрысьціянскі люд,
За Хрыстовым сьледам йдзі ў баёвы труд!
Йдзі жаўнер наперад сьмела супроць злу,
Крыж—твой сьцяг ў дарозе разжане́ імглу,
(Прыпеў): Дык Хрыста жаўнеры йдзеце сьмела ў бой,
За Хрыстом сьпяшэце, як за маткай рой!

2. Грозны злога сілы стануць уцякаць,
Як наш сьцяг крыжовы будзе ім блішчаць,
І на сьвеце ўсюцы згіне грэшны бруд,
І пабедну песьню запяе ўвесь люд!
Дык Хрыста жаўнеры і г. д.

3. Як палкі магутны сьмела ў бой пайдуць —
Сьмерці не баяцца — за Хрыстом ідуць,
А любоў Хрыстова дасьць нам многа сіл —
Ворагаў пагрозу разнясем у пыл!
Дых Хрыста жаўнеры і г. д.

4. Распадуцца ў грузы троны ўсіх цароў,
А Хрыстова вера будзе век вякоў:
„Не прамінуць словы“... Ён калісь сказаў,
Гэтакую пэўнасьць сам Хрыстос нам даў!
Дык Хрыста жаўндры і г. д.

Амэн.

## 130 ЧЫСТЫ ВЕРЫ НАШ СЬЦЯГ.

1. Чысты веры наш сьцяг возьме кожны той,
Кім кіруе сам Хрыстос!
Як шчасьлівы ёсьць той, хто адважна свой
Сьцяг праз труд і боль панёс!

(Прыпеў): Мы ідзем уперад!
Ідзе прад намі сам Хрыстос!
Дружна пойдзем ў бой, ў труд цяжкі той
Паднімем у гару сьцяг свой!

2. Як рады ўсе свае вораг ў бой запрог
Дык трымай адважна сьцяг!
З намі Іммануіл — ворага Ён змог —
Дый вядзе на праўды шлях!
Мы ідзем уперад і г. д.

3. За марамі ажно да канцоў зямлі —
Чысты сьцяг нясем Хрыста!
Сьцяг зазіхаціць, як сонца на ральлі, —
Каб усюды сьвет настаў!
Мы ідзем уперад і г. д.

4. Ноч праходзе ўжо нам—вось віднее дзень, —
Родная зямля, ўставай!
Бач, вось з намі, Хрыстос разганяе цень,
Шле свой сьвет усім — сьпявай!
Мы ідзем уперад і г. д.

## 131. ЧАМУ-Ж ВЫ НА РЫНКУ ПАСТАЛІ?

1. Чаму-ж вы на рынку надарма пасталі,
Як Госпада шырыцца дзела?
Сьпяшэце хутчэй-жа — пары дачакалі —
Ідзеце да Госпада сьмела!
(Прыпеў): (: Сьпяшэце! а вамі задзівіцца сьвет —
Пашану аддасьць ад мінуўшых аж лет :)

2. Чаму апушчаць свае хочаце рукі,
Як бура пануе і сьцюжа?
Як сьвет поўны зьдзеку, махлярства і мукі?
Трымайце-ж Хрыстова аружжа!
(: Сьпяшэце! а вамі і г. д :)

3. І сёньня Хрыстовыя дзеюцца цуды,
Цудоўныя творацца зьявы —
А Госпад бароніць ад крыўды, аблуды, —
Зло зьнішчыць для Божае справы!
(: Сьпяшэце! а вамі і г. д. :)

4. Трымайцеся — выдзержаць мусім дый трэба!
Ходзь сэрца ў баю замлявае —
Ня прыдзе нам помач у працы ад неба,
Хто Божага гарту ня мае!
(: Сьпяшэце! а вамі і г. д. :)

5. Дык Госпад зноў кліча ўсе чыста народы —
Бог нову пару пачынае:
Час ласкі мінае, настаў час свабоды —
Што Госпад нам прыпамінае!
(: Сьпяшэце! а вамі і г. д. :)

## 132 ХРЫСЬЦІЯН МІЛЬЁНЫ.

1. На погляд бачым хрысьціян мільёны,
Што ў недаверстве крые цемра іх,
Хто-ж з Божым Словам у нашыя загоны
Пойдзе запальваць веру у-ва ўсіх?
(Прыпеў): (: Хрыста магутнасьць вяліка, :)
Толькі Ён людцаў бедных збавіць можа,
Дай пашыраць веру, Божа!

2. О, слугі Божы ўсіх канцоў зямліцы,
Хай вас паганцаў ня пужае сьмех!
Вы ня мінайце іхнія цямніцы,
Змагайце цемру, змагайце і грэх!
(: Хрыста магутнасьць і г. д. :)

3. Ў крывавай працы пасярод змаганьня
Кідайма зёрны слаўных Божых слоў.
Аж дух прачхнецца, ажно сэрца ўстане,
Каб заясьнела Эвангельле зноў!
(: Хрыста магутнасьць і г. д. :)

4. Дзянёк пабеды, мы цябе чакаем,
Калі аддасца ўвесь Хрысту народ!
Каб гэта споўніць, страху мы ня знаем,
Ах споўні, Божа, збаў людзкі ўвесь род!
(: Хрыста магутнасьць і г. д. :)

---

## 133. ДАЙ, БОЖА, ДУХА АЙЦОЎ ВЕРЫ!

1. Дай, Божа, духа айцоў веры,
Калі трымалі на Сыоне сьцяг
І праўдзе адчынялі дзьверы,
Змаганьня сьмела шырылі размах.
Дай, каб дух гэты ажывіў сыноў,
Каб мы Тваіх лепш пільнавалі слоў!

2. Хай Твой агонь так заярчэе,
Каб на апошні сьвету бліснуў край!
О, Божа, ніва ўжо бялее,
Да гэтай працы рук рабочых дай!
Шлі помач Сам, Ты памагаць нам рад,
А нас працоўных мала, — жніва шмат!

3. Бо Сын Твой Сам калісь прыказваў
На сьвеце вучням, каб маліць аб тым,
Наведай, Божа, сьвет няшчасны,
Каб адраджэньня дух збудзіўся ў ім!
Мы просім, Божа, Ты наведай нас,
І шлі ўсім людзям прабуджэньня час!

4. Эвангелістаў многа лікам
Дай, Божа, сільных мовай слоў Тваіх,
Ўзмацуй прад ворагам вялікім,
Каб, злога зьбіўшы, гналі грэх ва ўсіх!
Няхай праціўных будзе што раз менш,
Хай славе Божай людзі служаць лепш!

5. Прышлі з Сыону дзень збаўленьня
І споўні, што калісь Ты нам сказаў:
Вясьці людзей да адраджэньня,
Бо чалавек ад зла збутвелы стаў!
Хай Дух Сьвяты Твой помач ўсім прышле,
Тваёй-жа славы час хай настае!

---

## 134. ДА ПРАЦЫ БРАЦЬЦЯ!

1. Да працы, брацьця, стань, хто жыў,
Бог сёньня, кліча нас да жніў,
І жаць нам кажа збожжа Ён,
Жанцоў заве са ўсіх старон.
Дык нам пара да працы ўстаць,
Калосьсе бліжніх душ зьбіраць,
А памятайма ў кожны час
Што Бог на тое склікаў нас!

(Прыпеў): Гляньце, ўжо пара прыйшла —
Кліча Бог да жніва;
Рукі млеюць, а з чала
Пот ліецца жыва!
Так ляціць жыцьця ўвесь час,
Хутка надарыць Бог нас,
Хутка, хутка надарыць Бог нас!

2. А хоць так цяжка ў працы той —
Няхай жанцоў жне цэлы рой,
Хай з працы не баліць далонь,
Хоць смага смаліць, як агонь,
І хоць грыміць і віхар гне, —
Ня зойдзем з поля мы, ай—не!
Трымаймася, каб дух ня ўпаў,
Бо нас сам Бог сюды прызваў!
Гляньце і г. д.

3. Да працы, брацьця, стань, хто жыў,
Міне пара ўжо зараз жніў,
Хоць сілы стануць нам слабець,
Нагараду вечну будзем мець:
Здалёку наш вянок блішчыць,
З якім мы вечна будзем жыць,
Хто свой вянок ў дажынкі нёс
Яго пасьвеньціць сам Хрыстос!
Гляньце і г. д.

---

## 135. ВЕРНЫЯ Ў СЛУЖБЕ ЖАЎНЕРЫ.

1. Верныя ў службе жаўнеры мы Бога,
Хочам ў радох Яго дружна стаяць,
ў баю нам крывавым згіне трывога —
Сьмела змагацца, сьцяг сільна трымаць!
(Прыпеў): Сьцяг наш паднімем, трубы заграюць,
Песьняй сьвятою хай грудзі грымяць,
Сьмела адвагі ў бой дадаваюць,
Божы жаўнеры ўмеюць ваяваць! —

2. Вера, любоў змацуе нас і стопіць,
Сьцяг наш ў магутныя рукі вазьмем,
Ворагам куляў на доўна ня хопіць,
З ляўраў на голаў вянкі мы спляцем!
Сьцяг наш паднімем і г. д. —

3. Госпадзе Божа! Ты сваім жаўнерам
Сілу з адвагай можаш, дараваць,
Ласкаю Ты нам паможаш бяз меры,
Вораагаў, нашых злыдняў зваяваць! —
Сьцяг наш паднімем і г. д —

Амэн.

---

## 136 ХАЙ ПАРАДУЮЦЦА СЭРЦЫ.

1. Хай парадуюцца сэрцы,
Хай жыве падзяка ў іх,
Бог нас на руках уласных
Носіць, як дзяцей сваіх. —

(Прыпеў): Нам так радасна і міла,
Сонца ясна сьвеціць нам,
Мы прыбранаю жыцьця дарогай,
Да нябесных ўвойдзем брам! —

2. Бог Ацец вядзе за руку
І бароніць ад трывог,
Сьцеражэ, каб мы ніколі
Ня зышлі з Яго дарог. —
Нам так радасна і міла і г. д. —

3. Як мы ад Яго адходзім, —
Нас абкружыць цемра зноў;
Дык мы зноў к'Яму прыходзім, —
Слухаць кожны зноў гатоў! —
Нам так радасна і міла і г. д. —

4. Дзеткі Божыя шчасьлівы,
Бог іх шчодра надарыць,
Дык нам слухаць трэба шчыра,
Каб заўсёды з Богам жыць! —
Нам так радасна і міла і г. д. —

---

## 137. МОЙ ПАСТЫР ХРЫСТОС.

1. Мой Пастыр Хрыстос! Мне радасьць ісьці,
Бо хоча мне Ён апеку нясьці.
Свае Ён авечкі бароніць, пасе —
На ніву зялёну кіруе усе!

2. Бароніць мяне нябесны мой Цар,
Ён радасьць мне дасьць, адгоніць боль, жар.
Ён дасьць мне з жывóе крыніцы напой!
Грахі мне адпусьціць, бо Ён Пастыр мой!

3. Ён ўночы і днём паможа ўсім нам,
Як нас сьцерагчы, Ён ведае сам.
Хрысьце, мой Ты Божа! Вядзі, не забудзь,
Праз цэла жыцьцё Ты мне—пастырам будзь!

---

## 138. ХОЧА ХРЫСТОС.

(Песьня для дзетак.)

1. Хоча Хрыстос з нас зрабіці
Зоркі праменьчык свой,
Каб ён для ўсіх мог сьвяціці —
Дый зьнішчыць цемры рой!
(Прыпеў): Праз Бога-Хрыста я
Хóчу сьвяціць, як праменьчык,
Праз Бнга-Хрыста я
Хóчу праменьчыкам быць!

2. Хо́ча Хрыстос нас вясельлем
I шчасьцем надарыць, —
Дзеткам здаровым і кволым
Зо́ркай на небе быць!
Праз Бога-Хрыста я і г. д. —

3. Калі Ён Сам асьвячае
Зоркаю той каго,
То кожны гэта пазнае,
Што ёсьць дзіця Яго!
Праз Бога-Хрыста я і г. д. —

4. Быццам праменьчык Хрыстовы,
Зо́ркай сьвяціць хачу, —
Аж пакуль ў неба край новы
Я згэтуль адлячу! —
Праз Бога-Хрыста я і г. д. —

## 139. БАЧУ ЎСЮДЫ.

1. Ба́чу ўсюды, спазіраю,
Віджу, як прыгожы сьвет, —
А Божа Ты мой!
Ясна сонейна зіяе,
Мілы запах сее цьвет.
ўвакруг мянѐ, як-бы ўва сьне,
Хараства́ шмат бачу,
Дзён жыцьця ня трачу,
Вясёла ў сэрцы мне!

2. Знаю, што мяне вясѐліць,
Што красы так бачу шмат,
А Божа Ты мой!
Ты ў жыцьці мне шлеш спадзеі,
Робіш, што з вясны ўсяк рад;
Праз жыцьцё Ты сьвеціш мне!
Ты, бы ясна сонца
Сьвеціць у ваконца,
Вясёлкаю блісьне́! —

## 140. КАЛІ ТЫ ЗБАВІШ, БОЖА?

1. Калі Ты збавіш, Божа,
Наш чалавечы род?
Ня трон, цароў і бэрлы,
А бедны той народ?
Тваіх ён думак цьвет і пень,
Няхай ня счэзьне, быццам, цень;
Яго насьледзтва — шэры дзень!
Народ збаў, Божа!

2. Ці грэх хай грэх ўсё родзіць?
Ці моц для моцных ёсьць?
Ці то Твая ёсьць воля,
Каб ім была ўсё ноч?
Не! Кажа шчыт высокіх гор:
Зазіхаціць зямлі прастор,
І згодны сьпеў пайдзé да зор'
Народ збаў, Божа!

3. Калі ўжо збавіш, Божа
Людзкі няшчасны род?
Народ Твой, Божа, род Твой,
То не цары — народ!
Збаў род наш, Божа, ён ёсьць Твой,
Так сама, як ȁнялаў рой,
Зьнімі грахі, дары спакóй!
Народ збаў, Божа!

Амэн.

---

## 141. ЛЮДЗІ У ЦЕМРЫ,

1. Людзі ў цемры ўсё прабываюць,
Грэх і нядоля іх прыціскаюць,
Хай ім сьвятая міласьць паможа,
(: Гóспадзе, Божа! :)

2. Дзе ні пагляну, сьвет Божы — цудам,
Толькі пакрыты людзкім ён брудам;
Але Ты жаль мой пачуеш можа,
(: Госпадзе, Божа! :)

3. Ўсе мы ў грахоўну ўпалі няволю,
Мусім аплакваць гэту нядолю,
Ах, дай зьвярнуцца нам з бездарожжа,
(: Госпадзе, Божа! :)

4. Дай нам больш сілы жыць у пакуце,
Згубу і ліха ўсё абмінуці,
Хай нас нячыста сіла ня зможа,
(: Госпадзе, Божа! :)

5. Цэлу спадзею ад Бога носім,
Жыць пад апекаю Божаю просім —
Дзеці пакорныя, кожны як можа,
(: Госпадзе, Божа! :)

## 142. ЦЭЛЫ СЬВЕТ — БОЖЫ УРАДЖАЙ

1. Цэлы сьвет — ёсьць Божы гоні,
А куколь паўсходзіў ў нас,
Што паганыя далоні
Раскідалі ў цемры час;
З ім пырэй і малачай —
Нішчаць Божы ураджай!
Дык удзень мы і ўначы
Мусім ніву сьцерагчы,
(: Сьцерагчы, сьцерагчы :)
Аж да сьмерці — кожны знай,
Каб рос Божы ураджай!

2. Божа, Ты Сваім прыказам
Ніву нам Сваю павер —
Мы куколь зьбярэм і зьвяжам,
Што разросся ў нас цяпер,

Не баімося трывоґ,
Бо нам памагае Бог!
Будзем ніву ачышчаць
І куколь з карэньнем рваць,
(: Вырываць, вырываць, :)
Хоць-бы сьмерць прышла—няхай
Будзе Божы ураджай!

3. Але Ты нам, Божа, кажаш
Не чапаць куколь у нас —
Вырвеш Сам яго і зьвяжаш,
Як прыдзе на жніва час.
Чыста збожжа будзем жаць,
А куколь ў агонь кідаць,
Дык весь спаліцца куколь,
Аж на попел, на вуголь;
(: На вуголь, на вуголь, :)
Сьпеў дажынак ў сьвет пушчай,
Што ўжо чысты ураджай!

---

## 143. ЖЫВЕ НАРОД Ў ЯРМЕ.

(Мурынскі матыў).

1. Жыве Ізраіль у ярме,
ў народзе плач —
Есьць хлеб няволі, сьлёзы лье,
ў народзе плач!
(Прыпеў): Майсей ідзі, к' Фараону ідзі,
Скажы: „так хоча Бог,
Пусьці народ!“

2. Табе так кажа Бог і Спас, —
Вядзі народ!
З ярма Ён павядзе ўсіх нас, —
Вядзі народ!
Майсей ідзі і г. д.

3. Ня будзе енчыць і цярпець,
Вядзі народ!
Бяды і сьлёз ня будзе мець —
Вядзі народ!
Майсей ідзі і г. д.

## 144. НАДОЙДЗЕ ЧАС.

1. Надойдзе час, што людзкі род
Змагацца з цемрай будзе рад:
Багату веду будзе мець
Зазіхаціць яго пагляд.

2. Спакойны, добры будзе ён,
Крыві ня будзе разьліваць,
Ён лёгка будзе тайніцы
Зямлі і мора адсланяць.

3. Краі, народы злучацца,
Каб вечна ў вольнай згодзе жыць,
Людзей мільёны ад душы
З крыніцы брацтва будуць піць.

4. Разбагацеюць мастацтвá,
Прыгожы стане песьняў тон,
Тагды Хрыстовы ўстане род,
І Божа Царства створыць ён!
Амэн.

## 145 в) БУДЗЬЦЕ З БОГАМ.

(Гл. матыў-мэлёдыю 6, пес. № 8).

## 58.*/2 О НЯ БЛУДЗІ Ў ЖЫЦЬЦІ ДАЎЖЭЙ!

1. О ня блудзі ў жыцьці даўжэй—
Пайдзі у Бацькаў дом хутчэй,
Вярнісь да Бацька ў дом!
Там ўсю бяду жыцьця злажы,
Любоў сыноўску пакажы —
Ліць сьлёз ня будзеш ў ём!

(Прыпеў:)

Пайдзі, пайдзі, нядолі там міне ўжо час,
Пайдзі, пайдзі, Бог кліча і чакае нас!

2. О, блудны сын, барджэй паслыш:
Апомнісь, глянь вачыма ўзвыш,
У родны дом вярнісь!
Цябе чакае Бацька твой,
Сьпяшы і ход свой ты падвой
На Бога падзівісь!

(Прыпеў:)

Пайдзі, пайдзі, хоць паварот цяжкі табе
Пайдзі, пайдзі, Бог прыйме ласкава цябе!

3. Пайдзі! І мы з табой пайдзем,
Мы шчасьце вечна там знайдзем —
Багаты Бацькаў дом;
Там ёсьць Збавіцель наш і твой,
Ён шчасьце дорыць нам з табой
Там рай нам будзе ў ём!

(Прыпеў:)

Пайдзі, пайдзі, жыцьця цяжар там зложыш свой,
Пайдзі, пайдзі, цябе абніме там спакой!

4. Пайдзі, пайдзі, Бог — Бацька твой,
Цябе акружыць шчасьця рой!

Сарві са сьветам злым,
Збавіцелю руку падай,
І палюбі, і абнімай —
Ён Спасам ёсьць тваім!

(Прыпеў:)
Пайдзі, пайдзі, к'Збавіцелю барджэй сьпяшы!
Пайдзі, пайдзі, цябе Ён любіць ад душы!

---

## 103*/2. НЯ ЗНАЮ, ШТО ПАКАЖА ДЗЕНЬ.

1. Ня знаю, што пакажа дзень,
Але я не баюсь,
Мяне хавае крыжа цень,
Табе, Хрысьце, малюсь.
(Прыпеў): Дык я, Хрысьце, хачу чакаць —
Пакуль аж будзеш кіраваць
Ты Сам зямным жыцьцём маім, —
Дасі мне помач ува ўсім.

2. Ня знаю, што дзень прынясе,
Але ўжо знаю я,
Мяне шчасьліва павядзе,
Хрысьце, рука Твая.
Дык я, Хрысьце, і г. д. —

3. Ня знаю, што дзень прынясе —
Ці радасьць, ці сьлёз шмат,
Твая любоў мяне вядзе,
Ты памагчы мне рад.
Дык я, Хрысьце, і г. д. —

4. Ня знаю, што дзень прынясе
Сярод жыцьця трывог,
Але жыцьцё мяне нясе
Туды, дзе Ты, — мой Бог!
Дык я, Хрысьце, і г. д. —

---

## 146. СЬВЯТЫ БОЖА!

1. (: Сьвяты Божа! Ўсемагутны!
Божа наш несьмяротны!
Зьлітуйся над намі! :)

(Можна і гэтак: 3 разы пастар ці заступнік і 3 разы зграмаджаныя).

2. (: Ад вайны, зараз, голаду, пажараў
Барані нас, Божа! :)

(2 разы — 1 пастар і 1 зграмадж.).

3. (: І ад наглае й няжданае сьмерці
Сьцеражы нас, Божа! :)

(2 разы—таксама)

4. (: Мы грэшныя, мы, з пакораю просім,
Памажы нам Божа! :)

(2 разы—таксама)

5. (: Божа добры! Божа наш мілы!
Хрысьце, Хрысьце, Хрысьце наш,
Зьлітуйся над намі! :)

(2 разы—таксама)

---

## 147. ПСАЛЬМ 46.

(Гл. стр. 146 — тэкст і ноты)

---

## 148. ОЙЧА НАШ, КАТОРЫ ЁСЬЦЬ Ў НЯБЁСАХ.

(Гасподня Малітва)

1. Ойча наш, каторы — — * ёсьць ў Нябёсах!
Няхай сьвяціцца — — — * імя Тваё,

2. няхай прыйдзе — — — * Царства Тваё;
няхай будзе воля Твая,
як у небе, так — — * і на зямлі.

3. Хлеб — — — — — * наш штодзенны
дай — — — — — — * нам сёньня —

4. і даруй нам даў — — — * гі нашыя,
як і мы даруем даў — — * жнікам нашым;

5. і ня уводзь нас у — — * спакушэньне,
але захавай — — — — * нас ад злога.

6. Бо Тва — — — — — * ё ёсьць Царства,
і сіла, і слава на — — * векі! Амэн.

---

## 149. СЬВЯТЫ, СЬВЯТЫ, СЬВЯТЫ!

Сьвяты, сьвяты, сьвяты Госпад наш Бог!
Неба і зямля выслаўляе,
Слава, чэсьць Табе, о Божа наш!
Амэн, амэн, амэн.

---

## 150. ЎЛАДАР БОГ.

1. Ўладар Бог ў дому найвышэйшым,
Зямля прад Ім пакорна клоніцца!
Амэн.

---

## 150. СЛАВА БОГУ АЙЦУ.

2. Слава Богу Айцу і Сыну чэсьць і Сьвятому Духу чэсьць,
Як была ў пачатку, цяпер ёсьць, трываць будзе на век-вякоў!
Амэн.

---

## 151. ДОКСОЛЁГІЯ НА АХВЯРУ.

а) Усё, што мы даём,—Тва — * ё, Божа!
І з дараў даем Табе — — * хто што можа.
Амэн.

---

б) Маемасьць наша — — — * Твой ёсьць дар
Дык ўласнасьць сваю, Божа, * прымі ад нас!
Амэн.

---

## 152. БАГАСЛАЎЛЕНЬНЕ.

(Доксолёгія).

а) О, Спрадвечны, Вякуісты,
Як праменьні сонца чысты,
Хай хвала Твая к' нам гляне,
Хай Твая і Воля стане!
Амэн.

---

б) Хай Бога славіць кожны твор,
Хай áнялаў сьпявае хор,
Хай сьвет паклоніцца Яму —
Слава, чэсьць ў Тройцы Аднаму! —
Амэн.

# VII. ВЫБРАНЫЯ ПСАЛЬМЫ

(да чытаньня на малітвеных зграмаджэньнях).

---

## ПСАЛЬМ 17.

(Малітва Давідавая).

1. Выслухай, Госпадзе, справу справедлівага! Глянь на лямант мой! Прыймі малéньне маё із вуснаў нефальшывых!

**2. Ад аблічча Твайго няхай выйдзе прысуд мой; вочы Твае́ бачаць, што справядліва.**

3. Калі Ты выпрабóвываеш сэрца маё, ўначы адвéдываеш, ды грунтоўна распазнаéш мянé, дык не знаходзіш ніякіх благіх думак у-ва мнè, і вусны мае́ не грашаць.

**4. У справах чалавечых, паводле слова вуснаў Тваіх, я высьцерагаўся шляхоў гнібіцеляў.**

5. Крокі мае́ дзяржаліся каляінаў Тваіх; стопы мае ня хісталіся.

**6. Да Цябе я клічу, бо Ты, Божа, выслухаеш мяне, прыхілі да мяне вуха Тваё, пачуй словы мае!**

7. Пакажы дзіўную ласку Тваю, бо Ты Збавіцель тых, што ў правіцы Тваёй шукаюць абароны ад ворагаў.

**8. Захавай мяне, як зрэнку вока; у цяню крыльляў Тваіх укрый Ты мяне —**

9. ад бязбожнікаў, што гвалт учынілі нада

мной, ад ворагаў маіх, што прагавіта абступілі мяне:

10. **яны схаваліся ў туку сваім, вуснамі сваімі яны дзёрзкае гавораць.**

11. На кожным кроку цяпер яны нас абступаюць; іх думкі шукаюць, каб нас да зямлі прыбіць.

12. **Яны падобны да льва, што шукае дабычы, і да львянятка, што ў засадзе ляжыць.**

13. Паўстань, Госпадзе! Выйдзі супраць іх, павалі Ты іх! Мячом Тваім ратуй жыцьцё маё ад бязбожніка,

14. **ад людзей—Тваёй рукой, Госпадзе! — Ад людзей сьвету, што толькі ў гэтым жыцьці надзею сваю маюць, а чэрава іх Ты із скарбніцы Тваёй напаўняеш; многа сыноў яны маюць і лішак свой дзецям кідаюць сваім.**

15. Я-ж за справядлівасьць маю ўбачу аблічча Тваё: збудзіўшыся, буду Тваім абразом насычацца.

## ПСАЛЬМ 23.

(Псальм Давідавы).

1. Госпад ёсьць Пастыр мой, ні ў чым меця ня буду нястачы!

2. **На пасьвішчах зялёных Ён пасьвіць мяне і да водаў сьвежых водзіць мянé.**

3. Ён узмацняе душу маю, на сьцежкі праўды вядзè мянè дзеля імѐньня Свайго.

4. **Дык навет праходзячы далінаю цені сьмяротнага ня буду баяцца напасьці, бо Ты-ж са мною: Твая пáліца і падпора Твая—яны мяне пацяшаюць.**

5. Ты прада мной застаўляеш стол перад

абліччам уціскаючых мяне; галаву маю Ты памазаў алівай і чару маю давѐрху наліў.

6. **Шчасьце і ласка Твая будуць са мною ўсе дні жыцьця майго; і ў доме Гóспаднім астануся навѐкі.**

## ПСАЛЬМ 25.

(Псальм Давідавы)

1. Да Цябе, Гóспадзе, узьнімаю я душу маю.

2. **Божа мой! На Цябе спадзяюся; ня дай-жа мяне асароміць, ня дай ворагам маім быць нада мной пераможцамі!**

3. Бо-ж ніколі ня будуць асаромлены ўсе, што на Цябе спадзяюцца; асаромлены будуць тыя, што адступаюцца без дай прычыны.

4. **Гòспадзе, пакажы мне шляхі Твае, навучы, дзе сьцежкі Твае.**

5. Дай мне хадзіці ў праўдзе Тваёй і навучы; бо Ты ёсьць Бог, Які мяне ўспамагае: на Цябе спадзяюся заўсёды.

6. **Прыпомні аб міласэрнасьці Тваёй, Гóспадзе, ды аб ласках Тваіх, бо яны ад вякоў.**

7. Аб грахох моладасьці маёй ды аб праступках маіх не ўспамінай: успомні аба мне паводле ласкавасьці Тваёй, паводле дабраты Тваёй, Гòспадзе!

8. **Госпад добры і справядлівы, дык пакàзвае дарогу грэшнікам.**

9. Ён вядзѐ пакорных да праўды і убогім сьцежкі Свае пакáзвае.

10. **Усе шляхі Гасподнія—ласка ды праўда для тых, што захòвываюць запаведзь Яго і аб'явы ягоныя.**

11. Дзеля іменьня Твайго, Гóспадзе, даруй мне віну, бо-ж надта янá вялікая!

12. **Хто ёсьць чалавек, што Госпада баіцца? Яму Ён пакажа дарогу, якую выбраць яму.**

13. Душа Яго бытаваціме у шчасьці, а насеньне ягонае зямлю ў спадчыну дастане.

14. **Тайка Госпада выяўляецца тым, што баяцца Яго, і запаведзь Сваю Ён ім абвяшчае.**

15. Вочы мае заўсёды на Госпада ўзіраюцца, бо Ён выцягне з сеці ногі мае.

16. **Зірні на мяне і зьлітуйся нада мною, бо адзінокі я і ўцісьнёны.**

17. Тузе сэрца майго дай прастору і вывядзі мяне з бедаў маіх!

18. **Глянь на мукі мае і нядолю маю і даруй мне ўсе грахі мае!**

19. Глянь на ворагаў маіх, як многа іх, ды як мяне ненавідзяць яны несправядліва!

20. **Захавай душу маю і спасі мяне, каб ня быў я асаромлены, бо ў Цябе я шукаю прыпынку.**

21. Няхай захаваюць мяне: нявіннасьць і справядлівасьць, бо на Цябе спадзяюся.

22. **О, Божа! Выбаў народ наш з усіх бедаў ягоных!**

## ПСАЛЬМ 27.

(Псальм Давідавы).

1. Госпад ёсьць сьветласьць мая і збаўленьне маё: каго-ж мне баяцца? Госпад—ахова жыцьця майго: каго-ж мне палохацца?

2. **Калі злачынцы зьбяруцца насупраць мяне, каб пажэрці цела маё,—праціўнікі й ворагі мае — яны самі спаткнуцца ды ўпадуць.**

3. Калі войска азброіцца супраць мяне, сэрца маё не спалохаецца; калі ўзьнімецца супраць мяне вайна, я й тады спадзявацісь буду.

**4. Аднаго я прашу ў Госпада й гэтага толькі жадаю: каб жыці мне ў доме Госпадні усе дні жыцьця майго, каб бачыць хараство Госпада й адведываць сьвятыню Ягоную.**

5. Бо Ён засланяе мяне ў палатцы Сваёй у дзень напасьці, Ён укрывае мяне пад заслонай сялібы Сваёй, ды ўзносіць мяне на скалу.

**6. Гэтак ўзносіцца цяпер галава мая панад усімі ворагамі навакол мяне, і складаціму Госпаду ахвяры ў палатцы Ягонай пад трубныя гукі, буду Госпаду пяяці й іграці.**

7. Пачуй, Госпадзе! Голасна я гукаю. Зьлітуйся-ж нада мною й адгукніся!

**8. Аб Табе гаворыць сэрца маё, кажучы: „Шукайце абліччa Майго!“ Я буду шукаці абліччa Твайго, Госпадзе!**

9. Не хавай ад мяне абліччa Твайю, не гані ў гневе слугу Твайго! Ты быў мне ўспамогай! Не адцурайся-ж ад мяне і не пакінь мяне, Божа, Спасе мой!

**10. Бо і бацька і маці мая пакінулі мяне, а Госпад прыймае мяне**

11. Пакажы мне, Госпадзе, шлях Твой і вядзі мяне простай сьцежкай, насупраць ворагам маім!

**12. Не аддавай мяне ярасьці праціўнікаў маіх, бо сьведкі фальшывыя паўсталі проці мяне і той, што дыхае беззаконьнем.**

13. Але я веру, што угледжу дабрату Госпада ў краіне жывых.

**14. Спадзявайся на Госпада! Будзь мужны і сэрца тваё ўмацуй. Але, спадзявайся на Госпада!**

## ПСАЛЬМ 28.

(Псальм Давідавы).

1. Да Цябе, Го́спадзе, клічу я. Скала́ мая, не маўчы на мой кліч, каб праз маўчаньне Тваё ня быў я падобны да тых, што зыходзяць ў магілу.

**2. Пачуй Ты маленьне маё галоснае, калі крычу да Цябе, калі рукі свае́ да сьвятыні Тваёй ўзьнімаю.**

3. Не загубі мяне разам з бязбожнікамі ды злачынцамі, што з бліжнімі ветліва гутараць, а ў душы ліхое маюць!

**4. Дай ім паводле ўчынкаў іхніх і злачынства іх: паводле таго, што рабілі іх рукі, дай ім; адплаці ім за тое, што зрабілі яны.**

5. Бо яны не зважаюць на ўчынкі Го́спада і на творы рук Ягоных. Дык Ён зруйнуе іх і не адбудуе.

**6. Няхай будзе Го́спад пахвалены, бо пачуў маленьне маё гало́снае!**

7. Го̀спад заслона мая і мой шчыт; на Яго спадзява́лося сэрца маё, і Ён ўспамог мяне; і ўзра́давалося сэрца маё, і песьняй маёю дзякаваць буду Яму.

**8. Го̀спад апора народу Свайму; Ён вал, што бароніць памазанца Ягонага.**

9. Спасі люд Твой і багаславі ўласнасьць Тваю; пасі яго й насі аж навекі!

## ПСАЛЬМ 29.

(Псальм Давідавы).

1. Аддайце Го́спаду, вы, сыны Божыя, аддайце Го̀спаду хвалу і чэсьць!

**2. Аддайце Го́спаду хвалу імéньня Ягонага, ніцма ўпадзе́це прад Го̀спадам ў прыгожасьці сьвятыні!**

3. Голас Го́спадні над водамі; Бог Славы загрымеў: Го́спад над водамі вялікімі.

4. **Грымот Го̀спадні магутны, грымот Го́спадні велічэзны.**

5. Пярун Го́спадні крышыць кедры, Го́спад крышыць кедры Ліванскія!

6. **Ён прымушае іх скакаць, быццам цяляты, Ліван ды Сырыён, як маладых буйвалаў.**

7. Пярун Го́спадні выкрасае по́лымя агністае.

8. **Грымот Го́спадні ўстрасае пушчай Кадэс.**

9. Ад грымоту Гасподняга лані зьлягаюць і лясы асыпаюцца, і ў храме Ягоным ўсё кажа: „Слава!“

10. **Над патопам сядзе́ў Го́спад, дый сядзе́ціме Го́спад.**

11. Го́спад дасьць сілу народу Свайму, Го́спад пабагаслаўвіць народ Свой супакоем.

## ПСАЛЬМ 31.

(Малітва аб збаўленьне).

(Кіраўніку хору—псальм Давідавы).

2. У Цябе, Го́спадзе, я шукаю падпоры, ня дай мне асароміцца навекі, паводле справядлівасьці Тваёй спасі Ты мяне!

3. **Прыхілі да мяне вуха Тваё, пасьпяшыся выбавіць мяне! Будзь мне скало́ю, замчышчам крэпкім, каб даць мне ўспамогу!**

4. Бо Ты скала̀ мая й замчышча маё, і дзеля іменьня Твайго вадзіць мяне́ будзеш і мною кіраваці.

5. **Ты мяне выцягнеш з сеці, што ўкрадкам наставілі мне, бо Ты абарона мая.**

6. Ў рукі Твае аддаю я дух мой; Ты збавіў мяне, Госпадзе, Божа праўдзівы!

**7. Ненавіджу я тых, што чтуць ідалаў марных: я-ж спадзяюся на Госпада!**

8. Дай мне радавацца й весяліцца з ласкі Тваей, што Ты глянуў на муку маю, рупіўся аб патрэбы душы маей.

**9. Ты ня даў мяне ў рукі ворага, паставіў стопы мае на вольны прастор.**

10. Зьлітуйся нада мною, Госпадзе, бо жах мяне ахапляе. Ад суму высахла вока маё і душа мая і цела маё.

**11. Бо ў жудасьці зыйшло жыцьцё маё і гады мае ў уздыханьні. Зьнямаглася сіла мая ў грахох маіх і павысахлі косьці мае.**

12. Пасьмешышчам стаўся я для перасьледавацеляў маіх ды навет для суседзяў маіх, страхацьцём для знаёмых маіх; хто мяне бачыць на вуліцы, уцякае ад мяне.

**13. Забыты я ў сэрцах, як мёртвы; я падобны да начыньня разьбітага.**

14. Чуў я словы нягодныя ад многіх, — жах наўкола!—як змаўляліся між сабою проці мяне, манючыся адняць мне жыцьцё.

**15. Ды я на Цябе спадзяюся, Госпадзе! Я кажу: „Ты мой Бог!“**

16. У Тваіх руках мае дні; вызваль мяне із рук ворагаў маіх і перасьледавацеляў маіх!

**17. Няхай над нявольнікам Тваім сьвеціць абліčча Тваё: памажы мне праз ласкавасьць Тваю!**

18. Госпадзе! ня дай Ты мне асароміцца, бо да Цябе я клічу! Няхай бязбожнікі асаромяцца, няхай счэзнуць у пекле.

**19. Няхай занямеюць вусны ілжывыя, што ў пысе й з пагардай дзёрзка проці пабожных гавораць!**

20. Як вяліка дабрата̀ Твая, што хаваеш Ты
для тых, хто баіцца Цябе, і пака̀зваеш тым, хто
ратунку шукае ў Цябе, перад абліччам людзей!

21. **Пад заслонай аблічча Твайго Ты бароніш іх
ад бунтаў людзкіх, хаваеш іх, як у палатцы, ад язы-
ка̀ў сварлівых.**

22. Багасла̀ўлены Го́спад, што мне дзіўную
ласку зьявіў у ўмацо́ваным месцы!

23. **А я-ж думаў у страху маім: я адкінены ад
вачэй Тваіх! Але Ты пачуў галоснае маленьне мае,
калі я клікаў да Цябе!**

24. Любе́це Го́спада, усе сьвятыя Яго! Вер-
ных баро́ніць Го́спад, але тым, што ў гордасьці
жывуць, адпла̀чвае Ён з наддаткам.

25. **Будзьце мужны і крэпкія духам—усе, што
чакаеце на Го́спада!**

## ПСАЛЬМ 40.

(Кіраўніку хору: псальм Давідавы).

2. Тужліва чакаў я на Го́спада, і вось Ён
схіліўся ка мне і плач мой пачуў.

3. **І вывёў мяне із ямы пагібельнай, з твані
балотнае, і ногі паставіў мае на скале́, і ўзмоцніў Ён
стопы мае.**

4. І новую песьню мне ў вусны ўлажыў —
хвалу нашаму Богу. І многія гэтае ўбачаць і ўба-
яцца ды будуць надзею ўскладаці на Го́спада.

5. **Багаслаўлен чалавек, што надзею сваю
ўскладае на Го́спада і ня йдзе к непакорным і к тым,
хто да ілжы прыхіляецца.**

6. Чысьлены цуды Тва́е і замыслы Тва́е,
якія Ты, Го́спад і Бог мой, зьдзейсьніў дзеля мя-
не. Нічога няма Табе роўнага. Хацеў-бы я іх
абвяшчаць і казаці, ды лішне іх многа, каб мог
я іх палічыць.

7. **Ахвяры з крыві і хлеба недаспадобы Табе: вушы мае Ты мне расчыніў. Цэлапаленьняў ды жертваў за грэх Ты не вымагаеш.**

8. Тады я сказаў: „Вось я йду! У зьвітку кніжным „напісан загад мне.

9. **„Волю Тваю выпаўняць, Божа мой, рóскаш мая, і Закон Твой—у сэрцы маім“.**

10. Я абвяшчаў справядліваць Тваю на вялізарным зборы; і, запраўды-ж, вуснаў сваіх я ня спыняў,—Ты гэта ведаеш, Гóспадзе!

11. **Праўды Тваей ня ўкрываў я ў сэрцы маім, я пра вернасьць Тваю гаварыў і ўспамогу Тваю, ласкі Тваѐ й справядлівасьці прад зборам вялізным ня ўтаіваў.**

12. Гóспадзе, не адхіляй міласэрдзя Твайгó ад мяне; ласка і вернасьць Твая захавае навекі мянé.

13. **Бо мукі бяз ліку абступілі мяне, праступкі мае дагналі мяне, ажно нéльга мне іх агарнуць: іх балéй, чым валосься на маёй галаве, — і мужнасьць мая мянé кінула.**

14. Рач, Гóспадзе, збавіць мяне! пасьпяшы на ўспамогу мне, Гóспадзе!

15. **Няхай асаромяцца і расчаруюцца ўсе, што шукаюць пагібелі для душы маёй; няхай наўцéкі павернуць ды асаромяцца тыя, што жадаюць няшчасьця майго.**

16. Няхай адубеюць у сóраме сваім тыя, што мне гукаюць: Ха, ха!

17. **Няхай весяляцца і цешацца ўсе ў Табе, хто шукае Цябе; і тыя, што жадаюць спасеньня Твайго, хай гукаюць няспынна: „Вялікі ёсьць Гóспад!“**

18. Хоць я й нешчасьлівы й убогі, ды Гóспад будзе аба мне клапаціцца. Ты — ўспамога мая і мой Спас! Ня бауся, мой Божа!—

# ПСАЛЬМ 42.

(Кіраўніку хору із сыноў Карэявых: песьня навучальная).

2. Як лань, што пажадае вады із патоку, так душа мая, Божа, імкнецца к' Табе!

3. **Душа мая хоча Бога, Бога Жывога! Калі-ж я прыйду й пакажуся прад Божым аблічам!**

4. Сьлёзы мае былі ежай маёй дзень і ноч, калі да мяне гаварылі няўстанна: „Дзе Бог твой?“

5. **Успамінаючы гэта, я душу маю выліваю, бо хадзіў я ў таўпе многалюднай, вядучы яе к Божаму Дому, сярод радасьці гучнай і падзякі грамады сьвяточнай.**

6. Чаму ты сумуеш, душа мая? Чаму ў-ва мне ты калоцішся? Спадзявайся на Бога! Я-ж буду яшчэ славіць Яго, успамогу і Бога майго.

7. **Душа сумуе ў ва мне; дык з зямлі Іорданскае, з гор Гармонскіх, з гары Міцар Цябе ўспамінаю.**

8. Бяздоньне гукае бяздоньню пры шуме Тваіх вадаспадаў; усе воды Твае ды ўсе хвалі прайшлі праз мяне.

9. **У дзень Госпад зьяўляе ласку Сваю, а ўначы Яму песьня ў мяне, малітва да Бога жыцьця майго.**

10. Да Бога кажу я, што ёсьць мне скала: „Чаму Ты забыў аба мне? Чаму я ў суме хаджу ад уціску ворага?“

11. **Як парахніца ў косьцях маіх, насьмяхаліся ворагі мае нада мною, гаворачы ўсьцяж: „Дзе-ж твой Бог?“**

12. Чаму ты сумуеш, душа мая? Ды чаму ў-ва мне ты калоцішся? Спадзявайся на Бога! Бо яшчэ буду хваліці Яго, успамогу і Бога майго!

# ПСАЛЬМ 46.

(Кіраўніку хору із сыноў Карэявых: на аламот. Песьня).

2. Бог нам прыпынак і сіла, магутная ў бядзе ўспамога.

3. **Дык не спалохаемся, хоць-бы зямля захісталася і горы зваліліся ў сэрца мора.**

4. Хоць-бы раўлі і ўздымаліся воды ягоныя, хоць-бы ад шалу ягонага горы трасьліся: з намі Го́спад сілаў нябесных, крэпасьць наша Бог Якубавы. (Зэля).

5. **Патокі рачныя ўзьвесяляюць Божае места, сьвятую сялібу Найвышэйшага.**

6. Бог пасярод яго, дык не захістаецца; Бог вызваліць яго, як настане раніца.

7. **Зварухнуліся народы, захісталіся царствы; Ён падаў голас Свой, і зямля растапілася.**

8. Го́спад сілаў нябесных з намі, крэпасьць наша—Бог Якубавы. (Зэля).

9. **Хадзе́це ды паўзірайцеся на дзе́ла Госпада: якое спусташэньне зрабіў Ён на зямлі.**

10. Го́спад, што войны спыняе ажні па край зямлі, ламàе лукі й рагатыны рассякàе, ды паліць агнём вазы.

11. **Спыне́цеся ды пазнайце, што Я—Бог! Узвышаны Я між народамі, узвышаны на зямлі!**

12. Го́спад сілаў нябесных з намі, Бог Якубавы—крэпасьць наша! (Зэля).

# ПСАЛЬМ 51.

(Малітва пакаяньня).

(1. Кіраўніку хору: псальм Давідавы;
2. калі прарок Натан прыйшоў да яго, пасьля таго, як увайшоў да Вірсавіі).

3. **Зьмілуйся нада мною, Божа, з ласкі Тваёй, ды праз вялікую міласэрнасьць Тваю даруй мне беззаконьні мае!**

4. Абмый мяне ўсёга ад правіннасьцяў маіх і ачысьці мяне ад граху майго.

5. **Бо ведаю добра беззаконьне маё, і грэх мой ўсьцяж прада мною.**

6. Прад Табой, Табой адзіным саграшыў я і зрабіў прыкрае Табе, дык Ты справядлівы ў прысудзе Тваім і чысты ў судзе́ Тваім.

7. **Вось я ў беззаконьні, і ў граху пачала мяне́ маці мая.**

8. Ты вымагаеш праўды ў сэрцы, дык зьяві-ж Ты мне мудрасьць у сэрцы маім.

9. **Акрапі мяне ізопам, каб я ачысьціўся; абмый мяне, каб я стаўся бялейшым за сьнег.**

10. Дай Ты мне радасьць пачуць і вясёласьць, каб весяліліся косьці мае, што Ты пакрышыў.

11. **Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і даруй мне ўсе мае віны.**

12. Ствары ў-ва мне, Божа, чыстае сэрца і ўзнаві ў-ва мне духа сільнага.

13. **Не адкінь Ты мяне ад аблічча Твайго й не адбірай ад мяне Духа Твайго Сьвятога!**

14. Усьцеш мяне йзноў успамо́гай Тваёй, падмацуй духам добрае волі мяне.

15. **Шляхі Твае буду я адступнікам паказваць, і грэшнікі вернуцца йзноў да Цябе.**

16. Вызваль мяне ад помсты за кроў, Ты, Госпадзе Божа, мой Спасе, каб язык мой славіў справядлівасьць Тваю.

17. **Расчыні Ты, Госпадзе, вусны мае, каб вусны мае хвалу Тваю абвяшчалі.**

18. Бо Ты не жадаеш крывавых ахвяраў, — інакш я-б іх даў!—і цэлапаленьні ня любы Табе.

19. **Запраўдная Богу ахвяра — дух пакаянны; сэрцам зламаным, што каецца, Ты, Божа, не пагарджаеш!**

20. Шчасьці Сыону з ласкі Тваёй, узьвядзі нанова муры Ерузаліму.

21. **Тады Ты прыймеш ласкава ахвяры праўды, цэлапаленьні й жэртвы агністыя; тады валоў паложаць на ахвярнік Табе.**

## ПСАЛЬМ 55.

(Кіраўніку хору: на струнных. Навука Давідава).

2. Пачуй, о Божа, малітву маю і не хавайся ад маленьня майго!

3. **Спаглянь на мяне і выслухай мяне; я стогну ў тузе і ўздыхаю**

4. ад крыку ворага, ад уціску бязбожнікаў, бо беззаконьне наводзяць на мяне і заўзята змагаюцца са мною.

5. **Сэрца трапеча ў-ва мне, і напаў на мяне жах сьмяротны;**

6. страх і дрыжаньне найшло на мяне, і жах зьнімае мяне.

7. **Дык я сказаў: „О, каб мне крыльле, як галубінае! Паляцеў-бы тады й супакоіўся!**

8. Так, паляцеў-бы далёка дый астаўся-б у пушчы. (Зэля).

9. **Хутка-б схаваўся прад ветравым шалам, прад бурай!**

10 Зьніштож іх, Го́спадзе, расшчапі языкі ім, бо бачу я гвалты й сваркі ў месьце.

11. **Дзень і ноч яны ходзяць на сьценах яго наваколь, няшчасьце ж ды гора ў сярэдзіне ў ім.**

12. Пагібель у ім, ды мана́ і здра́да з рынку яго ня зыходзяць.

13. **Бо ня вораг мяне зьневажае,—гэта б сьцярпеў я! — ня той, што мяне ненавідзіць, што прада мной надымаецца,—ад яго-б я схаваўся!**

14. — але ты, чалавеча, як я, прыяцелю мой і мне блізкі,

15. **з кім мы вялі між сабою шчырыя гутаркі, з кім у Дом Божы хадзілі сярод натоўпу народнага**

16. Каб сьмерць напала на іх! Каб зыйшлі жывыя ў край сьмерці! бо злачынства ў іхніх дамох, у іх сэрцы.

17. **Я-ж буду клікаць да Бога, і Го́спад мяне ўспаможа.**

18. Уве́чары й раніцай дый ў палудзень. я буду плакаць і галасіці, і Ён пачуе мой голас.

19. **Ён збавіць душу маю й дасьць супакой ад тых, што падняліся супраць мяне; бо многа было́ проці мяне́.**

20. Пачуе Бог, і Прадвечны іх давядзе да пакорнасьці, бо ня было ў іх паправы, ды не баяліся Бога,

21. **руку сваю падыймалі на тых, што з імі ў згодзе жылі, дый нарушалі ўгоду;**

22. вусны ў іх гладкія, як тое масла, а ў сэрцы варожасьць; словы ў іх лагаднѐй за аліву, яны-ж —мячы абнажоныя.

23. **Пакінь бярэмя тваё на Го́спада: Ён цябе забясьпечыць; ня дасьць Ён ніколі, каб пахіснуўся пабожны.**

24. Ты-ж, Божа, іх кінеш ў найглыбейшыя ямы; тыя, што хочуць крыві, ды здраднікі паловы сваіх дзён не дажывуць. А я на Цябе спадзяюся!

## ПСАЛЬМ 57.

(Кіраўніку хору: на лад „Не загубляй!" Залаты псальм Давіда).

2. Зьмілуйся нада мною, о Божа, зьмілуйся! Бо ў Цябе я шукаю патолі і ў цяню Тваіх крыльляў шукаць буду прыпынку, пакуль ня мінецца загуба.

3. **Клічу да Бога Ўсявышняга, да Бога, што справу маю вядзе за мяне.**

4. Ён з неба пашле і ўспаможа мяне; Ён тых асароміць, што хочуць мяне праглынуці; ласку сваю пашлець Бог ды праўду Сваю.

5. **Душа мая між львоў; я ляжу сярод тых, што палаюць агнём, сярод людзей, што зубы іх — дзіды і стрэлы, языкі-ж—мячы вострыя.**

6. Узьнясіся над неба, о Божа, каб слава Твая па ўсенькай зямлі лунала!

7. **Дзеля ног маіх сетку наставілі, прыгнулі яны душу маю,**

8. прада мною яму капалі, ды самі ў яе ўваліліся. (Зэля).

9. **Сэрца маё гатова, о Божа, маё сэрца гатова пяяці й іграці Табе.**

10. Ачуняй, мая слава! Збудзіцеся, гуслі маё і псалтыр! Я разбуджу сьвітаньне!

11. **Буду славіць Цябе між народамі, Го́спадзе, буду славіць Цябе між пага̀намі!**

12. Бо аж да неба вялікая ласка Твая і праўда Твая да абло́каў.

13. **Узьнясіся над неба, о Божа, каб слава Твая па ўсенькай зямлі лунала!**

## ПСАЛЬМ 62.

(Кіраўніку хору Ядытунавага: псальм Давідавы).

2. Толькі ў Богу супакойваецца душа мая, ад Яго ўспамога мая.

3. **Але̇: Ён скала̀ мая й помач мая, Ён цьвярдыня мая; дык не пахіснуся.**

4. Дакуль будзеце насядаць на чалаве́ка? Вы ўсіх маніцёся зьніштожыць як тая сьцяна́, што скранулася, як агарожа, што валіцца.

5. **Але̇, задумалі скінуць яго з высо́касьці; ім люба ілжа; яны вуснамі багаслаўляюць, але ў сэрцы сваім праклінаюць! (Зэля).**

6. Але, толькі ў Богу спачынеш, душа мая! Бо на Яго спадзяюся.

7. **Але̇: Ен скала́ мая й помач мая, Ён цьвярдыня мая: дык не пахіснуся.**

8. У Богу збаўленьне маё і слава мая; скала́ мая крэпка, прыпынак у Богу.

9. **На Яго спадзявайся, грамада народная! Вылівайце прад Ім сэрца вашае; бо Бог наш прытулак. (Зэля).**

10. Але́: сыны чалавечыя—по́дмух, людзі — мана́; калі паложыш на вагу, яны разам лягчэй за по́дмух!

11. **Не ўскладайце надзеі на крыўду, ня пышайцеся зрабаваным; калі-ж вам прыбудзе багацьця, сэрца свайго да яго ня прыкле̇йце!**

12. Раз сказаў Бог, а я двойчы чуў гэта, што сіла—ў Бога.

**13. І ў Цябе ласка, Гóспадзе, бо кожнаму водле учынкаў даеш.**

## ПСАЛЬМ 67.

(Кіраўніку хору на струнных. Псальм да пяяньня).

2. Божа будзь нам ласкавы й багаслаў нас; асьвяці нас абліччам Сваім, (Зэля).

**3. Каб на зямлі мы пазналі Твой шлях, між усімі народамі збаўленьне Тваё.**

4. Тады Цябе, Божа, хваліць будуць народы; будуць славіць Цябе ўсе людзі.

**5. Усьцешацца й узрадуюцца ўсе плямéньні, што Ты судзіш народы па праўдзе й плямёнам кірунак даеш на зямлі. (Зэля).**

6. Хваліць Цябе, Божа, будуць народы; будуць славіць Цябе ўсе людзі.

**7. Зямля плод свой выдала; няхай Бог, наш Бог, нас багаслаўляе!**

8. Няхай Бог нас багаслаўляе, няхай усе ўзьмежкі зямлі Яго ўбаяцца'

## ПСАЛЬМ 71.

(Малітва аб ратунак).

1. Пры Табе, о Гóспадзе, шукаю прыпынку. Ня мне навек асароміцца.

**2. Збаў нас, вызваль мяне паводле Тваёй справядлівасьці! Прыхілі да мяне Тваё вуха і дай мне ўспамогу!**

3. Будзь мне скалóй, што бароніць мяне, цьвярдыняю моцнаю, каб мне памагчы, бо Ты і скалá і цьвярдыня мая.

4. **З моцы бязбожнага вызваль мяне, Божа мой, з рукі беззаконнага і прыгнятацеля.**

5. Бо, Ты, о Го́спадзе, надзея мая, спадзяваньне маё змалку год!

6. **На Цябе я здаваўся ад матчына чэрава; з улоньня маткі Ты вывёў мянѐ; дык навекі Табе хвала́ ад мяне!**

7. Шмат хто глядзіць на мяне, як на дзіва; але Ты мне заслона магутная.

8. **Вусны мае поўны славы Тваёй. што дня яны славяць магутнасьць Тваю.**

9. Не адцурайся ад мяне ў маёй старасьці, калі счезнуць сілы мае. Ты ня пакінь мяне!

10. **Бо змаўляюцца ворагі мае на мяне, і тыя, што сочаць за душою маёй, раяцца між сабою,—**

11. кажучы: „Бог пакінуў яго; дык ганіцеся за ім і схапеце яго, бо няма ў яго абаронцы!"

12. **Божа, ня будзь далёка ад мяне! Пасьпяшы, мой Божа, на помач да мяне!**

13. Каб былі асаромлены й зьнішчаны тыя, што ненавідзяць душу маю! Каб ганьбай і сорамам тыя пакрыліся, што жадаюць нядолі маёй!

14. **Я-ж заўсёды буду чакаць і множыць славу Тваю.**

15. Справядлівасьць Тваю будуць вусны мае абвяшчаць, пра збаўленьне ўсьцяж гаварыць, бо ім лічбы ня ведаю я!

16. **Выступаць буду сілай вялікаю Го́спада, буду славіць Тваю справядлівасьць, толькі Тваю!**

17. Змалку дзён Ты вучыў мяне, Божа, і дагэтуль я цуды Твае абвяшчаю.

18. **І да старасьці, і да сівізны не пакідай мяне, Божа, пакуль я пра сілу Тваю не накажу пакаленьню вось гэтаму ды пра моц Тваю — ўсім, што наро́дзяцца яшчэ.**

19. Бо справядлівасьць Твая, о Божа, ажні да неба высокая; вялізнае, Божа, Ты ўчыніў, каму-ж зраўняцца з Табою?

**20. Ты нам даў пяражыць многа бед і нягод, але Ты ажывіш нас нанова і з бяздоньняў зямлі ізноў выцягнеш нас.**

21. Ты памножыш сілу маю і пацешыш мяне;

**22. дык і я на псалтыры, мой Божа, буду хваліці Цябе і праўду Тваю! Буду на гусьлях іграці; Табе, о Сьвяты Ізраіля!**

23. Радыя вусны мае, як Табе я пяю, і душа мая, што Ты спас яе.

**24. І язык мой будзе што-дня абвяшчаць справядлівасьць Тваю, бо сорам і стыд на тых, што мне ліха шукаюць.**

## ПСАЛЬМ 85.

(Кіраўніку хору: сыноў Карэявых. Псальм.)

2. Ты зьлітаваўся над зямлёй Тваёй, Госпадзе, Ты палон Якубаў вярнуў.

**3. Ты зьняў віну з народу Твайго, дараваў ім усе грахі іхнія. (Зэля).**

4. Ты зьдзяржаў Тваю ярасьць і гнеў Твой палючы адвярнуў.

**5. Адбудуй Ты нас, Божа, ўспамога наша, супыні абурэньне Тваё на нас.**

6. Няўжо-ж на векі на нас будзеш гневацца і гнеў Твой пашырыш на пакаленьні патомныя?

**7. Няўжо-ж не дасі нам аджыць нанова, каб народ Твой узрадаваўся ў Табе?**

8. Дай нам, Госпадзе, ўбачыць ласку Тваю, даруй нам спасеньне Тваё!

**9. Паслухаю я, што Госпад нам кажа: Ён гаворыць аб супакоі для народу Свайго і для пабожных**

**Сваіх, для тых, што сэрца сваё да Яго кіруюць. — (Зэля).**

10. Запраўды, блізка ўспамога Яго дзеля тых, што баяцца Яго, каб слава Божая на зямлі нашай залунала.

11. **Ласка і праўда з сабой сустракаюцца, справядлівасьць і супакой цалуюцца.**

12. Праўда вырастае із зямлі, а справядлівасьць з нябёсаў пазірае.

13. **І абдарыць нас Госпад добрым, а зямля наша дасьць плод свой.**

14. Ідзе справядлівасьць напéрадзе Яго і стопы Ягоныя на шлях стаўляе.

## ПСАЛЬМ 86.

(Малітва Давідава).

1. Прыхілі, Госпадзе, вуха Тваё, ды пачуй Ты мяне, бо я бедны й убогі.

2. **Захавай маю душу, бо я прад Табою скарыўся. Памажы Ты, мой Божа, слузе Твайму, які на Цябе спадзяецца.**

3. Памілуй мяне, Госпадзе, бо ўвесь дзень да Цябе я клічу.

4. **Пацеш душу слугі Твайго, бо душу да Цябе я ўзьнімаю, о Госпадзе!**

5. Бо Ты, о Госпадзе, добры і літасьцівы ды шчодры на ласку для ўсіх, што Цябе прызываюць.

6. **Пачуй, о Госпадзе, малітву маю і выслухай маленьне маё голаснае.**

7. У час тугі маёй я клічу Цябе, бо Ты мяне выслухаеш.

8. **Няма між багамі роўнага Табе, Госпадзе, і няма дзел, як Тваё.**

9. Усе народы, што Ты іх стварыў, прыйдуць і ніцма ўпадуць прад Табою, о Госпадзе, і імя Тваё будуць славіць.

10. **Бо Ты вялікі і цуды робіш, — Ты Бог, Ты адзін!**

11. Навучы мяне, Госпадзе шляху Твайго, каб хадзіў я ў праўдзе Тваёй; сэрца маё ўкрапі ў баязьні іменьня Твайго.

12. **І буду ўсім сэрцам маім хваліць Цябе, Госпадзе, Бог мой, і імя Тваё буду славіць навекі.**

13. Бо ласка Твая нада мною вяліка, і Ты вырваў душу маю з бяздоньня пякельнага.

14. **Божа, гордыя супраць мяне збунтаваліся, і натоўп перасьледаваценяў шукае душу маю, ды на Цябе не зважаюць яны.**

15. Але Ты, Госпадзе, Бог міласэрны й ласкавы, да гнёву няскоры і ласкай ды праўдай багаты.

16. **Да мяне зьвярніся й зьмілуйся нада мной; дай сілу Тваю слузе Твайму і сыну рабыні Тваёй памажы!**

17. Зьяві Ты на мне знак Тваёй дабраты, каб угледзілі гэта і тыя, што ненавідзяць мяне, і паўстыдаліся-бы, што Ты, о Госпадзе, мне дапамог і пацешыў мяне.

## ПСАЛЬМ 90.

(Малітва Майсея, мужа Божага).

1. Госпадзе, Ты нам прыпынак з роду ды ў род!

2. **Перш, чымся горы паўсталі, і Ты даў кшталт зямлі і сусьвету, ад веку і да веку ёсьць Ты, о Божа!**

3. Ты йзноў вяртаеш у пыл чалавека ды кажаш: вярніцеся, сыны чалавечыя!

4. **Бо тысяча лет прад вачыма Тваімі — як учорашні дзень, што мінуў, і варта начная.**

5. Ты іх зносіш разводзьдзем; яны — як сон зраньня, як трава, што гібéе.

6. **Наранку красуе яна й зелянéе, а ўвечары вяне ды сохне.**

7. Вось гэтак праз гнеў Твой мы нікнем, ад ярасьці Тваёй мы ўстрывожаны.

8. **Ты паступкі нашы прад Табою паклаў, грахі нашы ўкрытыя прад сьветласьцяй абліччa Твайго.**

9. Бо ўсе дні нашы зьніклі ад гневу Твайго, гады нашы мінулі, быццам той уздох.

11. **Дзён веку нашага гадоў сéмдзесят, а як пры сіле—гадоў восемдзесят; а пара ў іх найлепшая — толькі праца ды марнасьць, бо плывуць яны шыбка, і мы адлятаем.**

11. Каму ведама сіла гневу Твайго ды ярасьць Твая, што да страху прад Табой адпаведная?

12. **Навучы Ты нас лічыць нашы дні, каб прыдбаць нам мудрае сэрца!**

13. Абярніся, о Госпадзе! Дакуль Ты? Над слугамі Тваімі зьлітуйся! —

14. **Зраньня нас ласкай Тваёй насычай, каб мы радаваліся й весяліліся ў-ва ўсе нашы дні.**

15. Пацеш Ты нас на гэтулькі дзён, колькі Ты гнуў нас, ды на столькі гадоў, колькі жылі ў нядолі.

16. **Хай над слугамі Тваімі зьявіцца дзела Твае, і над сынамі іх—слава Твая.**

17. Няхай ласка Госпада, Бога нашага, будзе над намі і ўмацуе дзела рук нашых. Замацуй Ты, Божа, дзела рук нашых! —

# ПСАЛЬМ 91.

1. Шчасьлівы той, хто жыве пад заслонай Найвышэйшага ды пад ценем ўсемагутнага.

2. **Кажу я да Госпада: Ты мой прыпынак і цьвярдыня мая, мой Бог, на якога спадзяюся.**

3. Бо-ж Ён ратуе цябе ад сеці лаўца, ад мору сьмяротнага.

4. **Пер'ем Сваім закрывае цябе, і пад крыльлем Ягоным схаваешся; праўда Яго—шчыт і заслона.**

5. Не палохайся страхаў начных, ні стралы, што ўдзень ляціць,

6. **ня бойся мору, што ў цемры крадзецца, заразы, што ў полудзень пустошыць.**

7. Хоць-бы тысячы побач з табой паляглі й міриады праваруч ад цябе, да цябе яна не падыйдзе.

8. **Толькі вачыма тваімі глядзець будзеш і ўбачыш з безбожнымі расплату.**

9. За тое, што ты казаў: Госпад — надзея мая, — ды Найвышэйшага выбраў сабе за прыпынак,

10. **ня сустрэне няшчасьце цябе, і пошасьць не падыйдзе да палаткі тваёй.**

11. Бо Ён дасьць загад аб табе Сваім Анялам, каб цябе сьцераглі на ўсіх сьцежках тваіх.

12. **На руках сваіх панясуць цябе, каб нагá твая не спаткнулася аб камень.**

13. На львоў і гáдаў ступаці будзеш, львянятаў і зьмéяў патопчаш.

14. **„За тое, што Мяне ўзьлюбіў ён, спасу яго; узвышу яго, бо імя Маё ведае.**

15. „Будзе клікаць Мяне, дык я выслухаю яго: пры ім Я ў няшчасьці, вызвалю яго ды услаўлю.

16. **„Насычу яго доўгім векам і спасеньне Маё дам угледзіць“.**

## ПСАЛЬМ 96.

1. Сьпявайце Го̀спаду новую песьню, сьпявай Госпаду ўсенька зямля!

2. **Сьпявайце Госпаду, багаслаўце імя Яго! З дня на дзень абвяшчайце спасеньне Ягонае!**

3. Апавядайце між паганамі Славу Яго, між усімі народамі цуды Ягоныя.

4. **Бо вялікі ёсьць Госпад і годны хвалы, страшней за ўсіх чыста багоў!**

5. Бо ўсе богі народаў — нішто, а Госпад нябёсы стварыў,

6. **Веліч і краса прад абліччам Яго, сіла і прыгожасьць у сьвятыні Ягонай.**

7. Аддайце Госпаду, плямёны народаў, аддайце Госпаду хвалу і чэсьць!

8. **Аддайце Госпаду славу, што іменьню Яго прыналежыць, нясѐце дары ды йдзѐце ў падворкі Ягоныя.**

9. Кіньцеся ніцма прад Госпадам у вяліччы і красѐ сьвятыні: дрыжыце прад абліччам Яго усе зѐмлі!

10. **Кажэце паганам: царуе Госпад! Ён сусьвет умацаваў, каб не пахіснуўся. І будзе судзіць Ён народы па праўдзе.**

11. Хай узьвесяляцца нябёсы і ўзрадуецца зямля; хай мора ўзварухнецца і ўсё, што ў ім.

12. **Хай усьцешыцца ральля і ўсё, што на ёй; і ўзьвесяляцца тады ўсе дрэвы лясныя**

13. перад Богам, Які йдзе, Які йдзе судзіці зямлю. Судзіць Ён будзе сусьвет па справядлівасьці і народы паводле праўды Сваёй.

# ПСАЛЬМ 103.

(Псальм Давідавы).

1. Багаслаў, душа мая, Госпада і ўсё нутро маё — імя Яго сьвятое!

**2. Багаслаў, душа мая, Госпада і не забывайся аб тым, што Ён табе зрабіў!**

3. Ён, Каторы дароўвае табе ўсё грахі твае, вылечвае ўсякую немач тваю,

**4. Каторы жыцьцё Тваё ад магілы спасае; ласкай і міласэрдзем вянчае цябе.**

5. Каторы тваю старасьць дабром насычае, тваю моладасьць, як у арла, аднаўляе.

**6. Справядлівасьць робіць Госпад і суд для ўсіх прыгнечаных.**

7. Ён паказаў шляхі Свае Майсею, сыном Ізраілевым учынкі Свае.

**8. Міласэрны Госпад і добры, да гневу ня скоры і шчодры на ласку.**

9. Не назаўсёды Ён гневам палае і не навекі помніць ліхое.

**10. Ня водле грахоў нашых нам Ён дае і не адплачвае па правіннасьцям нашым,**

11. але, як высака неба над зямлёю, так вяліка ласка Яго дзеля тых, што баяцца Яго.

**12. Як далёка ад захаду ўсход, так далёка Ён нашы праступкі ад нас аддаліў.**

13. Як літуецца бацька над дзяцьмі, гэтак Госпад літуецца над тымі, што баяцца Яго.

**14. Бо ведае Ён, з чаго зьлеплены мы, памятае, што мы — толькі пыл.**

15. Чалавек, як трава — яго дні; як краска ў полі, так ён цьвіце.

16. **Праляціць подмух ветру, і няма ўжо яго, і ўжо месца ягонае не пазнае яго.**

17. Але ласка Го́спадня ад веку й да веку над тымі, што баяцца Яго, і справядлівасьць Ягоная над сына̀мі сыноў

18. **тых, што хаваюць запавет Яго ды закон Яго памятаюць каб спаўняці яго.**

19. Го́спад паставіў пасад Свой на Нябёсах, і царства Ягонае над усім пануе.

20. **Багаслаўце Госпада вы, а̀кялы Яго, выволаты сільныя, што загады Яго выпаўняеце, пакорныя голасу слова Ягонага!**

21. Багаслаўце Госпада ўсе войскі Ягоныя, слугі Яго, што волю Яго выпаўняеце!

22. **Багаслаўце Госпада ўсе тзоры Ягоныя па ўсіх месцах валадарства Яго! Багаслаў Госпада ты, душа́ мая!**

## ПСАЛЬМ 111.

1. Алелюя!

Слаўлю я Госпада ўсім сэрцам пасярод пабожных і ў зграмаджэньні.

2. **Вялікія дзеяньні Го́спада, дастойны яны увагі ўсіх, што любуюцца імі.**

3. Дзелы Яго — краса і веліч, і справядлівасьць Яго — навекі.

4. **Ён памятнымі зрабіў цуды Свае: Госпад ласкавы і міласэрны.**

5. Тым, што баяцца Яго, Ён пажыву дае́; навекі Свой запавет памятае.

6. **Народу Свайму зьявіў дзелаў Сваіх сілу, даючы ім спадчыну народаў.**

7. Дзелы рук Ягоных — праўда і справядлівасьць; усе запаведзі Яго — пэўныя,

8. **Замацаваныя на вечныя вякі, у праўдзе й шчырасьці выпаўненыя.**

9. Збаўленьне паслаў Ён народу Свайму, навекі запавет Свой паставіў; сьвятое і страшнае імя Ягонае!

10. **Страх перад Госпадам — пачатак мудрасьці; добры розум усе здабываюць, што спаўняюць загады Яго. Хвала́ Яго — навекі! —**

## ПСАЛЬМ 127

(Песьня ўзыходжаньня. Салямо́навая).

1. Калі ня Го́спад будуе дом, дарэмны стараньні будаўнічых; калі ня Го́спад мѐста пільнуе, дарэмна вартуе старо́жа.

2. **Дарэмна для вас, што рана ўстаеце, позна кладзецёся й хлеб ваш ясьцё ў тузе́; Свайму ўмілава́наму ў сьне Ён дае́.**

3. Вось ад Госпада дар: гэта дзеці, нагарода Яго — плод чэрава.

4. **Быццам стрэлы ў магутнай руцэ, гэтак сыны маладыя.**

5. Шчасьлівы той чалавек, што імі напоўніў калчан свой.

6. **Ня будуць яны асаро́млены, як з ворагамі гутарку ў вароцех павядуць.**

## ПСАЛЬМ 128.

(Песьня ўзыходжаньня).

1. Шчасьлівы кожын, хто баіцца Госпада-хто ходзе шляхамі Ягонымі.

2. **Ты будзеш працу рук тваіх есьці, ты шчасьлівы, і добра табе!**

3. Жонка твая ў хаце тваёй будзе плодная,

быццам лаза вінаградная; сыны твае, як галіны аліўкавы, наўкола стала твайго.

4. **Алé, гэтак будзе багаслаўлены муж, які Бога баіцца.**

5. Няхай багаславіць цябе Госпад з Сыону, і ты ў-ва ўсе дні жыцьця твайго будзеш цешыцца з шчаснае долі Ерузаліму.

6. **І прыжджеш ты сыноў ад сыноў Тваіх. Мір Ізраілю.**

## ПСАЛЬМ 139.

(Кіраўніку хору: псальм Давідавы).

1. Госпадзе, Ты мяне выспрабаваў і Ты мяне ведаеш!

2. **Ты ведаеш, калі я сядаю й калі я ўстаю; ды здалёк разумеш думкі маé.**

3. Ці я хаджу, ці ляжу, Ты пры мне, усе дарогі мае Табе вѐдамы.

4. **Бо няма йшчэ слова на маім языку, а Ты Гóспадзе, ведаеш добра ўсё.**

5. Ззаду і спераду абняў Ты мяне і руку Тваю на мяне паклаў. —

6. **Лішне дзіўнае веданьне, лішне высака для мяне не магу яго сьцяміць!**

7. Куды мне йсьці ад духа Твайго і куды ўцячы ад аблічча Твайго?

8. **Калі-б я на неба ўзышоў, Ты там; калі-б ложам пекла зрабіў, Ты й тамака!**

9. Калі-б крыльле ў сьвітаньня я ўзяў і на самым канцы мора асёў,

10. **рука Твая й там вадзіла-б мянѐ, а правіца Твая трымала-б мяне̂.**

11. Калі-б я сказаў: „Няхай цемра пакрые мяне, і ночкай хай станецца сьветласьць навокал мяне“;

**12. дык і цемра цёмнай ня была-б для Цябе і ночка ясьнела-б, як дзень, цемра, як і сьвятло. —**

13. Бо Ты стварыў нутро маё, выткаў мяне ў чэраве матчыным.

**14. Хвалю Цябе за тое, што я гэтак дзіўна збудованы; дзіўныя ўчынкі Твае, і душа мая ведае добра.**

15. Ня былі ўкрыты косьці мае прад Табою, калі я твtechарыўся ў укрыцьці, таёмна складаўся ў глыбінях зямлі.

**16. Вочы Твае бачылі мяне, калі быў я йшчэ без хвормы зародкам; дні былі вызначаны і ў кнізе Тваёй запісаны ўсе, калі йшчэ ніводнага з іх ня было.**

17. Як-жа важкі, о Божа, думкі Твае для мяне ды якая вялікая безьліч іх!

**18. Калі-б захацеў я іх палічыць, дык іх больш, чым зярнятак пяску. Я буджуся, і я йшчэ з Табою.**

19 О, каб-жа Ты, Божа, пабіў-бы бязбожнікаў, каб крывяпіўцы ад мяне адступіліся вон!

**20. Яны падступна супраць Цябе паўстаюць; ашуканства выдумляюць ворагі Твае.**

21. Ці-ж ня мушу й я тых ненавідзець, о Госпадзе, што ненавідзяць Цябе, і брыдзіцца тымі, што на Цябе паўстаюць?

**22. Ненавісьцяй поўнай я іх ненавіджу, іх лічу за ворагаў і для мяне.**

23. Выспрабуй, Божа, мяне і сэрца маё Ты пазнай, мяне выспрабуй Ты і пазнай маё думкі!

**24. І зірні, ці ня йду супярэчнай дарогай, і на шлях вечны скіруй Ты мяне!**

# ПСАЛЬМ 143.

(Псальм Давідавы).

1. Малітву маю пачуй, Господзе, глянь на малітву маю, па праўдзе Тваёй мяне выслухай, паводле Тваёй справядлівасьці.

**2. І не ўваходзь у суд з слугою Тваім, бо ня праў прад Табою ніхто із жывых**

3. Бо сочыць вораг душу маю, жыцьцё маё утаптаў у зямлю, у цемры глыбокай жыць мяне змусіў, быццам памѐршых даўно́. —

**4. Ные мой дух ў-ва мне, сэрца маё ўнутры зьнямага́е.**

5. Успамінаю я дні старадаўныя, пра ўсе дзѐяньні Твае разважаю, аб тварэньнях рук Тваіх думаю.

**6. Выцягаю я рукі мае́ да Цябе; душа мая хоча Цябе́, як зямля бязводная. (Зэля).**

7 Выслухай хутка мянѐ, о Господзе! Мой дух зьнямагае! Не хавай-жа аблічча Твайго ад мяне́, каб ня стаўся падобны я да таго́, хто зыходзе ў магілу.

**8. Наранку дай чуць мне ласку Тваю, бо на Цябе я спадзяюся. Ты мне шлях пакажы, якім мнеісьці, бо душу маю да Цябе я ўзьнімаю.**

9. Ад маіх во́рагаў ратуй мяне, Господзе, бо на Цябе я чакаю. —

**10 Навучы мяне волю Тваю выпаўняць, бо-ж Ты Бог мой. Няхай добры Твой Дух вядзе мяне шляхам праўды.**

11. Господзе, дзеля іменьня Твайго захавай Ты мяне ў жыцьці! Дзеля Тваёй справядлівасьці вырві душу маю із напасьці!

**12. І дзеля ласкі Тваёй зьніштож маіх ворагаў, выгубі ўсіх, што мне душу ўціскаюць, бо-ж я Твой слуга!**

# ПСАЛЬМ 145.

(Давідава песьня хвальная).

1. Вывышшаць Цябе буду, мой Божа й Гаспадару, і імя Тваё славіць навекі!

**2. Багаслаўляць Цябе буду што-дня і імя Тваё на вякі вечныя.**

3. Вялікі Госпад і годны хвалы, і веліч Яго — недасяжная.

**4. Хай род роду хваліць Твае творы і магутнасьць Тваю абвяшчае.**

5. Аб вѐлічы магутнай славы Тваёй хай гавораць яны; я-ж аб цудах Тваіх казаць буду.

**6. Аб магутнасьці дзеяньняў страшных Тваіх хай гавораць яны; я-ж буду вялікія ўчынкі Твае́ абвяшчаць.**

7. Успаміны аб вѐлічы дабраты Тваёй абвяшчаць яны будуць і песьнямі славіць справядлівасьць Тваю.

**8. Го̀спад ласкавы і міласэрны, няскоры да гневу й ласкай вялікі.**

9. Го́спад добры да ўсіх, і літасьць Ягоная— панад усе́ Яго справы.

**10. Няхай хваляць Цябе ўсе Творы Твае́, сьвятыя Твае́ няхай славяць Цябе!**

11. Хай аб славе Гаспадарства Твайго яны апавядаюць і магутнасьць Тваю абвяшчаюць,

**12. каб даць вестку сыном чалаве́чым пра магутнасьць Яго і ве́ліч славы Гаспадарства Ягонага.—**

13. Гаспадарства Тваё — гаспадарства ўсіх вякоў, іўлада Твая — над усімі ро́дамі.

**14. Паддзе́ржывае Госпад усіх, хто ўпадае, падыймае ўсіх уцісьнёных.**

15. Вочы ўсіх на Цябе ўзіраюцца, і Ты ім іх ежу даёш у свой час.

**16. Ты расчыняеш руку Тваю і ўсё, што жыве, насычаеш паводле жаданьня.**

17. Справядлівы Госпад на ўсіх шляхох Сваіх і ласкавы ў усіх Сваіх справах.

**18. Ґоспад блізкі да ўсіх, што Яго прызнаваюць; да ўсіх, што Яго прызываюць у праўдзе.**

19. Ён робіць паводле жаданьня тых, што баяцца Яго, і чуе іх плач і ратуе іх.

**20. Госпад захоўвае ўсіх, што любяць Яго, але ўсіх бязбожных Ён выгубіць.**

21. Хвалу Госпада будуць казаць маё вусны, і ўсякае дыханьне хай сьвятое імя Яго славіць навекі!

А м э н.





✝

# VIII.

# Абход сымболічнай памяткі Господняй Вячэры.

(Пастар, духоўны, ці заступнік, прачытае адзін або некалькі із ніжэйнаступных адрыўкаў із сьв. Эвангельля; ў часе гэтага чытаньня выбраныя зборам людзі (stewards) зьбіраюць складку для бедных, — ці на іншыя патрэбы збору).

„Дык хай сьвеціць сьвятло́ вашае перад людзьмі, каб яны бачылі добрыя дзеяньні вашыя і славілі Айца вашага, які ёсьць у нёбе“. (Мат. V. 16.).

„Ня зьбірайце сабе скарбаў і багацьцяў на зямлі, дзе моль ды іржа нішчаць і дзе зло́дзеі падкопваюцца і крадуць“ (Мат. VI. 19).

„Але зьбірайце сабе скарбы ў небе, дзе ані моль, ані іржа ня нішчаць, і дзе злодзеі не падкопваюцца і не крадуць; бо дзе скарб ваш, тамака і сэрца вашае“. (Мат. VI. 20 і 21).

„І так ува ўсім, як хочаце, каб з вамі паступалі людзі, так паступайце і вы з імі; бо ў гэтым закон і прарокі. (Мат. VII. 12).

„Ня ўсякі, што мне кажа: Го́спадзе! Го́спадзе; увойдзе ў Царства Нябеснае; але той, што выпаўняе волю Айца Майго Нябеснага“. (Мат. VII. 21.)

„А Закхей, стануўшы, сказаў Господу: Го-

спадзе! палову маемасьці маёй я аддам убогім і, калі каго чым скрыўдзіў, аддам учацьвёра балéй". (Лук. XIX 8.).

„Пры гэтым скажу: хто скупа сèе, той скупа і пажне; а хто шчодра сéе, той і пажне шчодра". (2 Кор. IX. 6.).

„Кожны хай даé паводле спадобы сэрца, без шкадаваньня і прымусу ці прынукі, бо ахвотна даючага любіць Бог". (2 Кор. IX. 7).

„Бог-жа Магутны абагаціць вас усякім дабрóм, каб вы заўсёды і ўва ўсім будучы здаволенымі і маючы дастатак, былі багаты на добрыя дзеяньні. (2 Кор. IX. 8).

„Дык пакуль ёсьць час, добра рабèм усім, а найбольш сваім па веры". (Гал. VI. 10).

„А ёсьць вялікая карысьць — набожнасьць, злучаная з здаваленьнем". (I. Тым. VI. 6).

„Бо мы нічога ня прынясьлі на сьвет; ясна, што нічога ня можам вынясьці з яго". (1. Тым. VI. 7).

„Багачóм цяперашняга веку прыпамінай, каб ня былі гордымі і скупымі і спадзяваліся не на багацьце няпэўнае, але на Бога жывога, што даè нам шчодра ўсё для здаваленьня". (I. Тым VI. 17).

„Каб яны здавольваліся, багацелі добрымі дзеяньнямі, былі шчодрыя і грамадзкія. (I. Тым. VI. 18).

„Зьбіраючы сабе добрую аснову будучыні, каб атрымаць вечнае жыцьцё". (I. Тым. VI. 19).

„Бо ня ёсьць Бог несправядлівы, каб не памятаў дзеяньня вашага і працавітае любові, якую вы паказалі ў Імя Яго, служыўшы і служачы сьвятым". (Жыд. VI. 10).

„Не забывайце такжа грамадзкай добрадзейнасьці: бо такія ахвяры падабаюцца Богу". (Жыд. XIII. 16).

„А хто мае дастатак у сьвеце, а, бачучы брата свайго ў бядзе, зачыняе перад ім сэрца свае,—дык якжа прабывае ў ім міласьць Божа“? (І. Іоан III. 17).

„Госпаду пазычае, хто мае літасьць над убогім, а Ён аддасьць яму за добрадзейнасьць яго“. (Прып. Салям. XIX. 17).

„Багаслаўлёны, хто зьвяртае ўвагу на ўбогага: у дзень бяды выбавіць яго Госпад“. — (Пс. 41. 2).

---

(Пасьля адчытваецца наступнае прызываньне):

Вы, што праўдзіва і шчыра каецеся і шкадуеце за вашыя грахі, а напоўнены любоўю і спагаданьнем да бліжніх, пастанаўляеце цяпер вясьці новае жыцьцё паводле прыказаньняў Бога і ісьці Яго сьвятымі дарогамі, — прыбліжцеся з вераю, каб прыняць гэтае сьвятое таінства містычнага сымболю — гэты Хлеб Божы, што нясе вам патолю, зрабійшы перад гэтым ў духу сваім вызнаньне вашых грахоў перад Усемагутным, перад Каторым станьце пакорна па калёны. —

(Пасьля адбытай так у сабе агульнай споведзі Пастара і тых, што пастанавілі прыняць „прычасьце“ ці сьв. сымболь, сабраныя ці зграмаджаныя і Пастар, кленчучы пакорна, аднагалосна паўтараюць :)

Ўсемагутны Божа, Ойча Госпада Нашага Ісуса *) Хрыста, Стварыцелю сусьвету, Судзьдзя ўсіх людзей! Вызнаваем сёньня перад Табою і горка аплакваем розныя нашыя грахі і праступкі, зробленыя думкай, словам і дзеяньнем, якімі мы зрабілі цяжкую абразу Тваёй Божскай Сьвятасьці і сьцягнулі на сябе Твой справядлівы гнеў. Шчыра

---

*) Ісуса па грэцку, Езуса па лаціні, а па беларуску: Язуса.

цяпер шкадуем ад душы і сэрца і сумуем з прычыны гэтых нашых вінаў і саграшэньняў; навет успамінаць аб іх вельмі нам балюча.—Будзь Міласьцівы нам, Добры Ойча; дзеля любові да Сына Твайго, а Нашага Госпада, Хрыста, даруй нам усе нашыя прошлыя грахі і зрабі, каб мы калісь у будучым жыцьці маглі служыць Табе, падабацца Табе і славіць Імя Тваё праз Госпада Нашага Хрыста. Амэн.

(Пастар моліцца:)

Усемагутны Божа, Ойча наш у небé, Каторы з вялікай Сваёй Дабраты абяцаў нам дараваць грахі і ўсім тым, што з шчырым пакáяньнем і праўдзівай верай зьвернуцца да Цябе, будзь Міласьцівы, выбач і адпусьці нам усе нашыя віны; узмацуй нас у пабожнасьці і вядзі нас да вечнага жыцьця праз Гóспада Нашага Хрыста. Амэн.

(Усе супольна зграмаджаныя:)

Усемагутны Божа, Каторы чытаеш у-ва ўсіх сэрцах і вѐдаеш усе нашыя жаданьні і хаценьні, для Каторага нямаш нічога скрытага, ачысьць нашыя сэрцы натхненьнем Сьвятога Духа, каб мы маглі любіць Цябе дасканалай любовяй і годна славіць Сьвятое Тваё Імя праз Гòспада Нашага Хрыста. Амэн.

(Пастар:)

Гэта ёсьць вельмі адпаведны, канешны і важны для нас абавязак, каб мы заўсёды і на кожным месцы аддавалі Табе належную чэсьць і дзякавалі за ўсё, о Гóспадзе Наш у Нябёсах, Усемагутны і Вякуісты Божа!

Дзеля таго разам з Анялаамі Арханялаамі і ўсімі сіламі нябеснымі пачытаем і славім Тваё Божскае Імя, паўтараючы: Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты Гóспад Бог Магутны! Неба і зямля поўныя Славы Тваёй, о, Гóспадзе Найвышэйшы! Амэн.

(Пастар:)

Прыбліжаючыся да Твайго Стала́, о Божа Міласэрны, спадзяёмся не на свае заслугі, але толькі на Тваю многалічную і вялікую Міласьць. Мы ведаем, што мы нягодныя нават крошак з пад Твайго Стала. Але Ты Адзін магчымеш нам дараваць. Дазволь нам цяпер, о Найласкаўшы Го̀спадзе, так прыняць Цела і Кроў Сына Твайго Хрыста, каб праз гэту Яго Муку і Сьмерць грэшныя нашыя душы і целы маглі быць ачышчаны і быццам абмыты Яго Крывёй, і каб мы маглі жыць ў Ім, а Ён у нас навекі. Амэн.

(Пастар скажа наступную Малітву Пасьвячэньня.)

Усемагутны Божа, Ойча наш у Нябёсах, Каторы з Сваёй вялікай Міласьці аддаў для нашага збаўленьня на Муку і Крыжовую Сьмерць Адзінага Сына Свайго Ісуса *) Хрыста; Каторы (ахвяраваўшы Самога Сябе) зрабіў гэту Ахвяру поўным, дасканалым і здавальняючым пасьвячэньнем за грахі ўсяго сьвету, і устанавіў, а роўна у Сваім Сьвятым Эвангельлі прыказаў нам абходзіць памятку Сваёй Мукі і Сьмерці, о Ойча Міласэрны! просім Цябе пакорна, дай, каб мы, спажываючы Хлеб і Віно́ і, згодна з пастановай Хрыста, памятаючы Яго Муку і Сьмерць, маглі стацца ўчасьнікамі Яго Сьвятога Цела і Крыві; бо Ён гэтай самай ночы, калі быў выданы, узяў хлеб і багаслаўляючы і дзякуючы, ламаў ды казаў:

„Бярэце і е̂жце: гэта ёсьць цела маё, каторае за вас будзе выдана; гэта рабе́це на памятку аба Мне́". Также і чару, па вячэры, кажучы

„Гэта чара ёсьць Новы Запавет у маёй крыві, каторая за вас будзе праліта, як дараваньне за

*) Язуса па белар.

грахі: гэта рабеце кожны раз, як піць будзеце, на памятку аба Мне".

(Пастар бярэ сьв. прычасьце: хлеб і віно—і дае яго другім прысутным, калі ёсьць, пастарам, а потым адмаўляе Малітву Гаспóдню, каторую паўтараюць за ім кленчачы ўсе зграмаджаныя:)

## МАЛІТВА ГАСПÓДНЯ.

(Гл. тэкст. стр. XIII).

(Пасьля пяецца № 107 а). гл. стр. 97, або які-небудзь гымнпесьня і прыступаецца да агульнага „прычасьця" зграмаджаных. Пастар дае кожнаму па парадку перш хлеб, а потым ў чарцы віно. Даючы хлеб, Пастар гаворыць:)

Цела Гóспада Нашага Ісуса*) Хрыста, каторае было за цябе выдана, каб захаваць тваю душу да жыцьця вечнага. Бяры Яго і спажывай на памятку, што Хрыстос памёр за цябе, даючы табе збаўленьне у Яго навуцы жыцьця, і крапіся Ім у сваім сэрцы з верай і падзякай.

(А пры падаваньні віна Пастар кажа:)

Кроў Гóспада Нашага Ісуса*) Хрыста, каторая за цябе была праліта, бяры і пі на памятку, што Хрыстос праліў Яе для цябе, і злажы Яму падзяку.

(Перад кожнай новай зьменай падходзячых да Сталà, зараз па прыняцьці хлеба і віна, Пастар кажа якую небудзь рознага зьместу кароткую прамову да прыняўшых прычасьце).

(Па скончанай вячэры Пастар стаўляе на Сталé ўсё, што асталося із сьв. дàраў, пакрываючы ўсё белым палатняным абрусам).

(Пастар моліцца:)

О, Гóспадзе! Ойча наш ў Нябёсах, вось мы, нягодныя слугі Твае, молім Цябе, каб Ты з Сваёй Айцоўскай Дабраты ласкава прыняў нашу ахвяру ўслаўленьня й падзякі, найпакарнёй просячы

---

*) Язуса па белар.

выслухаць нашыя просьбы дзеля Заслугаў і Сьмерці Сына Твайго, Ісуса*) Хрыста; а дзеля веры ў Яго Кроў дай нам усім, о Го́спадзе, адпушчэньне грахоў, і ласкі каб сплылі на нас дзеля Мукі Яго! Вось цяпер ахвяруем Табе, Госпадзе, нашыя душы і нашыя целы, як жывую ахвяру, пакорна просячы Цябе, каб усе ўчасьнікі гэтай Сьвятой Вячэры сталіся напоўненымі Тваёй ласкай і багаслаўленьнем. — А хаця праз нашыя розныя грахі мы нягодны складаць Табе якія колечы ахвяры, аднак мо́лім прыняць тое, што ад нас належыцца, як абавязак і службу, і дараваць нам віны не дзеля заслугаў нашых, але дзеля Заслугаў Хрыста, Го́спада Нашага, праз Якога і ў Якім, у еднасьці Сьвятога Духа, уся чэсьць і слава хай будзе Табе, о Ойча Ўсемагутны і Божа Вякуісты! Амэн.

(Потым трэба сказаць або прапяяць:)

Слава Богу на небе, а на зямлі спакой людзям добрай волі. Славім Цябе, Го́спадзе, багаслаўляем і аддаем Табе чэсьць! Дзякуем Табе, Го́спадзе, за Тваю вялікую Хвалу, о Божа Наш у Нябёсах! Божа Ойча Усемагутны, Гаспадару Наш Нябесны!

О, Госпадзе! Адзінародны Сыну Бога, Ісусе*) Хрысьце, Ягня Божае, Каторы адпушчаеш грахі сьвету, пачуй нас, Го́спадзе! Ты Каторы сядзіш праваруч Бога Айца, зьлітуйся над намі! Бо Ты толькі ёсьць Сьвяты; Ты толькі ёсьць Го́спад; Ты толькі, о, Хрысьце, разам з Духам Сьвятым ёсьць Найвышэйшы ў Славе, Ве́лічы і Усемагутнасьці Бога Айца! Амэн.

---

*) Язуса па белар.

(Пасьля пяецца гымн № 107, б) стр. 97).

(Багаслаўленьне Пастара:)

„Хай супакой Божы, каторы пераходзіць усялякае зразуменьне, будзе з вамі і трымае сэрцы і душы вашыя ў пазнаваньні любові Бога і Яго Сына Ісуса*) Хрыста — Го́спада Нашага; а багаслаўленьне Усемагутнага Бога Айца, Сына і Духа Сьвятога хай будзе з вамі цяпер і навекі! Амэн".

(УВАГА: Калі Пастар мае агранічаны час, можа не казаць некаторых малітваў, апрача Малітвы Пасьвячэньня.

У пэўных выпадках можна дазволіць прыймаць сьв. прычасьце стоючы, або сѐдзючы; аднак тыя, каторыя не адбываюць гэтай рэлігійнай прахтыкі абраднай і містычна-сымбалічнай, ня могуць быць дапушчаны да Стала̀, а навет могуць быць зусім адлучаны ад прычашчаючых сяброў нашага збору).



*) Язуса па белар.

# IX, ПАКАЗЧЫК (ЗЬМЕСТ)

## малітваў, песьняў і гымнаў паводле Перагляду Зьместу і назо́ваў кожнай песьні.

---

стр.

I. Парадак публ. набаж. Службы Божае X
II. Апост. вызнаваньне веры . . . . . . XII
III. Господня Малітва . . . . . . . . . . XIII
IV. Хвала і слава Богу . . . . . . . . . XIV
V. Багаслауленьне: Ласка Госпада і г.д. XIV
VI. Перагляд Зьместу . . . . . . . . . . XV

### А. БОЖСТВА.

*I. Бог Ацец.* (ад № 1 да 14)

№ песьні

1. Сьвяты Божа . . . . . . . . . . . . . 1
2. Чаго жадаеш Божа? . . . . . . . . 2
3. Госпад нас любіць . . . . . . . . . 2
4. Радасна клічма . . . . . . . . . . . 3
5. Магутна крэпасьць—Бог (з Лютара) . 4
6. а) Кінь баяцца (з намі Госпад Бог) . . 5
7. б) Дай нам, Божа, сілу! . . . . . . . 6
8. в) Будзьце з Богам! . . . . . . . . . 6
9. а) Бог—ёсьць наша сіла! . . . . . . 7
10. б) Божа наш Ты, Божа! . . . . . . . 8
11. Мой Божа, дзякую Табе! . . . . . . 10
12. Міласэрны Ты! . . . . . . . . . . . 10
13. Чэсьць Богу пяём . . . . . . . . . . 11
14. Ойча нябесны . . . . . . . . . . . . 12

№ песьні стр.

*II. Бог Сын:* (ад № 15 да 48)

а) Нараджэньне („ № 15 „ 31)

15. Там у Бэтлееме (калядка) . . . . . . 12
16. К жалабочку (народн. калядка) . . . 13
17. Голас нясецца (калядка) . . . . . . . 14
18. Як Хрыстос на сьвет прыходзіць . . 15
19. Ціха, малая будка (стар. нар. калядка) 16
20. Што-ж рабіць мы будзем? (народная калядка) . . . . . . . . . . . . . 17
21. Жолаб ты убогі (народн. калядка) 18
22. Сёньня радасьць стала „ „ 18
23. Бог радзіўся з дзявіцы „ „ 19
24. Дзіцятка нарадзілося „ „ 20
25. У калядны вечар на куцьцю „ 20
26. а) Сьвятая ноч . . . . . . . . . . . 21
27. б) „ „ . . . . . . . . . . . . 22
28. Анял пастушком сказаў (калядка) . . 22
29. Ай, дзеткі, ідзеце! „ . . 24
30. Бог явіўся, нарадзіўся „ . . 24
31. Тры манархі „ . . 25

Ь) Жыцьцё і праца (ад № 32 да 34)

32. Шалее бурай мора . . . . . . . . . 26
33. У гай увайшоў Збавіцель . . . . . . 27
34. а) Усё абняў сон . . . . . . . . . . 27
    б) Паўночны час . . . . . . . . . . 28

с) Мучэньне (ад № 35 да 36*/2)

35. Што цярпеў Ты (вялікапостная) . . . 29
36. Пайдзі да ног Хрыста . . . . . . . . 30
36*/2. О, зранена, балюча . . . . . . . . 31

д) Уваскрасеньне (Трыумф)
(ад № 37 да 40)

37. а) Вясёлы дзень сёньня стаўся (Вялікодная) . . . . . . . . . . . . . 31
38. б) Ўваскрасеньня цуд Хрыстовы . . . 34

№ песьні стр

39. а) Уваскрасеньня сёньня час. . . . . . 35
б) „ „ „ . . . . . 36
40. Вялікодны гімн . . . . . . . . . . . . 36

е) Выслаўленьне (ад № 41 да 48)

41. Гімн падзякі чую ў сэрцы . . . . . . 37
42. Для душ людзкіх . . . . . . . . . . 38
43. Хачу сьпяваць Я . . . . . . . . . . 39
44. За Хрыстом цэлы сьвет . . . . . . . 40
45. Ад зоркі раньняе . . . . . . . . . . 41
46. Божа, славім мы Цябе . . . . . . . 42
47. Сам Хрыстос прышоў спасьці нас . . 43
48. Любоў, дай сонца сьвет . . . . . . . 43

*III. Дух Сьвяты:* (ад № 49 да 49)

49. Сьвяты Дух Божы . . . . . . . . . 44

В. ЗБАЎЛЕНЬНЕ. (ад № 50 да 103)

*I. Грэх і пакаяньне:* (ад № 50 да 57)

50. Калі гляджу на Божы крыж . . . . . 45
51. Ты сьветач мой! . . . . . . . . . . 46
52. Як ёсьць, іду! . . . . . . . . . . . 46
53. Божа Мілы, Божа цудаў . . . . . . 47
54. Вялікі Божа! . . . . . . . . . . . . 48
55. Ты Скала́! . . . . . . . . . . . . . 49
56. Грэшны мы . . . . . . . . . . . . . 49
57. Ня кінь мяне! . . . . . . . . . . . 50

*II. Прызваньне:* (ад № 58 да 72)

58. Вярнісь хутчэй к Айцу! . . . . . . 51
58*/*. О ня блудзі ў жыцьці даўжэй! . . . 130
59. Ты нас клічаш, мілы Божа! . . . . . 51
60. а) Як цяжкіх він цяжар . . . . . . . 52
б) Калі віна цябе гняце . . . . . . . 53
61. Дзейным будзь . . . . . . . . . . . 53
62. Ты дзіця журбы. (Імя Хрыста вазьмі) . 54
63. К сьвятлу ідзі! . . . . . . . . . . . 55

№ песьні стр.

64. Стань пад крыжам . . . . . . . . . 56
65. а) Хрыстос ідзе . . . . . . . . . . . 56
66. б) Ідзі к Хрысту . . . . . . . . . . . 57
67. Сіла ёсьць — кроў Хрыста . . . . . 58
68. Стань, браце мілы . . . . . . . . . 58
69. „Я (Хрыстос) на крыжу вісеў“ . . . 59
70. На што, чаго ўздыхаеш? . . . . . . 60
71. Праз калючы церні . . . . . . . . 61
72. Ці зьбярэмся ля крыніцы . . . . . . 62

*III. Наварот да Бога* (ад № 73 да 78)

73. Зорка з неба . . . . . . . . . . . . 63
74. Мой Божа . . . . . . . . . . . . . . 64
75. Не баюся болей — я ніколі ня сам . 65
76. Ня мінай мяне, мой Спасе! . . . . . 65
77. Верыць мяне вучы! . . . . . . . . . 66
78. З бяды я цяжкай . . . . . . . . . . 67

*IV. Імкненьне да хрысьціянскай дасканаласьці* (ад № 79 да 95)

79. За Хрыстом пайду я . . . . . . . . 68
80. Ня вечна тут . . . . . . . . . . . . 68
81. Хто пагляне ўзвыш . . . . . . . . . 69
82. Што засумаваўся? . . . . . . . . . 70
82*/2. О Ты крывёй abліта! . . . . . . . 71
83. Дабрадатная скала . . . . . . . . . 72
84. Як сум лёг на сэрцы . . . . . . . . 73
85. Вядзі мяне, мой Божа . . . . . . . 73
86. О, Ты, найлепшы Ойча наш! . . . . 74
87. Усё для Хрыста . . . . . . . . . . 75
88. Зіхаціць, іскрыцца крыжа сьцяг . . . 76
89. Бог мой, Бог — Цар нябесны . . . . 77
89*/2. Усё раскажы аб Хрысьце . . . . . 77
90. Ах, мне патрэбны Ты . . . . . . . . 78
91. Бліжэй, Хрысьце, пазволь . . . . . 79
92. Памажы Ты Сам . . . . . . . . . . 80
93. Хочам да сьмерці . . . . . . . . . 81

№ песьнi стр.
94. Хоць бура каля нас кіпіць . . . . . 81
95. а) Божа, што так любіш . . . . . . . 83
б) О, Хрысьце прымі! . . . . . . . . . 84

*V. Хрысьціянская дасканаласьць*
(ад № 96 да 103)

96. Я заморыны . . . . . . . . . . . . 85
97. У рукàх я у Ісуса*) . . . . . . . . . 85
98. Каб я ня меў Цябе, Хрысьце! . . . . 86
99. а) Хочу я, Божа мой! . . . . . . . . . 87
б) З Табою, Божа мой! . . . . . . . . 88
100/113. а) Радасьці, шчасьця раньніца . . 89
101. а) Сказаў Хрыстос . . . . . . . . . 90
б) Сказаў Ісус*) маёй душы . . . . . 91
102. Усё Табе даю! . . . . . . . . . . . 92
103. Як ранкам дзень загарыцца . . . . . 92
103*/2. Ня знаю, што пакажа дзень . . . . 131

С. ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ.
(ад № 104 да 119)

*I. Божае Слова*: (104--).

104. Божа добры . . . . . . . . . . . . 93

*II. Царква-Касьцёл*: (105.—)

105. Ёсьць на скалѐ Сьвятыня . . . . . . 94

*III. Таінствы і абрады*: (№ 106—108*/2)

106. а) Божа Ойча! (на хрэст) . . . . . . . 95
б) „ „ „ „ . . . . . . 96
107. а) Хрысьце нам мілы! (на памятку хлеба і віна) . . . . . . . . . . . . 97
б) Хрысьце нам сумна! (як прымаюць хлеб і віно) . . . . . . . . . . . 97
108. Вось сёньня шлюб. (песьня-гымн на шлюб . . . . . . . . . . . . . 98
108*/2. а) Храм-Сьвятыня Божая . . . . . . 98
б) На малітву гэты дом . . . . . . . 100

*) Язуса па белар.

### *IV. Апошнія перад сьмерцяй рэчы:*

№ песьні (ад № 109 да 117) стр.

109. Ўжо здалёк сьвеціць . . . . . . . . 100
110. Шчасьліва ёсьць краіна . . . . . . . 101
111. Сьніць аб Бацькаўшчыне мілай . . . 102
112. Ах дзе-ж, мой родны край? . . . . . 102
113/100 б) 1. Ціша па буры . . . . . . . . 103
б) 2. Вечная згода . . . . . . . . . 104
114. Калі ўжо скончыць цярпець народ . 105
115. Сьпі ціха, сьпі! (над магілай хрысьціяніна) . . . . . . . . . . . . . . . 105
116. Пусьці, о Божа! (народная) . . . . . 106
117. Помні, чалавеча! (старая песьня) . . . 107

*V. Урачыстыя дні* (ад № 118 да 119)

118. О, шчасны дзень спакою! . . . . . . 108
119. Земляробе пасьпяшы! (для гаспадароў на „багача“у восень) . . . . . . 109

## D) РОЗНЫЯ ПЕСЬНІ.

(ад № 120 ад 152)

*I. Песьні ранічныя і вячорныя*

(ад 120 да 125)

120. Апошні сьвет сонца стух . . . . . . 110
121. а) Сьвеціць зорка-зараніца (ранічная песьня) . . . . . . . . . . . . . . 111
122. б) А як дзень ўжо мінае (вячэр. песьня) 112
123. а) Зьнікнуў ясны сонца сьлед . . . . 113
124. б) Сонейка зьнікае . . . . . . . . . . 113
125. Дай нам, Божа! (народная, гаспадарская, новагодная, на хор) . . . . 114

*II. Місыянерскія* (ад № 126 да 135)

126. Ў сьвет ісьці! . . . . . . . . . . . . 115
127. К працы ўсе! . . . . . . . . . . . . 116
128. Вера старых продкаў . . . . . . . . 116
129. Як Хрыста жаўнеры . . . . . . . . 117
130. Чысты веры наш сьцяг . . . . . . . 118

№ песьні стр.
131. Чаму-ж вы на рынку пасталі? . . . . 119
132. Хрысьціян мільёны . . . . . . . . . 120
133. Дай, Божа, духа айцоў веры! . . . . 120
134. Да працы, брацьця! . . . . . . . . . 121
136. Верныя ў службе жаўнеры . . . . . 122

*III. Песьні моладзі* (ад 136 — 139)

136. Хай парадуюцца сэрцы . . . . . . . 123
137. Мой пастыр Хрыстос . . . . . . . . 124
138. Хоча Хрыстос (песьня длк дзетак) . 124
139. Бачу ўсюды . . . . . . . . . . . . 125

*IV. Чалавек, народ, бацькаўшчына*
(ад № 140—144)

140. Калі Ты збавіш, Божа? . . . . . . . 126
141. Людзі ў цемры . . . . . . . . . . 126
142. Цэлы сьвет — Божы ўраджай . . . . 127
143. Жыве народ ў ярме . . . . . . . . 128
144. Надойдзе час . . . . . . . . . . . 129

*V. Багаслауленьне* (145—)

145. Будзьце з Богам (гл. матыў 6, пес. 8)

*VI. Літургічнага характару* (ад № 146 да 152)

146. Сьвяты Божа! . . . . . . . . . . . 132
147. Псальм 46 . . . . . . . . . . . . . 146
148. Ойча наш, каторы ёсьць ў Нябёсах . 133
149. Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты! . . . . . . 133
150. 1) Уладар Бог. стр. 133; 2) Слава Богу Айцу . . . . . . . . . . . . . . 134
151. а) і б) Доксолёгія на ахвяру . . . . . 134
152. а) і б) Багаслаўленьне (Доксолёгія) . . 134

*VII. Выбраныя Псальмы:*

Псальм № 17 . . . . . . . . . . . . . 135
„ „ 23 . . . . . . . . . . . . . . 136
„ „ 25 . . . . . . . . . . . . . . 137
„ „ 27 . . . . . . . . . . . . . . 138

стр.
Псальм № 28 . . . . . . . . . . . . . . 140
„ „ 29 . . . . . . . . . . . . . . 140
„ „ 31 . . . . . . . . . . . . . . 141
„ „ 40 . . . . . . . . . . . . . . 143
„ „ 42 . . . . . . . . . . . . . . 145
„ „ 46 (гл. ноты № 147) . . . . . . 146
„ „ 51 . . . . . . . . . . . . . . 147
„ „ 55 . . . . . . . . . . . . . . 148
„ „ 57 . . . . . . . . . . . . . . 150
„ „ 62 . . . . . . . . . . . . . . 151
„ „ 67 . . . . . . . . . . . . . . 152
„ „ 71 . . . . . . . . . . . . . . 152
„ „ 85 . . . . . . . . . . . . . . 154
„ „ 86 . . . . . . . . . . . . . . 155
„ „ 90 . . . . . . . . . . . . . . 156
„ „ 91 . . . . . . . . . . . . . . 158
„ „ 96 . . . . . . . . . . . . . . 159
„ „ 103 . . . . . . . . . . . . . . 160
„ „ 111 . . . . . . . . . . . . . . 161
„ „ 127 . . . . . . . . . . . . . . 162
„ „ 128 . . . . . . . . . . . . . . 162
„ „ 139 . . . . . . . . . . . . . . 163
„ „ 143 . . . . . . . . . . . . . . 165
„ „ 145 . . . . . . . . . . . . . . 166

*VIII. Абход сымболічнай памяткі Гаспóдняй Вячэры* (адрыўкі з Эвангельля і малітвы) . . . . . . . . . . . 169

*IX. Паказчык* (*Зьмест*) . . . . . . 177

(гл. у канцы зауважаныя памылкі друку).

ЗАУВАЖАНЫЯ ПАМЫЛКІ ДРУКУ ПРОСІМ ПАПРАВІЦЬ:

| Стр. | радок | ёсьць: | а трэба: |
|---|---|---|---|
| IV | 1 зверху | облічча | Аблічча |
| XII | 13 і 15 „ | умёршых | умерлых |
| XIII | 12 зверху | Айцам | Айцом |
| XIII | 1 „ | ад Богу | ад Бога |
| 7 | 1 знізу | напась | напасьць |
| 26 | 4 „ | твой | Твой |
| 26 | 6 зверху | Ужо | ўжо́. |
| 31 | 8 „ | — | Амэн. |
| 38 | 1 „ | ёсьпь | ёсьць |
| 39 | 2 „ | спяваць | сьпяваць |
| 46 | 6 „ | прыцірай | працірай |
| 48 | 2 знізу | ў свой | у свой |
| 49 | 13 зверху | можам | можаш |
| 55 | 11 „ | — | Амэн. |
| 58 | 9 „ | у сьвятой Хры-стовай | у сьвятой у Хры-стовай |
| 64 | 3 „ | Бо ты, Божа, сваёй | Бо сваёй Ты, Бо-жа, кроўю |
| 66 | 17 знізу | дзіцяне́ | дзіцянё |
| 69 | 11 „ | сябе | Сябе |
| 73 | 7 „ | Дарогу | дарсгу |
| 74 | 7 зверху | Міласьць | То Міласьць |
| 75 | 10 знізу | Ціха | ціха |
| 77 | 4 зверху | твой | Твой |
| 81 | 8 „ | сьмерці, быць | сьмерці быць, |
| 83 | 1 знізу | — | Амэн. |
| 84 | 1 „ | — | Амэн. |
| 84 | 14 „ | прадвечны | Спрадвечны |
| 92 | 3 зверху | ўсе | ўсё |
| 96 | 8 „ | хрост | хрэст |
| 96 | 9 знізу | нябярэ | набярэ |
| 100 | 12 зверху | цяпер жыцьця | цяжар жыцьця |
| 103 | 2 знізу | немачы сіла | немачы— сіла |
| 105 | 4 „ | провадзім | праводзім |
| 106 | 4 зверху | Ты | ты |
| 106 | 6 „ | Твой | твой |

| стр. | радок | ёсьць: | а трэба: |
|---|---|---|---|
| 106 | 8 знізу | напрацаўся | напрацаваўся |
| 109 | 3 „ | н!ву | ніву |
| 110 | 7 „ | Ты будзь з намі | будзь Ты з намі — |
| 113 | 10 зверху | Ты Бог—Цар | Гаспадар наш |
| 116 | 3 знізу | у крові | ў крові |
| 118 | 5 зверху | Дых | Дык |
| 119 | 3 „ | , Хрыстос | Хрыстос — |
| 120 | 4 „ | у нашыя | ў нашыя |
| 120 | 12 знізу | дзянёк пабеды | дзень перамогі |
| 121 | 12 „ | чалавўк | чалавек |
| 121 | 18 зверху | славе | Славе |
| 123 | 3 „ | доўна | доўга |
| 124 | 2 знізу | Бнга | Бога |
| 148 | 15 зверху | ласкава праўды | ласкава ахвяры праўды |
| 163 | 15 „ | разумеш | разумееш |
| 171 | 13 знізу | па калены | на калены |
| 182 | 17 „ | ад | да 152 |

Увага. Слова: (стр. III і 169) урыўкі або адрыўкі, знача вынятыя часткі.

К А Н Е Ц.

BIBLIOTEKA NARODOWA BN

12 LUT 1931

Друк. Я. Левіна Вільня, Нямецкая 22.

BN
BIBLIOTEKA
NARODOWA
430168

Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001008446747